

## АД ВЫДАЎЦОЎ

«Рыцары і дойліды Гародні» – 7-я кніга серыі ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА.
Яна складаецца з трох навэлаў гісторыка Алеся Краўцэвіча, прысвечаных археалагічным даследванням сярэднявечнай Гарадзеншчыны, гарадзенскаму Старому Замку, вялікаму князю Вітаўту, які сваю кар’еру пачынаў у нашым горадзе.
Гэта першая, падобнага кшталту, кніга прысвечаная Гародні.

Дзякуем усім тым, хто спрычыніўся да выдання кнігі.

Дзякуем усім, хто з намі.

Серыя «Гарадзенская бібліятэка»
выдаецца пад патранатам
Аляксандра Мілінкевіча,
лідэра Руха «За Свабоду»,
лаўрэата прэміі Еўрапейскага парламента
імя А. Сахарава «За свабоду думкі»

Ілюстрацыі: Павел Татарнікаў

Дызайн: Сяргей Расолька

Карэктар: Ігар Жук

Лагатып серыі: Алеся Раднова

Каардынатар серыі: Павал Мажэйка

Дапамога ў выданні:
Miasto Wrocław, www.wroclaw.pl
Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego

Выданне серыі стала магчымым дзякуючы праграме
замежнай дапамогі Міністэрства замежных спраў Польшчы ў 2008 годзе

ISBN: 978-83-61617-97-6

Гарадзенскі Рух «За Свабоду»
e-mail: zasvabodu.hrodna@gmail.com
**www.milinkevich.org**

Друк:

© тэкст: Алесь Краўцэвіч, 2009 г.

© Гарадзенскі Рух «За Свабоду», 2009 г.

© Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego, 2008

© ілюстрацыі: П. Татарнікаў, 2009 г.

Алесь Краўцэвіч



# Рыцары і дойліды Гародні



*Тысячагоддзю Сапраўднай Літвы прысвячаецца*



# Гарадзенскі замак

**У ДАЎНІЯ ЧАСЫ НАШЫЯ ПРОДКІ, КАБ БАРАНІЦЦА АД ВОРАГАЎ, ЗБУДАВАЛІ МНОСТВА ЗАМКАЎ. ЧАГО-ЧАГО, А ВОРАГАЎ ТАДЫ ХАПАЛА. ШМАТ РАЗОЎ ПРЫХОДЗІЛІ ПА ЗДАБЫЧУ НА НАШУЮ ЗЯМЛЮ НЕМЦЫ-КРЫЖАКІ, КРЫМСКІЯ ТАТАРЫ, МАСКАВІТЫ, ШВЕДЫ.**

Найбольш магутныя замкі ўзводзіліся на граніцах у самых небяспечных месцах, вось як у Полацку, Віцебску або Смаленску, Мсціславе ці Оршы. Гэтыя гарады знаходзіліся каля мяжы Беларусі з Маскоўскай дзяржавай, і ў выпадку вайны першымі прымалі на сябе ўдар варожага войска. Падобна выглядала справа і на захадзе. Тут самае буйное будаўніцтва замкаў прыпала на другую палову 13 і 14 ст., калі краіна вяла цяжкую вайну з моцным і небяспечным ворагам – рыцарамі-крыжакамі.

Магутным і непрыступным умацаваннем каля заходняй мяжы Беларусі быў замак у горадзе Гародня (гістарычныя назвы: Горадзен, Горадня, зараз – Гродна). Шмат разоў ворагі спрабавалі яго захапіць, але амаль заўсёды бясслаўна адступалі.

Мы хочам расказаць пра гісторыю гарадзенскага замка з самага пачатку яго існавання і да нашых дзён. Гісторыя гэтая багатая на розныя падзеі, сумныя і радасныя. Спадзяёмся, што яна будзе вам цікавая, гэтак жа як і лёс людзей, якія жылі ў замку, бараніліся на яго мурах, выпраўляліся адсюль у паходы.







# УЗНІКНЕННЕ І РОСКВІТ ПАСЕЛІШЧА НА БЕРАЗЕ НЁМАНУ

Стары замак у Гародні – невялікае па плошчы (менш за 1 гектар), але вельмі прыгожае месца. Даўным-даўно людзі аблюбавалі яго пад жыллё і жывуць больш за тысячу гадоў. Назва «Стары замак» з'явілася не так даўно – у другой палове 18 ст., пасля таго як па суседству збудавалі Новы замак. Дагэтуль гаварылі «Замак», раней «Верхні замак», яшчэ даўней – «Дзядзінец», а на самым пачатку тут мясцілася ўся Гародня.

Людзі, якія заснавалі першае паселішча, былі нашымі продкамі – усходнімі славянамі. Яны прыйшлі сюды ў канцы 10 ст. А землі навокал належалі іншым плямёнам – яцвягам, блізкім па паходжанню да летувісаў і латышоў.

Знаходзіцца Стары замак ля самага Нёмана. Берагі ракі тут высокія і стромкія, гэтаксама як і ў невялікай рэчкі Гараднічанкі, якая ўпадае ў Нёман ля самай падэшвы Замкавай гары.

Калі паглядзець на Стары замак зверху, то добра відаць, што ён мае абрысы трохкутніка. Рэчышчы Нёмана і Гараднічанкі – гэта два бакі, а трэці бок трохкутніка ствярае глыбокі роў. Прайсці на замак можна толькі праз мост над ровам. У старажытнасці на месцы рова, відавочна, быў яр. Жыхары замка яго паглыбілі, перакапалі перамычку між ярам і рэчышчам ракі, зраўнялі сценкі і, магчыма, пусцілі сюды ваду з Гараднічанкі. Яны гэта зрабілі, каб яшчэ болей ускладніць доступ да свайго жылля. У тыя далёкія часы людзі маглі жыць больш-менш спакойна толькі на такой вось цяжкадаступнай, ды яшчэ добра ўмацаванай мясціне.

Амаль усё сярэднявечча, аж да пачатку 15 ст. не змяншалася пагроза, то з боку суседніх плямёнаў і дзяржаў, то ад хаўрусаў рабаўнікоў, якія плавалі па Нёмане. Жыхары Старога замку ўвесь час ўмацоўвалі сваю мясціну, рамантавалі старыя, ладзілі новыя – больш сучасныя і магутнейшыя абарончыя збудаванні.

Паступова нашыя продкі добра асвоілі землі Панямоння і стварылі тут асяродак высокай культуры. З часам змяняўся і воблік Гародні. Паселішча моцна разраслося. Праз дзвесце гадоў пасля з'яўлення тут людзей, у 12 ст. каля зліцця Гараднічанкі і Нёмана на месцы першага паселішча стаяў непрыступны замак. З дапамогай археалогіі – гістарычнай навукі, якая вывучае мінулае шляхам спецыяльных раскопак, мы можам уявіць тагачасны выгляд замка. Вось ён.

Вакол усёй гары праходзіць высокі земляны вал. Ён насыпаны не на пустое месца, а на спецыяльныя драўляныя канструкцыі, якія ўмацоўвалі зямлю, не давалі ёй асыпацца. Паверх вала цягнецца сцяна, складзеная з таўшчэзных – як абхапіць рукамі, бярвёнаў. Высока ў неба імкнуць драўляныя вежы з байніцамі. У самым куце над вусцем Гараднічанкі, абарончая сцяна складзеная не з дрэва, а з тонкай і шырокай цэглы-плінфы (выключна рэдкі выпадак на ўсіх усходнеславянскіх землях). Замак, які ў тыя часы называўся дзядзінцам, падчас небяспекі даваў прытулак і людзям, што жылі за яго межамі.

Дзядзінец быў галоўным цэнтрам гораду і ўсяго Гарадзенскага княства. Тут жыў сам ягоны ўладар – князь разам з сям'ёй, дружынай і чэляддзю. Сярод шматлікіх драўляных будынкаў выдзяляўся вялікі церам-палац, збудаваны з чырвонай ды жоўтай цэглы-плінфы[1]. У гэтым будынку адбываліся ўсялякія ўрачыстыя цырымоніі: прыём паслоў, нарады князя са сваімі саветнікамі. Побач з церамам месціўся драўляны княскі дом, а таксама невялікія драўляныя будынкі – дружыннікаў, слугаў ды чэлядзі. Яны займалі значную частку замкавага двара. Месца на дзядзінцы было не надта шмат, таму ўсе жылі адзін каля аднаго, нягледзячы на розніцу ў заможнасці ды службовым становішчы.

[1] *Палац гарадзенскага князя па памерах быў большы нават, чым у князёў найбуйнейшых тады беларускіх гарадоў Полацка і Смаленска.*



У сярэднявечных гарадах не было звычаю прыбіраць ды вывозіць з падворку смецце. Усё выкідвалася за дзверы: абгрызеныя косці, разбітыя гаршкі, зламаныя лыжкі, дзіцячыя цацкі ці яшчэ якія непатрэбныя або сапсаваныя рэчы. Смецце, якое



вымяталася з хаты, таксама выносілася на падворак. Таму вакол дамоў вельмі хутка «нарастала» зямля ці, як кажуць археолагі – «фармаваўся культурны слой». Менавіта раскопкі гэтага слою з'яўляюцца асноўным заняткам археолагаў. А для сярэднявечных людзей, якія яго стваралі – то былі проста гразь і бруд. Каб не пэцкаць у ім ногі, падворак пакрывалі дошкамі. Гэтаксама рабілі з вуліцамі – накрывалі насцілам з тоўстых дошак або расколатых напалову бярвенняў. Калі дошкі на падворку ды вуліцы зацягваліся граззю, зверху клалі новыя насцілы. Падчас археалагічных раскопак на Старым замку было знойдзена больш дзесятка такіх насцілаў ці ярусаў, размешчаных адзін над адным.

Археолагі выявілі, што па тэрыторыі замку ў 12–13 ст. праходзілі дзве вуліцы – уздоўж і ўпоперак замкавага двара. Каля іх скрыжавання, недалёка ад цераму, у другой палове 12 ст. была збудаваная вялікая мураваная царква – на замову князя і яго сям'і. Сваім незвычайным вонкавым выглядам храм адразу прыцягваў увагу ўсіх прыезджых людзей. Ягоныя сцены былі аздобленыя плоскімі шліфаванымі камянямі і кампазіцыямі з маёлікавых плітак. Камяні падбіраліся паводле каляровай гамы, пліткі пакрываліся спецыяльнай яркай палівай жоўтага, зялёнага і карычневага колераў. Скампанаваныя з плітак разнастайныя па форме крыжы, добра спалучаліся з каляровымі камянямі. З падобных адмысловых плітак была выкладзена падлога княскай царквы. Сучасныя даследчыкі прыйшлі да высновы, што гэты храм быў першым творам геніяльнага архітэктара – стваральніка гарадзенскай архітэктурнай школы 12 ст. З усіх ягоных шэдэўраў да сённяшняга дня ацалела на паверхні зямлі толькі знакамітая Каложа – Барысаглебская царква, якая знаходзіцца на процілеглым беразе Гараднічанкі. Мяркуецца, што пасля некалькіх дзесяцігоддзяў працы ў Гародні, дойлід перабраўся ў Кіеў, дзе стаў прыдворным архітэктарам вялікага князя кіеўскага. Кіеўскі летапісец нават занатаваў ягонае імя і прозвішча (вельмі вялікая рэдкасць для амаль заўсёды ананімных сярэднявечных архітэктараў) – Пётр Міланег.

Падобна, на царкве гарадзенскага князя дойлід адточваў майстэрства і вучыўся на сваіх жа памылках. Адной з такіх памылак было ўвядзенне ў цагляную муроўку занадта вялікіх камянёў, якія займалі амаль усю таўшчыню не тонкай (больш за 1 м) сцяны. Да таго ж яшчэ, цэгла ў муроўцы не была добра «перавязаная» – шчыліны між цаглінамі часта размяшчаліся адна пад адной. Таму храм прастаяў «усяго» два вякі і ў 14 ст. ужо ляжаў у руінах. Аднак, па прычыне вельмі інтэнсіўнага жыцця на замку, гэтыя руіны хутка «зараслі» культурным слоем і, дзякуючы гэтаму, ацалелі на вышыню да 4 м. Зараз, раскапаны археолагамі, прыдворны храм гарадзенскіх князёў ахінуты спецыяльным павільёнам і даступны для наведнікаў.

Сапраўдным падарункам для археолагаў было адкрыццё ўзорнай маёлікавай падлогі ў кампазіцыйным цэнтры храма – пад самым купалам. Моцна парушаны ўзор, выкладзены з разнастайных па форме плітак жоўтага, зялёнага, карычневага колераў, удалося, аднак, аднавіць. Выявілася, што гэты малюнак-узор адлюстроўвае вельмі старажытныя касмалагічныя ўяўленні, якія з'явіліся задоўга да ўзнікнення хрысціянства і ў сярэднявеччы былі распаўсюджаныя па ўсёй Еўропе. Кампазіцыя з пяці дыскаў – аднаго ў цэнтры і чатырох вакол яго, азначала сонца і чатыры ягоныя станы. Іншыя элементы малюнка ўяўляюць сабой своеасаблівыя замовы, звязаныя з земляробствам – галоўным заняткам людзей сярэднявечча.



Незвычайна выглядаў інтэр'ер царквы (гэтак як і ўсіх астатніх гарадзенскіх храмаў). Белую вапнавую рашчыну, якая выступала між чырвонымі радамі цэглы, будаўнікі акуратна загладжвалі – атрымлівалася каляровая кампазіцыя, якая стала асновай беларускага нацыянальнага сцяга – бел-чырвона-белыя палосы па перыметру усяго храма. Акрамя таго, сцены царквы пакрытыя сеткай цёмных адтулін. Гэта гарлавіны вялікіх збаноў-галаснікоў (да 50 см даўжынёй), якія ўмуроўваліся ў тоўшчу сцяны. Галаснікі, як паказвае сама іх назва, лавілі гук-голас – не давалі яму разбівацца рэхам аб сцены, глушылі адгалоссі і ўжо ачышчаным вярталі людзям у храме. Эфект гэты можна спраўдзіць на прыкладзе Каложы – ціхі голас, нават шэпт, выразна і чыста перадаецца ў самыя далёкія закуточкі царкоўнай прасторы.



Высокая, дасканалых прапорцый, зіхацістая, як вясёлка, княская царква здалёк вылучалася сярод невялікіх драўляных будынкаў Старога замку. Людзі прыходзілі сюды не толькі на набажэнствы, але і палюбавацца на яе харавство.

Скупыя радкі старажытнага летапісу паведамляюць, што ў 1183 г. горад Горадзен пагарэў ад маланкі. Магчыма, пры пажары пацярпела і царква на дзядзінцы. Археолагі раскапалі яе ў 20 ст. Ад храма засталіся толькі руіны – рэшткі сцен і слупоў. Яны былі пакрытыя шматметровым слоем зямлі – культурным пластом, накопленым за 800 гадоў. Царкву археолагі назвалі Ніжняй, бо над яе руінамі у канцы 14 ст. была збудаваная другая царква, таксама не ацалелая – гэтак званая Верхняя. Сапраўдныя назвы абодвух храмаў невядомыя.

Навуковыя раскопкі Ніжняй царквы прынеслі агромністую колькасць рэчаў, звязаных з царквой: развалы цэглы-плінфы, рознакаляровыя керамічныя пліткі, шліфаваныя камяні, кавалкі збаноў-галаснікоў, царкоўных званоў, складныя крыжы, бронзавая фігурка Хрыста, узорная падлога. Гэтыя знаходкі дазволілі аднавіць воблік старажытнага храма.

Галоўнымі прыхаджанамі царквы на дзядзінцы былі гарадзенскія князі. Летапісы даносяць да нас іх імёны. Першы – Усеваладка, трапіў на старонкі летапісу таму, што ажаніўся з дачкой вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха. Сыноў Усеваладкі звалі Барыс, Глеб і Мсціслаў. Менавіта пад кіраўніцтвам гэтага княскага роду гарадзенскі дзядзінец стаў магутным абарончым умацаваннем.

Да замка князі збіралі свае вайсковыя сілы, адсюль выпраўляліся ў паходы. На жаль, не захаваўся гарадзенскі летапіс, і пра справы гарадзенцаў мы даведваемся ад летапісцаў іншых усходнеславянскіх земляў. А яны больш цікавіліся сваімі справамі і згадвалі толькі пра важнейшыя тутэйшыя падзеі, вось як пра вялікі пажар ці сумесныя ваенныя выправы.

Гарадзенскае княства ў 12 ст. знаходзілася пад палітычным уплывам Кіева і мясцовыя князі былі змушаныя удзельнічаць у вайсковых выправах кіеўскіх уладароў. Так, у 1127 г. гарадзенскае войска прымала ўдзел у вялікім паходзе на Полацкую зямлю, а ў 1141 г. хадзіла на Галіч разам з атрадамі кіеўскіх князёў. У 1167 і 1184 г. гарадзенскія князі па загаду з Кіева выпраўляліся супраць полаўцаў аж у чарнаморскія стэпы. У выдатным літаратурным творы тых часоў «Слове пра паход Ігаравы» таксама ёсць напамін аб Гародні: «... трубы трубяць гарадзенскія».

Вялікія перамены надышлі каля сярэдзіны 13 ст., калі на землі усходніх славян абрынулася мангола-татарскае нашэсце. Праўда, манголы да Панямоння на дайшлі, але папярэдні лад жыцця тутэйшым жыхарам давялося змяняць. Перарваліся даўнія эканамічныя і палітычныя сувязі з паўднёвай Руссю, Візантыяй і Блізкім Усходам. У любы момант маглі з'явіцца ды прайсціся агнём і шабляй па гарадах і весях непераможныя мангольскія тумены.

Менавіта мангола-татарская пагроза стала адной з галоўных прычынаў узнікнення на Панямонні новай моцнай дзяржавы са сталіцай у Навагрудку. Ад самага пачатку існавання новага гаспадарства, увайшоўшага ў гісторыю як Вялікае Княства Літоўскае (ад слова «Літва» – назвы тагачаснага Панямоння), Гародня была ягонай надзейнай апорай.

Аднак замест татараў гарадзенскаму замку давялося бараніцца больш ад суродзічаў – валынянаў і галічан. Іхняя дзяржава – Галіцка-Валынскае княства, хоць і знаходзілася пад пратэктаратам татараў, на некалькі дзесяцігоддзяў стала самай магутнай ва ўсходнеславянскім рэгіёне. Галіцка-валынскія войскі ў 13 ст. неаднаразова штурмавалі замак і змушалі гарадзенцаў пакарыцца. Але тыя не заставаліся вінныя і пры выпадку адказвалі тым жа. У 1275 г. па загаду вялікага князя літоўскага Трайдэна гарадзенская дружына знянацку захапіла багаты горад Драгічын на Падляшшы, што ў сваю чаргу, выклікала помсту з боку галіцка-валынскіх князёў.

У 1277 г. адбыўся штурм гарадзенскага замку, які дэталёва апісаны ў Галіцка-Валынскім летапісе. Перад замкавай брамай стаяла высокая мураваная вежа, якую баранілі прусы (выхадцы з суседняй Прусіі). Штурмоўцам удалося захапіць гэтую вежу, што выклікала роспач сярод абаронцаў замку, бо яна прыкрывала самае слабае звяно абароны – уваходную браму. Праўда, тады гарадзенцам удалося дамовіцца з валынянамі (відаць, тыя не былі пэўныя, што змогуць здабыць увесь замак) і нападнікі, атрымаўшы сваіх раней захопленых гарадзенцамі вояў, адышлі «ва сваясі». Дэталёвае апісанне гэтага эпізоду гісторыі замку цікавае згадкай пра мураваную вежу. Несумненна, яна была сваячкай і равесніцай знакамітай Белай вежы ў Камянцы. Абедзве належалі да гэтак званых вежаў валынскага тыпу – гатычных[2] абарончых збудаванняў, прыйшоўшых да нас з Заходняй Еўропы праз заходнеўкраінскія землі. Крыніцы ўзгадваюць яшчэ падобнае збудаванне ў Бярэсці (слядоў не захавалася); да той самай сям'і належыць таксама вежа пад назвай Шчытоўка, руіны якой і сёння відныя на наваградскім Замчышчы.

*[2] Готыка, гатычны стыль – назва архітэктурна-мастацкага стылю, распаўсюджанага ў сярэднявечнай Заходняй Еўропе; паходзіць ад назвы германскага племя готаў.*

Даследчыкі лічаць, што менавіта тая вежа паказаная на знакамітай гравюры Гародні з 1568 г. Там яна выразна выдзяляецца сярод рэшты замкавых умацаванняў і мае круглую форму, падобна да сваёй камянецкай сястры. Сёння на паверхні зямлі яе слядоў не захавалася, але ў свой час аўтару давялося ўдзельнічаць у археалагічных раскопках на месцы гэтага таямнічага збудавання. Раскопкі адбываліся ў цяжкіх умовах на схіле гары ў самым канцы лета, калі існавала небяспека, што блізкія восеньскія дажджы могуць размыць наш раскоп і парушыць пляцоўку замкавай гары. Аднак мы паспелі ўскрыць частку магутнага (як і мае быць у гатычнай абарончай вежы) падмурка. Здавалася б, вырашаная праблема, прынамсі, дакладнага месцазнаходжання вежы, калі б не адна дзіўная дэталь, якая ўсю справу, наадварот, заблытала. Ускрыты фрагмент мура належаў да пабудовы, якая была ў плане не круглай, а прамавугольнай (магчыма, квадратнай)! Ці то мы натрапілі на нейкае іншае невядомае дагэтуль абарончае збудаванне, ці то аўтар гравюры памыліўся і нашая вежа была не круглай (як камянецкая Белая вежа), а прамавугольнай (як наваградская Шчытоўка).

Барацьба з Галіцка-Валынскім княствам працягвалася з пераменным поспехам. У рэшце амаль праз сто гадоў, Вялікае Княства Літоўскае, не толькі здолела абараніцца, але само пераняло большую частку тэрыторыі Галіцка-Валынскай дзяржавы.



# КРЫЖАЦКАЯ НАВАЛА

[1] *Шлюб – тут манаская прысяга, абет.*

[2] *Язычнікі – так называлі народы, якія не спавядалі хрысціянскую рэлігію.*

У канцы 13 ст. гарадзенцам давялося сутыкнуцца з вельмі небяспечным ворагам – крыжакамі. Хто яны такія, крыжакі? Як з'явіліся на нашай зямлі? Гэта манахі-рыцары Тэўтонскага ордэна. Назва ордэну паходзіць ад старажытнага германскага племя – тэўтонаў – так часамі акрэслівалі ўсіх германцаў. Менавіта немцы, за рэдкімі выключэннямі, станавіліся рыцарамі Тэўтонскага ордэну. Сябры гэтай арганізацыі, створанай ў канцы 12 ст. ў Палестыне, мелі задачай змагацца з мусульманамі за хрысціянскую веру. Гэтаму змаганню было прысвечана ўсё іх жыццё, дзеля чаго яны прымалі манаскія шлюбы[1] (не збіраць багаццяў, не жаніцца, слухацца духоўных кіраўнікоў) і дадаткова яшчэ шлюб змагання з нявернымі. Таму іх называлі манахамі-рыцарамі. Пад канец 13 ст. мусульмане выгналі крыжаносцаў з Палестыны. Тэўтонскі ордэн шукаў новага поля дзейнасці і ўрэшце знайшоў прытулак у Прусіі, прываблены сюды прапановай мазавецкага князя Конрада дапамагчы яму ў змаганні з язычнікамі[2]-прусамі. Знакам адрознення рыцара Тэўтонскага ордэна быў белы плашч з выявай чорнага крыжа на левым плячы. Адсюль вынікала назва – крыжакі.



Рыцары-тэўтоны, якія называлі адзін аднаго братамі, не толькі выканалі, але і перавыканалі пастаўленае перад імі заданне. Праз паўстагоддзя метадычнай вайны яны пакарылі Прусы і стварылі на яе тэрыторыі ўласную Ордэнскую дзяржаву. Прывабіўшы каланістаў з нямецкіх земляў, рыцары-манахі пераўтварылі дзікі край у краіну з узорнай еўрапейскай гаспадаркай. Праўда, цаной дабрабыту было знікненне з карты Еўропы цэлага народу – старажытных прусаў – сваякоў сучасных летувісаў і латышоў. Непакорных тубыльцаў немцы вынішчылі ці выгналі, астатніх ахрысцілі і паступова асімілявалі – пераўтварылі ў немцаў-прусакаў.

[3] *Пагане – тое ж, што і язычнікі.*

Невялікая, але выдатна арганізаваная Ордэнская дзяржава, вырасла ў надзвычай сур'ёзную пагрозу для суседзяў – палякаў, мазаўшанаў, жамойтаў і беларусаў. Галоўная ідэя рыцараў-манахаў – змаганне за хрысціянскую веру, паступова пераўтварылася ў ідэалагічнае прыкрыццё звычайнай прагі да захопу новых земляў і багаццяў. Ордэн ваяваў ужо не толькі з язычніцкімі плямёнамі, але і з братамі па веры – беларусамі (хрысціянамі, праўда, усходняга абраду – схізматыкамі) і нават з каталікамі-палякамі. Войны з польскімі князямі крыжакі тлумачылі тым, што тыя падтрымліваюць паганаў[3].

У той самы год, калі было здушана паўстанне апошняга няскоранага прускага племя, крыжакі першы раз атакавалі Вялікае Княства Літоўскае. Іхны храніст запісаў пад гэтым 1283 г.: «Скончылася вайна пруская, пачалася вайна ліцвінская».



Гародня са сваім замкам па прычыне геаграфічнага становішча на самым захадзе краіны, раптоўна апынулася на пярэднім краі вайны. Гарадзенскі замак аказаўся важнейшым стратэгічным цэнтрам, вузлом абароны, які прыкрываў усю Літву. Да таго ж, ён панаваў над самым старажытным і самым буйным ды багатым горадам на Нёмане. Крыжакі імкнуліся любым коштам яго здабыць, нашыя нізавошта не хацелі аддаваць. Зацятая барацьба за Гародню, якая зацягнулася больш чым на стагоддзе (працягвалася ад апошніх дзесяцігоддзяў 13 да пачатку 15 ст.) цалкам змяніла воблік ягонай галоўнай цытадэлі – старажытнага замку на мысе гары пры ўпадзенні ў Нёман Гараднічанкі. На той час ён называўся ўжо не дзядзінцам, а Верхнім замкам, у адрозненне ад Ніжняга замку на суседняй гары (тут знаходзіўся галоўны гарадскі пасад – вакольны горад, сённяшняя назва Новы замак). Пад пагрозай крыжацкіх нападаў гарадзенцы былі вымушаныя абнесці валамі і равамі усю гарадскую тэрыторыю.

Стары замак у Гародні з гонарам вытрымаў усе бітвы і аблогі. Калі ворагу ўдавалася ўзяць верх над яго абаронцамі, то ненадоўга. Сотні і тысячы разоў сцены замка прымалі на сябе магутныя ўдары вялізных камянёў, пушчаных з камнекідальных машын.



Неаднойчы ваколіцы агаломшваліся ляскатам зброі і ваяўнічымі крыкамі ворагаў, якія ішлі на прыступ. Шмат абаронцаў злажыла галовы на замкавых мурах і пахавана ў руінах Ніжняй царквы і на гарадскіх могілках. Замак паступова змяняўся, дапасоўваўся да новых спосабаў вядзення аблогі, на якія ордэнскія рыцары былі вялікімі майстрамі.

Звесткі пра тыя баі мы атрымалі праз крыжацкія хронікі. Сведчанне варожага храніста – лепшая ацэнка баявой славы гарадзенцаў. Мы падрабязна раскажам пра гэты найцяжэйшы, але адначасова і найслаўнейшы перыяд гісторыі Старога замку. Замак і яго абаронцы таго вартыя.

У 1988 г. непадалёк ад Старога замка, дзесьці ў 1,5–2 кіламетры ніжэй па цячэнню Нёмана, некалькі гарадзенскіх школьнікаў знайшлі незвычайны скарб. У лесе на нёманскім абрыве ля самай вады яны адкапалі поўны набор зброі і рыштунку коннага воіна 13 ст. Там былі меч, шлем, барміца (кальчужны каўнер да шлему), наканечнікі дзіды і дроціка, баявая сякера, стрэмя, тры шпоры, шпілька да плашча. Аўтар гэтых радкоў па свежых слядах правёў археалагічнае абследаванне месца знаходкі і знайшоў яшчэ паясную спражку. Для нас рыцарскі набор 13 ст. – перш за ўсё гістарычная каштоўнасць (прычым вялікая, бо такія знаходкі здараюцца прыблізна адзін раз на дзвесце гадоў), а для людзей таго часу ён быў сапраўдным скарбам. Жалеза тады вельмі дорага каштавала, а выраб камплекту рыцарскай зброі варты быў цэлага маёнтку. Па асаблівасцях формы паасобных рэчаў было відаць, што іх вырабілі усходнеславянскія, менавіта, беларускія майстры. Адзін з прадметаў – наканечнік дзіды, як дзве кроплі вады падобны на дзіду, раскапаную археолагамі на Старым замку. Адсюль вынікала сувязь знаходкі з гарадзенскім замкам. Напэўна, мы ніколі не даведаемся, як тыя рэчы трапілі на процілеглы нёманскі бераг. Вельмі верагодна, што гарадзенскі рыцар схаваў свой цяжкі баявы рыштунак на самым беразе, каб улегцы пераправіцца праз Нёман. Напэўна, яму вельмі на гэтым залежала. Можа, ён ратаваўся ад надышоўшага крыжацкага атраду ці нёс у замак вестку пра крыжацкі напад. Хіба, мы ніколі не даведаемся, як было на самой справе, але вядома, што па свой рыштунак беларускі рыцар не вярнуўся. Гэта можа азначаць толькі адно – ён загінуў, верагодна, так і не дабраўшыся да замку. Вярнулася туды толькі яго зброя, праўда праз семсот з лішнім гадоў. Яна заняла ганаровае месца ў экспазіцыі гісторыка-археалагічнага музею.

Вялікія і малыя атрады ордэнскіх вояў рэгулярна прыходзілі пад ягоныя сцены, часам па некалькі разоў на год. У 1284 г. да Гародні падступіў з вялікім войскам правінцыйны магістр[4] ордэна Конрад Цірберг. Ордэнскі храніст паведаміў, што крыжакі прыйшлі пакараць прусаў, якія раней ўцяклі ад іх, пакінуўшы свае спрадвечныя землі. Вялікі князь літоўскі Трайдэн пасяліў бежанцаў у Гародні. Пад 1276 г. у ордэнскай хроніцы запісана: ***«У тым самым годзе, у зімнюю пару, браты зноў з узброеным атрадам уварваліся ў названую зямлю Пагезанію і зноў спустошылі яе агнём і рабункам, вылавілі і пазабівалі ўсіх акрамя нямногіх, якія ўцяклі ў Літву, у ваколіцы замку Гародня. І так усю Пагезанію пераўтварылі ў пустку».*** Гэтая інфармацыя пацвярджаецца Галіцка-Валынскім летапісам: ***«У лета 6784 (1276 г. – А. К.). Прыйшлі прусы да Трайдэна са сваёй зямлі няволяю ад немцаў; ён жа прыняў іх да сябе і пасадзіў частку у Горадне, а частку іх пасадзіў у Слоніме»***

[4] *Кіраўнік прускай правінцыі ордэна; у Прыбалтыцы была яшчэ Інфлянцкая (Лівонская) правінцыя ці філія на чале з уласным магістрам.*

Пад час выправы 1284 г. праваднікам у крыжакоў быў прус па імені Скомунд, які раней таксама жыў у Гародні, але потым вырашыў вярнуцца дамоў і пакарыцца крыжакам. Перайшоўшы Нёман, немцы прыступілі да аблогі горада. Стралялі з лукаў і арбалетаў, камнекідальных машын, рыхтавалі штурм. Залога[5] горада была спакойнай – спадзявалася на моц сваіх муроў. Калі немцы палезлі на сцены, пачалася страшэнная сеча. Немцы закідвалі на забаролы вяроўкі з крукамі, лезлі ўгару па прыстаўных лесвіцах. Абаронцы скочвалі на галовы штурмавікоў вялізныя бярвёны і камянiскі, нямала паклаўшы крыжакоў. Усё ж пасля шматгадзіннага штурму ордэнскія жаўнеры ўварваліся ў горад. Спалілі дамы, жыхароў каго забілі, каго забралі ў няволю. Але, увага! Увесь час гаворка ішла пра горад і гарадскія ўмацаванні. Пра замак нямецкая хроніка маўчыць. Самы галоўны замак – Верхні замак, відавочна, ацалеў, інакш храніст не прамінуў бы расказаць аб яго падзенні. Напэўна, немцы ўзялі толькі Ніжні замак.

[5] *Залога – гарнізон.*





Новы вялікі князь Віцень адбудаваў горад, вярнуў у яго тых жыхароў, хто здолеў ўцячы і хаваўся па лясах і балотах. Па загаду князя былі ўзведзеныя новыя ўмацаванні. З імем гэтага гаспадара звязанае з'яўленне беларускага дзяржаўнага герба. У Густынскім летапісе сказана, што ў канцы 13 ст. Віцень узяў сабе герб: «рыцер збройны на коне с мечем, еже ныне. Наричут погоня».

Абаронцы Гародні многа ўвагі і сіл аддавалі ўмацаванню замка. Найперш стараліся як мага надзейней умацаваць уваход – самы небяспечны ўчастак абароны. У гарадзенскім замку мост з пасаду да брамнай вежы быў пакладзены не прама да ўвахода, а загінаўся дугой пад самыя сцены. Усе, хто па ім ішоў, знаходзіліся ў зоне абстрэлу як са сценаў, так і з высокай мураванай вежы, спецыяльна пастаўленай дзеля прыкрыцця уваходу.

Частка моста, якая прымыкала да брамы, была пад'ёмнай. Кожны вечар мост з грукатам падымаўся на моцных ланцугах, прыціскаўся да варот і ствараў такім чынам дадатковую заслону. Варта на вежы была гатовая пры першай небяспецы падняць яго і днём. Але падцягванне моста ланцугамі – справа даволі марудная, ворагі маглі паспець праскочыць у вежу і перашкодзіць варце. Пры апушчаным перад ворагам мосце не дапамогуць ні крутыя абрывы Замкавай гары, ні магутныя сцены. Нават калі самыя вароты зачыненыя, іх можна выламаць таранам. Таму ў замку мелася яшчэ адно прыстасаванне для абароны брамы на выпадак неспадзяванай небяспекі. Над праходам праз брамную вежу вісела, падвязаная вяроўкай, цяжкая сталёвая кратаўка – герса. Пры гвалтоўнай патрэбе вартавы ў адзін момант перасякаў вяроўку – герса ападала і перакрывала праход. Тады ўжо спакайней можна было падымаць мост, зачыняць вароты ды выбіваць ворагаў, якія ўсё ж паспелі праслізнуць у замкавы двор.

Праз нейкі час пасля першага нападу крыжакі аж два разы за год спрабавалі захапіць Гародню. Гэта было у 1296 г. Спачатку ўзімку на яе выправіўся з немалым войскам камандор[6] з Балгі Зігфрыд Райнберг. Ордэнскі храніст, які сам мог быць удзельнікам паходу, падрабязна апісаў адзін ягоны эпізод. Дэталі настолькі выразныя і эмацыйныя, што гэты выпадак хвалюе нас і зараз, хоць мінула ўжо больш за семсот гадоў. Ордэнскае войска ўжо набліжалася да гораду (з левага берагу Нёману), калі разведчыкі заўважылі на снезе свежыя сляды невялікага коннага атраду, напэўна, перадавой варты гарадзенцаў. Немцы кінуліся па тых слядах, хутка дагналі атрад узброеных ліцвінаў і ўсіх пасеклі. Але адзін з беларускіх вояў (па тэрміналогіі храніста «русін»), хоць і быў цяжка паранены, скінуў нямецкага вершніка з каня, здолеў падняцца ў яго сядло і ўцячы. Аднак вялікія плямы крыві на конскіх слядах давалі падставу меркаваць, што далёка ён не ад'едзе. Крыжацкі вой па імю Вальтэр, кінуўся па тых крывавых слядах і дагнаў русіна, які ад страты крыві моцна аслабеў – не мог не тое, каб бараніцца, але нават хутка ехаць канём. Крыжак з халоднай крывёй дабіў параненага, забраў каня і вярнуўся да сваіх. Паход працягваўся далей, але без асаблівых поспехаў. Крыжакі перайшлі па лёдзе Нёман, напалі на навакольныя вёскі і спалілі дальняе гарадское прадмесце. Да замка падыходзіць збаяліся.

[6] *Камандор (па-нямецку – комтур) – адзін з вышэйшых чыноў ордэна, кіраўнік вайскова-адміністрацыйнай акругі.*

У той самы год, калі вялікі князь гасціў у Інфлянтах[7], крыжакі вырашылі скарыстацца з яго адсутнасці. Каралявецкі[8] камандор сабраў вялікую банду рабаўнікоў, паставіў іх пад каманду рыцара ордэна Генрыха Зухверта і накіраваў на Гародню. Аднак крыжакі пралічыліся. Абарона краю, нават у адсутнасць гаспадара, працавала як мае быць. Немцы сунуліся былі пад замкавыя сцены, але атрымалі такі моцны адпор, што мусілі адысці з вялікімі стратамі. Да таго яшчэ з замка выскачыў моцны атрад і пагнаў рабаўнікоў да самых Прусаў. Тыя не мелі нават магчымасці адпачыць, збочыць з дарогі, каб здабыць якое харчаванне.

[7] *Інфлянты – інакш Лівонія – гістарычная назва, тэрыторы, якая ўключала сучасную Латвію і частку Эстоніі.*

[8] *Каралявец, па-нямецку Кёнігсберг – гістарычная назва сучаснага Калінінграда.*

Тым не менш крыжакі і надалей стараліся выбраць адпаведны момант, каб ударыць, калі іх не чакалі. Галоўнай мэтай заўсёды быў гарадзенскі замак. У маі 1306 г. вялікі князь Віцень павёў свае войска ў паход на Польшчу. Крыжацкія шпіёны тут жа данеслі пра гэта сваім камандзірам. Прускі магістр Конрад Сак прыйшоў да высновы, што ў гарадзенскім замку вояў амаль не засталося, бо ўсе пайшлі з Віценем. Магістр паспяшаўся выправіць свае войска, у тым ліку 400 адборных кавалерыстаў. Крыжакі лічылі, што проста зоймуць замак, не

сустрэўшы супраціўлення. Каб прыблізіцца да горада непрыкметна, Нёман перайшлі далёка збоку. Моцная бура з громам, дажджом і градам прыкрыла падыход крыжакоў пад самы горад. Яны нечакана захапілі прадмесце, але пакуль рабавалі ды забівалі жыхароў, залога замку падрыхтавалася да адпору. У выніку немцы мусілі адыходзіць, забраўшы з сабой тое, што паспелі, нават пажару не змаглі нарабіць, як паведамляе іх храніст, з-за магутнай залевы.

Аднак літаральна ўслед надышло вялікае крыжацкае войска. У ім было за сотню рыцараў і шэсць тысяч коннікаў[2]. З другога боку на дапамогу замку падышло беларускае войска. Бітва распачалася на самым узыходзе сонца і працягвалася да палудня. Перавага хілілася то ў адзін, то ў другі бок, потым крыжакі не вытрымалі і адступілі з вялікімі стратамі. Па інфармацыі іх храніста стралой быў забіты адзін з найлепшых рыцараў ордэна Хартман Эльстэрбург.

[2] *Рыцары ордэна, якіх нават у часы найвялікшага росквіту арганізацыі было толькі каля сямісот, выконвалі ролю вайсковых камандзіраў.*

Беларуска-літоўскае гаспадарства гартавалася ў бесперапынных войнах з крыжакамі. Беларусы не толькі паспяхова баранілі свае замкі, але і рэгулярна выпраўляліся з паходамі на варожую тэрыторыю. У 1311 г. вялікі князь Віцень арганізаваў буйны паход на Прусы. Вялікія вобласці ордэнскай дзяржавы Самландыя і Натангія былі спустошаныя, але ніводзін атрад крыжакоў не адважыўся высунуць носа з умацаваных замкаў.

У той час у крыжацкай няволі знаходзіўся адзін ліцвін шляхетнага паходжання, які да палону служыў пры двары вялікага князя. У абмен за волю ён паабяцаў крыжакам здаць Гародню і яе замкі. Крыжакі хутка сабралі войска ў пяць тысяч чалавек, якое павёў на ласую здабычу сам вялікі камандор Генрых фон Плоцке. Аднак аказалася, што ліцвін усё ж неяк здолеў паведаміць пра выправу вялікаму князю Віценю.

Ужо пад самым горадам крыжакі злавілі старога, выпраўленага з замку на разведку. Ад яго даведаліся, што Віцень з агромністым войскам ужо чакае іх пад Гародняй і мае намер атакаваць падчас пераправы праз Нёман. Вялікі камандор паспяшаўся вярнуцца туды, адкуль прыйшоў, але на гэтым не супакоіўся. У той жа год ён з буйным войскам зноў падышоў пад Гародню. Зноў каля горада злавілі чалавека, на гэты раз то быў вой з пагранічнай варты. Той пад катаваннем расказаў пра невялікі атрад ліцвінаў, які выправіўся рыхтаваць вялікаму князю месца для палявання. Крыжакі тых людзей усіх пабілі.



# Слаўны рыцар Давыд Гарадзенскі

У 1314 г. камандор Генрых, каб выправіць сваю пахіснутую рэпутацыю ваякі, рашыўся на справу, на якую дагэтуль ні адзін крыжацкі правадыр не адважваўся. Ён задумаў зайсці далёка ў тыл Гародні і напасці на сталіцу Літвы – Наваградак. Сабраў вялікае войска, нарыхтаваў на чатыры месяцы харчавання і ў верасні пайшоў цішком праз Наднарвянскую пушчу. Мінуўшы трэцюю частку дарогі, загадаў пакінуць у лесе пад вартай частку прадуктаў, на выпадак калі на адваротнай дарозе забракне харчавання. Затым далей, у лесе непадалёк ад Гародні, крыжакі таксама пакінулі склад харчавання і паўтары тысячы коней з вартай у 30 лепшых жаўнераў.

Ва ўмовах шматгадовай амаль безперапыннай вайны ліцвіны, гэтаксама як і крыжакі, арганізавалі надзейную пагранічную варту і выведку. Пра надыход вялікага ордэнскага войска хутка стала вядома ў Гародні. Разведчыкі сядзілі рух ворага і прымалі неабходныя меры. Папярэджвалі жыхароў з паселішчаў на крыжацкім маршруце і рэалізоўвалі звычайную ў такіх выпадках тактыку «выпаленай зямлі». Ордэнскія аддзелы рухаліся па спустошаным краі са спаленымі вёскамі і знішчанымі пасевамі на палях (большая частка ўраджаю ўжо была сабраная і схаваная).

Наваградскія брамы аказаліся наглуха замкнутыя, а жыхары гатовымі да бітвы на валах і сценах. Пасля некалькіх прыступаў крыжакі ўзялі спалены вакольны горад, а гараджане зачыніліся ў замку. У ордэнскага войска не было ні здабычы, ні палонных, яго абоз пад замкам стаяў пусты. Наваградчане мужна бараніліся на сценах замку, ды яшчэ праводзілі нечаканыя вылазкі. Праз некаторы час крыжацкім воям не стала хапаць ежы, яны баяліся ў пошуках яе адыходзіць далёка ад свайго войска – ліцвінскія дазоры толькі гэтага і чакалі.



Кіраўнікі паходу прынялі рашэнне адступаць назад у Прусы. Хуткім маршам прышлі да склада пад Гародняй, але не знайшлі ні коней, ні прыпасаў, а толькі трупы варты. Гэта Давыд – гарадзенскі намеснік[1] напаў з дружынай, пабіў варту і забраў прыпасы. У войску крыжакоў пачаўся голад, заставалася адзіная надзея на апошні склад. Ён быў схаваны ў лесе ўжо бліжэй да прускай мяжы і меркавалася, што гарадзенцы наўрад ці змаглі туды дабрацца. Войска з апошніх сілаў памкнулася да схованкі, бласлаўляючы прадбачлівасць свайго кіраўніка. Аднак і апошні склад аказаўся пусты – тут таксама пабываў Давыд Гарадзенскі. Знясіленых людзей ахапіла роспач сярод дрымучай пушчы, войска перастала існаваць – кожны пачаў ратавацца паасобку – шукаць якой-небудзь ежы і прабірацца да свайго краю. Храніст паведамляе, што коней ужо не засталося – пагінулі, або пайшлі на харчаванне. Да таго ж навакол гойсалі ліцвінскія аддзелы. Шмат хто з удзельнікаў таго паходу альбо загінуў ад голаду, або быў злоўлены ліцвінамі. Хроніка паведамляе, што тыя нямногія, хто вярнуўся, выглядалі нібы здані, паўсталыя з магілаў. Некаторыя з іх не змаглі перажыць той прыгоды і памерлі ўжо дома пасля працяглай хваробы. Гэтую выправу на Беларусь доўга памяталі ў Прусах.

[1] *Намеснік – службовая асоба ў Вялікім Княстве Літоўскім, прадстаўнік вялікага князя, узначальваў мясцовае кіраванне.*

У апісанні таго крыжацкага паходу на Наваградак ордэнскі храніст называе імя Давыда – гарадзенскага намесніка. Гэта быў мужны энергічны чалавек, вопытны і таленавіты военачальнік. Да таго ж яшчэ ён меў высокае паходжанне, бо параднiўся з вялікім князем Гедымінам, ажанiўшыся з ягонай дачкой. Акрамя таго, ягонае імя паказвае, што ён быў праваслаўным хрысціянінам. Паводле легенды, Давыд быў сынам знакамітага нальшанскага князя Даўмонта, які праславіўся як службовы князь Пскоўскай рэспублікі. Ужо тое, што вялікі князь параднiўся з Давыдам, паказвае на надзвычай высокае становішча ў дзяржаве не толькі ягонай асобы, але і даверанага яму гораду.



[2] *Каштальян – камендант замка.*

Неўзабаве зяцю гаспадара сталі называць Давыдам Гарадзенскім. Ён спраўна кіраваў адным з важнейшых гарадоў і замкаў дзяржавы, здолеў арганізаваць рашучы адпор крыжакам. Давыд не толькі мужна бараніўся ў замку, але праводзіў паспяховыя паходы на Прусы. Вайна з крыжакамі стала зместам усяго ягонага жыцця. Так вясной 1319 г. намеснік Давыд, ці, як яго называлі крыжакі, каштальян[2], на чале атраду ў 800 вояў, пайшоў у паход на Прусы, там паставіў усюды засады і, набраўшы многа здабычы, павярнуў назад. Тым разам поўнага поспеху не атрымалася, бо крыжакі паспелі зламаць мост на дарозе і затрымалі войска Давыда, пакуль сабралі свае сілы. Адбылася бітва, пасля якой Давыд, пакінуўшы здабычу, вярнуўся дадому.

Вялікі князь давяраў Давыду важныя і адказныя вайсковыя аперацыі, якія сягалі нашмат далей за гарадзенска-прускую мяжу. У 1323 г. Пскоўская рэспубліка папрасіла дапамогі супраць інфлянцкіх крыжакоў, якія пазабівалі пскоўскіх паляўнічых, рыбакоў і купцоў. Па даручэнні вялікага князя Давыд набраў ахвотнікаў сярод маладых вояў і выправіўся ў няблізкі шлях. Найперш прайшоўся па эстонскіх уладаннях крыжакоў, потым рушыў на падмогу абложанаму ворагам Пскову. Знянацку атакаваўшы крыжацкі абоз, захапіў яго, знішчыў абложныя машыны, разграміў лепшую частку нямецкага войска. У выніку крыжакі былі вымушаныя згадзіцца на 18-гадовае перамір'е з Псковам.





Акрамя крыжакоў ліцвіны не ўпускалі выпадку парабаваць землі саюзнікаў крыжакоў – мазавецкіх князёў. У 1324 г. Давыд Гарадзенскі са сваім войскам моцна спустошыў Плоцкую зямлю. Былі разрабаваныя ўладанні плоцкага біскупа і князя Земавіта (землі іншага мазавецкага князя – Вацлава не чапалі – той таксама быў зяцем Гедыміна).

У 1326 г. Давыд Гарадзенскі быў забіты падчас вяртання з яшчэ адной далёкай і паспяховай выправы на нямецкія землі – на гэты раз ліцвіны хадзілі аж у Брандэнбург, менавіта на Франкфурт над Одэрам. На адваротнай дарозе падчас прывалу, яго забіў адзін мазавецкі шляхціц – ударыў дзідай у спіну. Магчыма, мазаўшанін помсціў за шкоды, нанесеныя ягонай зямлі ў ранейшых паходах гарадзенскага князя.

Смерць Давыда – мужнага і таленавітага правадыра – была вялікай стратай не толькі для гарадзенцаў, але і ўсёй краіны.



# БІТВА З КРЫЖАКАМІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У сярэдзіне 14 ст. на еўрапейскія землі прыйшла страшная бяда: эпідэмія бубоннай чумы, якую называлі чорнай смерцю, бо на целе хворага з'яўляліся плямы чорнага колеру. Чума прынесла страшэнныя спусташэнні ўсёй Еўропе, найперш краінам, якія мелі непасрэдныя гандлёвыя кантакты з азіяцкімі землямі, адкуль пошасць і прыйшла да нас. Акрамя таго, у 14 ст. пагоршыўся клімат – стаў халаднейшым, і, адпаведна, знізіліся ўраджаі. Усе гэтыя беды склаліся на сур'ёзны крызіс сярэднявечнай Еўропы, выразам якога было значнае змяншэнне колькасці насельніцтва. Крыніцы не паведамляюць, ці дапала чума Беларусь, але дакладна вядома, што крызіс не абмінуў і нашу краіну, у тым ліку Гародню. Археалагічныя раскопкі паказваюць, што тэрыторыя горада ў гэты час значна паменшылася, а культурныя слаі 14 ст. на гарадскіх пасадах амаль адсутнічаюць. Жыццё па-ранейшаму канцэнтравалася ў замку, хоць па археалагічных знаходках відно выразнае збядненне матэрыяльнай культуры і запавольванне накаплення культурнага слою.

Людзі часткай паўміралі, часткай паўцякалі з горада. Але не спынялася жыццё на гарадзенскіх замках. Праз раскопкі відаць, што людзі тут жылі пастаянна. У 1360 г. зноў быў мор, такі ж страшны, як і чорная смерць.



Тым не менш крыжакі не спынялі свае напады, і нашыя продкі напружвалі ўсе сілы, каб у такіх страшных варунках не загінуць, каб выратаваць свой народ.

У 1361 г. крыжакі прыйшлі на Гародню, але нашыя вoi не далі ім пераправіцца праз Нёман. Рыцары-крыжакі – рабаўнікі і гвалтаўнікі – падманвалі ўвесь свет, выдаючы вайну з беларусамі як святое змаганне за хрысціянскую веру. І ім верылі.

Так, напрыклад, у 1363 г. да немцаў-крыжакоў прыбылі рыцары з Англіі і Шатландыі, каб выступіць супраць язычнікаў. Пайшлі ўсе разам на вялікі пост да Гародні, дзе кіраваў князь Пацірг.

Калі войска крыжакоў падышло да горада, князь выслаў насустрач жыхароў з хлебам і соллю. У дэлегацыі былі святары з крыжамі і іншымі хрысціянскімі знакамі. Замежныя рыцары, якія ішлі ваяваць за Хрыста, не адважыліся адвергнуць хрысціянскае прывітанне, прынялі хлеб-соль. Затым выказалі абурэнне крыжакам і адышлі ад горада. За імі пайшлі і пасаромленыя тэўтоны.

У 1370 г. крыжакі ліхаманкава рыхтаваліся да вайны, але на гэты раз небяспека пагражала ім самім. Беларусы і летувісы ўварваліся ў Прусы двума войскамі: адно з Гародні пад кіраўніцтвам Кейстута прайшло праз пушчу, знянацку напала на крыжацкі замак Орстэльбург, з першага налёту выбіла залогу і спаліла замак. Затым Кейстут прайшоў праз усе Прусы і злучыўся з другім войскам пад кіраўніцтвам вялікага князя Альгерда. Тут адбылася ўпартая бітва з крыжакамі, пасля якой наша войска вярнулася дамоў.



# МІЖУСОБНЫЯ ЗВАДЫ І КРЫЖАКІ Ў ЗАМКУ



Старому замку ў Гародні давялося прыняць удзел і ў міжусобнай вайне паміж сынамі Альгерда і Кейстута – стрыечнымі братамі Ягайлам ды Вітаўтам. Апошні быў гарадзенскім князем; бацька паставіў яго сюды на самастойны ўдзел, каб любімы сын патроху засвойваў навуку дзяржаўнага кіравання. Вітаўт кіраваў добра і шмат зрабіў для Гародні (найперш для гарадзенскага замку, пра што аповяд у спецыяльным раздзеле). Гарадзенцы любілі свайго князя і да апошняй магчымасці захоўвалі яму вернасць.

Ягайла ж быў пакінуты бацькам Альгердам на пасадзе гаспадара – вялікага князя літоўскага. Неўзабаве пасля смерці Альгерда справа дайшла да сапраўднай вайны паміж Ягайлам з аднаго боку і ягоным родным дзядзькам – Кейстутам Гедымінавічам з сынам Вітаўтам – з другога. Пад час міжусобнай вайны ў 1380 г. Кейстут і Вітаўт былі схопленыя Ягайлам і кінутыя ў лёхі Крэўскага замку. Кейстут жывым адтуль ужо не выйшаў, а Вітаўт, пераапрануты жанчынай, уцёк у Ордэн, скуль працягваў змаганне за ўладу ў Вялікім Княстве.

У 1385 г. Ягайла прыняў ад палякаў прапанову стаць іхнім каралём, шляхам шлюбу з каралевай Ядвігай. Аднак губляць уладу над Літвой таксама не хацеў і таму абяцаў польскім магнатам прылучыць сваю радзіму да іхнага каралеўства. Сярод ліцвінскага баярства ўзнялася хваля абурэння, з чаго скарыстаўся Вітаўт і стаў на чале змагання за незалежнасць краіны.

Менавіта ў Гародні ў 1389 г. Вітаўт сабраў сваіх прыхільнікаў, каб заваяваць вялікакняскую карону. Яго падтрымала шматлікая беларуская шляхта, якая не хацела быць у залежнасці ад польскага караля. Па дапамогу супраць Ягайлы Вітаўт звярнуўся нават да злейшых ворагаў айчыны – крыжакоў. Тыя ахвотна далі Вітаўту войска, бо бачылі выгоду ў любой міжусобнай свары ў Літве. Распачалася вайна. Важнейшай апорай Вітаўта была Гародня са сваімі замкамі. З летапісаў мы ведаем пра існаванне тады ў горадзе двух замкаў – Верхняга і Ніжняга. Верхні – самы магутны, гэта наш Стары, Ніжні знаходзіўся на месцы цяперашняга Новага замку.

Вясной у 1390 г. Ягайла з польскім войскам прыйшоў здабываць Гародню. Два гарадзенскія замкі мелі адборную залогу і дасведчаных кіраўнікоў. Камандаваў абаронай саюзнік Вітаўта – дасведчаны ў вайсковай справе крыжак Марквард Зальцбах. Сам Вітаўт у гэты час спяшаўся да Гародні з крыжацкай падмогай, вёз на вазах жыўнасць і прыпасы. Ягайла спрабаваў штурмаваць замкавыя умацаванні, але ўсюды сустракаў упартую і добра арганізаваную абарону. Яшчэ да падыходу Ягайлавага войска крыжакі панішчылі навакольныя вёскі, да таго ж настала вясенняе бездарожжа і ў войску польскага караля пачаўся голад.

Тым часам Вітаўт падышоў да гораду з процілеглага берага Нёману і пачаў шукаць спосабу пераправы да замкаў. Па яго загаду праз бурлівую ў гэтым месцы раку быў перацягнуты ланцуг наўпрост да Верхняга замку. Трымаючыся за ланцуг, можна было перапраўляць лодкі, нагружаныя прыпасамі, да абаронцаў. Жаўнеры Ягайлы не маглі падысці да ланцуга, бо замкі панавалі над ракою. Тады палякі пачалі пускаць зверху па імклівай рацэ вялізныя бярвёны, якія ўрэшце той ланцуг разарвалі. Летапіс паведамляе, што на гэта Вітаўт «з вялікай шкадобай» глядзеў. Работнікі з ланцуга пападалі ў ваду, адзін з іх, ратуючы жыццё, даплыў да правага берага і трапіў у рукі палякаў. Ад яго Ягайла даведаўся пра намеры Вітаўта. Націск на замкі ўзмацніўся і неўзабаве палякі захапілі слабейшы Ніжні замак. Крыжакі з войска Вітаўта вырашылі, што стаяць далей ня мае сэнсу і пачалі адыход. Тым не менш залога Верхняга замку, нават не атрымаўшы падмогу, працягвала адчайна змагацца і здала замак Ягайлу толькі пасля амаль беспепапынных шасцітыднёвых штурмаў.

Вітаўт не збіраўся надоўга аддаваць Ягайлу свой горад. Ужо праз год ягонае войска прыйшло вяртаць Гародню. Сітуацыя перамянілася. Цяпер у Верхнім замку баранілася залога Ягайлы, якая часткова складалася з палякаў, але большай часткай з беларусаў і летувісаў[1]. Войска Вітаўта не асягнула б поспеху, калі б не тыя ліцвіны ў замку. Абстрэл з гарматаў (тады яшчэ вельмі прымітыўных) не рабіў ніякай шкоды сценам, але раптам у замку пачаўся пажар. Беларусы і летувісы з замкавай залогі кінуліся на палякаў, павязалі, замкнулі ў лёхах і адкрылі браму перад Вітаўтам.

[1] *Крыніцы ўсіх разам часта называлі ліцвінамі – ад назвы дзяржавы – Літва, Вялікае Княства Літоўскае.*

Відавочна, за дапамогу супраць Ягайлы Вітаўт дазволіў крыжакам збудаваць два невялікія замкі каля Гародні на левым беразе Нёмана: адзін насупраць гораду, другі трохі далей. Гросмайстар[2] Тэўтонскага ордэна Конрад Валенрод без прамаруды арганізаваў дастаўку матэрыялаў і работнікаў. Замак хутка быў збудаваны, названы Ноенгардэн (Новая Гародня) і абсаджаны крыжацкай залогай. Ордэн зрабіў чарговы важны крок да здабычы Гародні – займеў свае базы непасрэдна каля самога гораду.

[2] *Гросмайстар (па-нямецку – хохмайстар) – вярхоўны кіраўнік ордэна.*





# ЗАМІРЭННЕ ВІТАЎТА І ЯГАЙЛЫ

Неўзабаве Вітаўт набраў такую сілу ў Літве, што Ягайла палічыў за лепшае з ім прымірыцца. Заключыўшы Востраўскае пагадненне (1392 г.), па якому атрымаў вярхоўную ўладу ў краіне, Вітаўт зноў заняўся важнейшай дзяржаўнай справай – паўстрыманнем Ордэна. Найперш ачысціў ад крыжакоў граніцу. Спачатку з вялікім атрадам Вітаўт нечакана захапіў Коўну[1], затым паімчаўся ў Гародню, крыжакоў, якіх там заспеў, кінуў у турму, а замак забяспечыў моцнай залогай. Крыжацкай залозе ў Ноенгардэне загадаў выйсці з замку і здацца, а калі тыя адмовіліся, пачаў рыхтаваць штурм. Крыжакі палічылі за лепшае скарыцца і пайшлі ў вязніцу, а іх замак быў спалены.

Ордэнскае кіраўніцтва не магло даравацьВітаўту такую «здраду». Скарыстаўшыся з ягонай адсутнасці (вялікі князь у гэты час знаходзіўся на поўдні дзяржавы), крыжакі ў вялікай сіле выступілі супраць Гародні. Як на тую бяду, шматлікая залога (каля 4 тысяч чалавек), мела дрэннага камандзіра. Замкі пратрымаліся толькі тры дні. Шмат хто з абаронцаў загінуў, тры тысячы людзей

[1] Зараз горадКаўнас у Летуве.



трапілі ў няволю. Горад быў спалены, замкі разбураныя, ваколіцы спустошаныя. Гэтае паведамленне крыжацкай хронікі – першая і адзіная звестка пра узяцце крыжакамі Старога замку. Аднак трывала замацавацца тут Ордэну не ўдалося.

У 1398 г. Вітаўт падпісаў мір з крыжакамі (праўда, як і многія папярэднія, тое замірэнне доўга не пратрымалася). У тым жа годзе вялікі князь ледзь не згарэў у гарадзенскім замку разам з жонкай. Сярод глухой ночы нечакана ўспыхнуў агонь у спальні. Ці то ад свечкі, ці ад печкі заняліся полымем фіранкі і тканіна на сценах. На шчасце, у тым жа пакоі знаходзілася прыручаная жывёліна – марскі коцік (па іншых сведчаннях – малпа). Тая жывёла князя і ўратавала – заверашчала, кінулася на ложак і абудзіла гаспадара. Вітаўт разам з жонкай ледзь паспеў выскачыць з полымя.

У 1401 г. крыжакі зноў выкарысталі адсутнасць вялікага князя, калі той паехаў у Кракаў. Яны напалі на ваколіцы Гародні, захапілі палонных і 300 коней. Набегі крыжакоў працягваліся да Вялікай вайны 1409 – 1411 г. У ходзе гэтай вайны, 15 ліпеня 1410 г. адбылася генеральная сутычка – адна з самых буйных бітваў сярэднявечча, вядомая як Грунвальдская бітва. Аб'яднанае войска беларусаў, палякаў, летувісаў з дапамогай чэхаў, татараў ушчэнт разграміла ордэнскую армію. Чынны ўдзел у бітве брала харугва гарадзенскіх рыцараў. Ад таго часу крыжацкія напады на Беларусь і Летуву спыніліся раз і назаўжды.





# ЗАМАК ВІТАЎТА

Стары замак упершыню стаў цалкам мураваным дзесьці ў 80-я гады 14 ст. Вялікую перабудову арганізаваў Вітаўт, пасля таго як атрымаў ад Ягайлы пацверджанне на валоданне Гарадзенскім княствам. Апошнія дабудовы былі зробленыя ў канцы 14 – пачатку 15 ст. Замак шмат пацярпеў ад міжусобнай вайны, крыжацкіх нападаў і моцна пагарэў падчас пажару, пра які мы ўжо ўпаміналі. Тым не менш дзяржаўная патрэба ў ім была настолькі вялікая, што кожны раз яго хутка аднаўлялі. Урэшце вялікі дзяржаўны дзеяч – князь Вітаўт правёў генеральную перабудову, галоўным зместам якой была замена драўляна-земляных умацаванняў мураванымі – з каменю і цэглы.

Замак быў збудаваны ў гатычным стылі – суровым і непрыступным. Такім ён і выглядае мінуўшы дзвесце гадоў на гравюры 1568 г. Да нашага часу захаваліся толькі ніжнія часткі муроў. На падставе іх вывучэння архітэктары і археолагі зрабілі дакладную рэканструкцыю замка Вітаўта. Вядомыя даўжыня сцен, колькасць вежаў і г. д. Памеры замка немалыя. Мураваная сцяна над Гараднічанкай мае даўжыню каля 90 м, сцяна з боку Нёмана – каля 120 м, усходняя з боку гораду – каля 46 м, сцяна з уязной вежай – каля 24 м. Над мурамі панавалі пяць вежаў: уязная з брамай і пад'ёмным мостам, сярэдняя – з боку Нёмана, трэцяя – на самым мысе над вусцем Гараднічанкі, чацвёртая – у паўночна-ўсходнім куце і пятая – з боку гораду, бліжэй да брамнай вежы.



Да нашага часу ніводная з іх не дажыла. Да ўсходняй сцяны быў прыбудаваны княскі палац. Над руінамі царквы 12 ст. (Ніжняй), якая ўжо была амаль поўнасцю закрытая культурным слоем, збудавалі новую, значна меншую па памерах (так званая Верхняя царква). Яна ўжо была творам не візантыйскага, а зусім іншага архітэктурнага стылю – гатычнага, прыйшоўшага да нас з Заходняй Еўропы.

Замкавыя сцены мелі да 3 метраў таўшчыні і былі складзеныя з буйных неапрацаваных камянёў. Прамежкі паміж камянямі закладваліся вялікімі цаглінамі. Частка муроў, галоўным чынам вежы, унутраныя паверхні сцен выкладзеныя з цэглы. Абламоўка дзвярных і аконных праёмаў таксама выконвалася з тоўстай (да 8–9 см) гатычнай цэглы. Сцены і вежы былі ўмацаваныя характэрнымі для гатычнага стылю магутнымі каменна-цаглянымі падпоркамі-кантрфорсамі. Цяжкія муры моцна трымаліся на глыбокіх (больш за 4 м) падмурках, якія засцерагалі ад варожых падкопаў у час аблогі. Як і ў кожным сярэднявечным замку, на гарадзенскім была ўласная турма. Яна знаходзілася ў падземных лёхах брамнай вежы.



Археалагічныя раскопкі папоўнілі нашыя веды пра жыццё насельнікаў гарадзенскага замку агромністай колькасцю канкрэтных матэрыяльных рэчаў – артэфактаў. Як і належала чакаць, у культурным слаі на замкавым падворку засталося шмат напамінак пра шматгадовыя войны з крыжакамі. Найперш, гэта выстраленыя некалі з крыжацкіх абложных машынаў вялікія круглыя камяні і цяжкія жалезныя наканечнікі арбалетных стрэлаў – балто́ў. Камнекідальныя машыны прывозіліся пад замкавыя сцены ў разабраным выглядзе, або рабіліся на месцы з падручных матэрыялаў. Іх задачай было разбіваць цяжкімі каменнымі ядрамі абарончыя сцены і вежы, найперш верхнюю частку сцяны, за якой хаваліся абаронцы. Адначасова сваю справу рабілі арбалетчыкі. Арбалет – цяжкая зброя – ужываўся найчасцей падчас абароны і аблогі ўмацаванняў. Падрыхтоўка стрэлу з яго займала намнога больш часу, чым стрэлу з лука. Пакуль арбалетчык пускаў адну стралу, лучнік паспяваў стрэліць да шасці разоў. Пры гэтым страла з лука ляцела далей. Але затое арбалетны болт меў нашмат большую пачатковую хуткасць палёту. Яго цяжкія гранёныя наканечнікі наскрозь прабівалі сталёвыя рыцарскія латы і лёгка выбівалі вершніка з сядла.

Пасля перамогі над крыжакамі Стары замак паступова траціў значэнне абарончага збудавання. Пабітыя крыжакі ўжо і думаць забыліся пра паходы на Гародню. З суседнім Польскім каралеўствам усталяваліся саюзныя адносіны, а з 1569 г. Польшча і Літва аб'ядналіся ў адзінай дзяржаве – Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

Ад канца 15 ст. галоўная небяспека для беларускіх земляў зыходзіла з усходу ад Масквы, але ўсходняя мяжа ад Гародні была далёка. Пасля смерці Вітаўта Стары замак пэўны час быў адной з сядзібаў вялікіх князёў. У 1445 г. сюды да вялікага князя Казіміра Ягайлавіча прыбыло польскае пасольства, каб прапанаваць яму польскую карону.

На самай старажытнай выяве беларускага гораду – гравюры Гародні з 1568 г. – паказаны і Стары замак, збудаваны ў часы Вітаўта. Нават на малюнку з 16 ст. ён уражвае сваім суровым і непрыступным выглядам. Выдзяляецца памерамі вежа, збудаваная яшчэ ў 13 ст. Над высокім нёманскім берагам пануюць магутныя мураваныя сцены, у неба імкнуцца суровыя і стромкія вежы з вузкімі вокнамі-байніцамі. Адразу відаць, што будаваліся яны для вайны, не для раскошы. Можна сабе ўявіць, як па-рознаму выгляд гарадзенскага замку ўздзейнічаў на тагачасных людзей. Крыжацкія штурмавікі мусілі пачувацца перад ім не надта пэўна, а нашым воінам ён, наадварот, саграваў душу надзеяй і гонарам.

На тым жа малюнку на суседнім узвышшы паказаны Ніжні замак. На той час ад ягоных умацаванняў засталіся толькі руіны мураваных сцен. Сярод будынкаў адзін выдзяляецца памерамі. Гэта «каралеўскі дом», збудаваны каля сярэдзіны 15 ст. пад жыллё для вялікіх князёў.





# ЗАМАК СТЭФАНА БАТОРЫЯ

У 70-я гады 16 ст. Стары замак быў зноў моцна перабудаваны па загаду караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя. Перабудова пераўтварыла замак у каралеўскую рэзідэнцыю, зрабіла больш прыстасаваным для жыцця караля і ягонага двара, але ён не перастаў быць магутным абаронным збудаваннем. Кіравалі перабудовай архітэктары з Італіі. Яны пастараліся захаваць пабудовы Вітаўта і толькі перарабілі іх паводле густаў свайго часу, менавіта ў мастацкай традыцыі рэнесансу[1]. Муры старога гатычнага замку перабудова амаль не закранула. Толькі дзве вежы разабралі і перарабілі наноў. Шыкоўны рэнесансавы палац паўстаў на гатычных мурах старога палацу. Атрымалася даволі гарманічнае спалучэнне двух стыляў: палац і вежы рэнесансавыя, сцены гатычныя, агульны план замка таксама застаўся гатычным. Турма была перанесена з-пад брамнай вежы на тэрыторыю Ніжняга замку.

[1] *Рэнесанс – у гэтым выпадку архітэктурны стыль, які прыйшоў на Беларусь у 16 ст.*

Інвентарныя вопісы 17 ст. дапамагаюць вывучыць размяшчэнне замкавых пабудоваў, а таксама выгляд унутраных памяшканняў палацу. Знешні выгляд палаца і замка Стэфана Баторыя мы можам рэканструяваць толькі прыблізна, бо апісанняў яго няма, а сам замак быў моцна зруйнаваны ў пазнейшыя часы.

Уздоўж сцяны над Нёманам размяшчаліся жылыя будынкі для замкавай абслугі і розныя гаспадарчыя пабудовы: такія як пякарня, вазоўня ды розныя склады. Частка пабудоваў з боку Нёмана была двухпавярховай. Недзе на другім паверсе адной з такіх пабудоваў знаходзілася каралеўская лазня з прыгожай алебастравай залай (потым зменена на мармуровую). Над гэтай залай на трэцім паверсе была яшчэ адна зала з 16 вокнамі. У вежы над брамай размяшчалася капліца.

Галоўным будынкам у замку з'яўляўся палац. Ён меў прамавугольную форму (60х21 м). Першы паверх быў прызначаны напалову для вайсковых, напалову для гаспадарчых патрэбаў. Таму ўнутраны выгляд пакояў тут быў сціплы і даволі суровы: магутныя паўкруглыя скляпенні, гладкія тынкаваныя сцены, выкладзеныя з цэглы падлогі, дубовыя або жалезныя дзверы. Зрэдку можна было ўбачыць печ або камін. Частка пакояў служыла для размяшчэння залогі, для гэтага маглі выкарыстоўвацца таксама сутарэнні пад гмахам палаца. У іншых пакоях трымалі зброю, рыштунак вершніка і каня, розныя прылады і матэрыялы. Самы меншы пакой першага паверха быў заняты архівам.

На антрэсолі размяшчалася памяшканне для вартаўнікоў, якія пільнавалі замкавую браму. У спецыяльным асобным пакоі без вокнаў і з адным уваходам знаходзілася скарбніца, у якой захоўвалася срэбра да каралеўскага стала. Першы і другі паверхі не мелі лучнасці. Трапіць на другі паверх можна было толькі з падворку, па параднай лесвіцы, размешчанай пасярэдзіне галоўнага палацавага фасаду.

Другі паверх займалі каралеўскія пакоі, зразумела, самыя багатыя і шыкоўныя. Замежныя і мясцовыя майстры аздобілі столь багатай разьбой, расфарбавалі яе ў розныя колеры і пазалацілі. Падобная столь была таксама ў каралеўскім палацы ў Кракаве на Вавельскім замку.

Дзверы таксама зрабілі разны́мі і шматколернымі: «шэра-залацістага» і іншага колераў. У пакоях стаялі мармуровыя і каменныя каміны. Сцены былі пакрытыя пазалотай, шліфаванай тынкоўкай ды аздобленыя прыгожымі тканінамі з арнаментам і габеленамі, падобнымі да вавельскіх. Падлогу выклалі пліткамі з мармуру і звыклага каменню, а таксама керамічнымі і палiванымі.

У кожным пакоі стаялі печы, зробленыя па італьянскаму ўзору з рэнесансавых маёлікавых кафлін з яркімі фарбамі. Вялікую колькасць гэтых кафлін археолагі знайшлі каля палаца ў час раскопак. Калі ўявім сабе, як тут стаялі яшчэ розныя побытавыя рэчы: свяцільнікі, лаўкі, сталы, крэслы і інш., то вобраз пакояў караля будзе папраўдзе поўным.


СТЭФАН І
БАТОРЫЙ

Кароль Стэфан Баторый упершыню з'явіўся ў Гародні ў 1579 г. Тады ўжо пачалася перабудова замка, але невядома, калі яна закончылася. Праз тры гады, калі ў Гародні адбывалася дзяржаўная нарада, то праходзіла яна не на Старым замку, а ў Каралеўскім доме на месцы былога Ніжняга замку. Відавочна, будаўніцтва на той час яшчэ працягвалася.

Археалагічныя раскопкі, праведзеныя на Старым замку ў наш час, выявілі тыповую для сярэднявечча сітуацыю, калі побач з раскошай ужывалася і крайняя беднасць. Шыкоўны каралеўскі палац быў аточаны малюсенькімі драўлянымі хаткамі замкавай абслугі. Тыя хаткі з мініяцюрнымі дворыкамі займалі ўвесь замкавы двор і былі адгароджаныя ад такіх жа суседскіх дворыкаў радамі ўбітых у зямлю бярвёнаў. Вузкія праходы паміж агароджамі пакрываліся абрэзкамі дошак. Шырэйшыя вуліцы – праезды – масціліся драўлянымі плахамі, пакладзенымі ўпоперак дарогі. Калі ехалі ад брамнай вежы да палаца, то міналі цэлы рад такіх маленькіх дамоў. Яны цісналіся да самага ганку каралеўскага палаца. Але, паўтараем, у тыя часы падобнае суседства было звыклым, і на яго не звярталі ўвагі.

Праз нядоўгі час, дзесьці ў канцы 16 – пачатку 17 ст., замак быў зноў часткова перабудаваны. Падрабязнае апісанне стану замкавых пабудоў у 17 ст. дае інвентар – дакумент, які складалі дзяржаўныя камісары з мэтай уліку маёмасці і высвятлення стану яе захавання. Рабілі яны гэта проста – накіроўваліся на замак і па дарозе апісвалі ўсё, што трапляласа на вочы: мост, вароты ўязной вежы, замкі на варотах і гэтак далей. Затым заходзілі ва ўсе памяшканні і таксама дакладна іх апісвалі: пакоі, дзверы, печы, каміны, мэблю і ўсе, вартыя ўвагі рэчы.



Інвентар дапаможа нам зрабіць невялікае падарожжа ў часе і апынуцца на гарадзенскім замку 17 ст. З горада ў замак вядуць два масты. Па першым можна трапіць з вуліцы Замкавай на былы Ніжні замак. Мост гэты драўляны і падтрымліваецца пяццю муранымі апорамі. Ён заканчваецца брамай. За брамай знаходзіцца мураваная турма з дубовымі дзвярыма. Праход ад брамы да другога моста абнесены агароджай. Другі мост выводзіць непасрэдна да замка. Ён мураваны, з 16 вежкамі па баках. Брама ў замкавай вежы зачыненая вялікімі дубовымі варотамі з весніцамі. Вароты замыкаюцца ўнутраным замком. На самой вежы захаваліся сляды прыстасавання для пад'ёму моста.

Уваходзім у двор. Ён застаўлены невялікімі драўлянымі жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. Яны займаюць заходнюю палову і цэнтр замкавага двара і абнесеныя агароджамі. Некаторыя з пабудоў двухпавярховыя. Драўляныя збудаванні падыходзяць да самага ганку каралеўскага палаца.

З інвентару можна даведацца, што на тэрыторыі замка размяшчалася больш за два дзесяткі драўляных пабудоў. У паўночнай частцы знаходзілася сталоўка. Тут жа ў адным з памяшканняў захоўваўся ваенны рыштунак: гарматы, мушкеты, алебарды, шпагі і розныя даспехі.

У гаспадарчых пабудовах трымалі дровы, а ў адной – дахоўку. На замкавым падворку былі яшчэ: карэтны хлеў, стайня і розныя іншыя будынкі для гаспадарчых патрэбаў, а таксама жыллё замкавай абслугі. Замак знаходзіўся тады ў занядбаным стане: складальнікі інвентару пастаянна адзначалі неабходнасць рамонту пабудоваў, дзвярэй, печаў і гэтак далей. Ужо была разбурана вежа на мысе над Гараднічанкай.



# МІНАЛІ СТАГОДДЗІ

У 1655 г. замак быў разрабаваны, пабураны і спалены маскоўскім войскам. За рускімі прыйшлі яшчэ шведы, і пасля іх замак застаўся ў руінах.

[1] *Сенат – палата сойму, складалася з вышэйшых службовых асобаў.*

[2] *Пасольская палата складалася з паслоў – дэпутатаў ад шляхты.*



У 1673 г. было вырашана праводзіць у Гародні агульнадзяржаўныя соймы. Замак тэрмінова адбудавалі, каб ён мог прымаць усіх удзельнікаў. Будаўнічыя работы праводзіліся пад наглядам Крыштапа Паца – канцлера Вялікага Княства Літоўскага і дзяржаўцы гарадзенскай эканоміі. Асаблівая ўвага была звернутая на залы для Сената[1] і паслоў[2] .

Залу Сената размясцілі ў палацы на месцы даўняга сталовага пакоя і яшчэ двух пакояў з боку горада. Пасольская зала знаходзілася ў новых памяшканнях, збудаваных з боку Нёмана. Планіроўка астатніх жылых памяшканняў часоў Стэфана Баторыя заставалася без зменаў.

Ужо ў 1678 г. у адбудаваным замку адбыўся першы сойм, на якім прысутнічаў кароль Рэчы Паспалітай Ян Сабескі. Пазней у замку адбылося спатканне караля Аўгуста II з рускім царом Пятром I. Яны дамовіліся стварыць саюз супраць шведскага караля Карла XII.

Хоць Пац стараўся аднавіць замак у ранейшым стане, але ў знешнім і ўнутраным выглядзе палаца Стэфана Баторыя адбыліся значныя змены. Не было ўжо эркераў (закрытых балконаў), не было шыкоўных скляпенняў, зніклі каменныя аблямоўкі вокнаў і парталаў, іх замянілі гіпсавымі.

У такім стане Стары замак праіснаваў да 1708 г., калі яго разбурылі шведы ў часе Паўночнай вайны. Разбурэнні былі такімі вялікімі, што замак стаў непрыгодным для правядзення з’ездаў, прыёмаў або сеймаў. У 1729–1730 г. ад пасольскай залы засталіся толькі дзве сцяны, астатнія, падмытыя вадой, рухнулі ў Нёман.

У 18 ст., падобна пры каралі Аўгусце II, замак зноў адбудавалі і прыстасавалі для размяшчэння ніжэйшых па чыне прыдворных. Для караля, для сеймаў, прыёмаў, нарад знайшлі будынкі ў горадзе.



XVIII ст.

Замак паступова прыходзіў у заняпад. У канцы 18 ст. у ім мясціўся Скарбовы трыбунал[3]. Палац быў пакрыты дахоўкай, а на месцы даўняга ганка збудаваны порцік на чатырох калонах з вонкавымі сходамі і балконам – накшталт тэрасы. Выгляд замку ужо амаль нічым не напамінаў рэнесансавую пабудову часоў Баторыя.

*[3] Скарбовы трыбунал – установа, якая кантралявала дзяржаўныя даходы і расходы.*

Яшчэ больш ён страціў рысы арыгінальнасці ў 19 ст., пасля таго як Гародня ўвайшла ў склад Расейскай імперыі. У час паўстанняў супраць царызму ў 1830 і 1863 г. расейскія ўлады размясцілі ў Старым замку турму для паўстанцаў. Пазней у замку знаходзіліся казармы расейскіх войскаў і афіцэрскі клуб.

У 1920 г. Гародня апынулася ў складзе Польшчы. У 1925 г. у Старым замку быў заснаваны гісторыка-археалагічны музей, які існуе там і зараз.

З 1932 па 1939 г. на замку праведзены першыя вялікія археалагічныя раскопкі пад кіраўніцтвам Юзафа Ядкоўскага, а потым Здзіслава Дурчэўскага. Тады і былі адкрыты руіны мураваных збудаванняў 12 ст.: Ніжняй царквы, княскага церама, сцяны на мысе над Гараднічанкай.

Высветлена, што з тых часоў, як у Гародню прыйшлі першыя жыхары, узровень зямлі падняўся амаль на 9 метраў. Гэта адбылося таму, што тут на невялікай пляцоўцы заўсёды жыло шмат людзей. У выніку іх дзейнасці і накапілася столькі зямлі, якую археолагі называюць культурным слоем. У гэтым слаі вельмі шмат старадаўніх рэчаў, згубленых ці выкінутых іх гаспадарамі. На Старым замку цудоўна захаваліся не толькі гліна, але і косць, дрэва, тканіна, насенне, збожжа, амаль не паржавела жалеза. Аднойчы ў культурным слаі 12 ст. мы адкапалі некалькі травяных сцяблінак, якія за 800 гадоў не згубілі не толькі свой зялёны колер, але і пах. Знойдзеныя рэчы дапамагаюць археолагам аднавіць малюнак жыцця даўніх насельнікаў Старога гарадзенскага замка.

Археалагічныя раскопкі далі багаты матэрыял для рэстаўратараў, якія ствараюць праект аднаўлення замка.

Зараз у Старым замку працуе гісторыка-археалагічны музей, які мае багацейшую ў Беларусі археалагічную калекцыю. Значная частка экспазіцыі прысвечаная гісторыі замка. Мы запрашаем вас наведаць гэты прыгожы куточак Беларусі. Там можна пахадзіць па велічных руінах замкавых муроў, паглядзець музей і ўбачыць шмат з таго, пра што тут напісана.



XIX ст.

# Вялікі князь Вітаўт

**КОЖНЫ НАРОД МАЕ СВАІХ ЗНАКАМІТЫХ ЛЮДЗЕЙ. СЯРОД ІХ ВУЧОНЫЯ, ПАЭТЫ, МАСТАКІ, ПАДАРОЖНІКІ, АСВЕТНІКІ, ЛЕКАРЫ, ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ. ЯНЫ СВАІМ ТАЛЕНТАМ І ЎПАРТАЙ ПРАЦАЙ ЗДОЛЕЛІ ПРЫНЕСЦІ ВЯЛІКУЮ КАРЫСЦЬ СВАЙМУ НАРОДУ І ЧАЛАВЕЦТВУ.**

Такія асобы ніколі не знікаюць з зямлі бясследна. Іхнія справы працягваюць жыць і пасля смерці сваіх творцаў. Здараецца так, што слава гэтых знакамітых людзей перажывае нават народы, якія іх узгадавалі.

Імя Вітаўта – адно з найслаўнейшых у гісторыі беларусаў. Больш за пяць з паловай стагоддзяў прайшло ад часу смерці гэтага чалавека, але цікавасць да яго не толькі не затухае, але, наадварот, разгараецца. Вітаўт быў вялікім князем, гаспадаром нашай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага. Дзякуючы свайму таленту, надзвычайнай працаздольнасці і нязломнай волі ён прывёў беларуска-літоўскую дзяржаву да вышэйшага росквіту яе велічы і магутнасці. Вітаўт пражыў доўгае і незвычайнае жыццё, поўнае прыгодаў і дзівосных здарэнняў. Былі паходы, бітвы – цяжкія сутыкненні з закаванымі ў бронь нямецкімі рыцарамі, адчайныя сечы з дзікімі татарскімі загонамі. Былі ўцёкі з глыбокіх замкавых лёхаў з пераапрананнем у жаночае адзенне, было роспачнае ратаванне з поля бітвы ад ворага. Але больш было перамог, і яшчэ якіх!

Цэлыя краіны, пакораныя і сцішаныя, схіляліся перад нашым князем. Мы хочам распавясці табе, чытач, аб жыцці гэтага чалавека. Таму запрашаем услед за намі перанесціся ў дзівосны і таямнічы, страшнаваты і прыцягальны свет беларускага сярэднявечча.





# ЛІТВА – ЯГО РАДЗІМА

У даўнія-даўнія часы, амаль шэсць з паловай стагоддзяў назад, наша зямля была пакрытая такімі дрымучымі і вялікімі пушчамі, што падарожны мог шмат дзён прабірацца праз іх і не сустрэць чалавечага жытла. Зразумела, тагачасныя лясы ажно кішэлі рознай дзічынай, сярод якой самай магутнай жывёлінай быў нават не зубр, а яшчэ буйнейшы за яго дзікі бык – тур. Між яго рагамі маглі спакойна сесці два чалавекі. У рэчках і азёрах вадзілася такая буйная рыба, што мясцовыя людзі лавілі яе на кручок таўшчынёй з мізінец. Можна ўявіць сабе, якое патрэбна было вудзільна, каб выцягнуць такую здабычу. Людзей на Беларусі жыло тады разоў у дзесяць ці нават пятнаццаць меней, чым сёння. Наша краіна не называлася яшчэ Беларуссю, заходнюю яе частку называлі Літвой, а ўсходнюю проста – Руссю. Наша дзяржава мела назоў Вялікае Княства Літоўскае і была яшчэ даволі маладой – не больш ста гадоў. Аснову яе моцы складалі слынныя старажытныя гарады, такія, як Полацак, Віцебск, Менск, Навагрудак, Гародня і яшчэ шмат іншых, якія вядомыя і сёння. Усе яны мелі вялікія і добра ўмацаваныя замкі.

Вось якраз тады, каля 1350 г., у Літве нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Вітаўтам. Краіна перажывала цяжкія часы. Па ўсёй Еўропе гуляў страшэнны мор. Людзі паміралі сотнямі і тысячамі. На целе хворых з'яўляліся чорныя плямы, таму немач назвалі «Чорнай смерцю». Толькі ад адной весткі пра яе набліжэнне пусцелі цэлыя вёскі і гарады. Гэта была бубонная чума, занесеная да нас з Азіі. У гэты ж час нашым продкам даводзілася весці вельмі цяжкую і ахвярную вайну супраць рыцараў Тэўтонскага ордэна.



Не бывае такіх ліхалецццяў, каб іх не перажылі людзі, а тым больш звыклыя да гора беларусы[1]. Ратаваліся ад «Чорнай смерці» ды іншых пошасцяў, адбіваліся ад немцаў і патроху мацавалі сваю дзяржаву, лепшыя часы якой былі яшчэ наперадзе. Кіравалі краінай у той час два браты – князі Альгерд і Кейстут – сыны слаўнага Гедыміна. Сам вялікі князь Гедымін загінуў за дзевяць гадоў да нараджэння ўнука Вітаўта. Яго застрэлілі з гарматы пад час аблогі аднаго з крыжацкіх замкаў. Агнястрэльная зброя тады толькі-толькі з'явілася ў Еўропе. Яна была вельмі недасканалая (металічная трубка) і небяспечная ў карыстанні – магла ўзарвацца, калі насыпалі зашмат пораху.

[1] *У часы, пра якія ідзе гаворка, нашыя продкі часцей зваліся «ліцвінамі» і «русінамі».*



Гедымін пакінуў пасля сябе 7 сыноў і 7 дачок. Сваім сынам ён раздаў у валоданне ўдзелы – буйныя часткі дзяржавы. Цэнтральныя землі са сталічным горадам Вільняй дасталіся аднаму з малодшых сыноў – Яўнуту. Альгерд і Кейстут напачатку прынялі волю бацькі, але праз некалькі гадоў вырашылі, што пры такім падзеле парадку ў краіне не будзе. Яны аб'ядналіся, занялі сталіцу, звялі з вялікакняскага пасада Яўнута і пачалі разам кіраваць дзяржавай. Альгерд прыняў тытул вялікага князя і сеў у сталічнай Вільні. Ен займаўся ўсходнімі справамі дзяржавы: далучаў новыя землі, паспяхова ваяваў з Масквой, нанёс паражэнне татарам у бітве на Сініх водах.

Меншы брат Кейстут прыняў на сябе ўвесь цяжар барацьбы з Тэўтонскім ордэнам. Жыццё гэтага князя-ваяра праходзіла ў бесперапыннай вайне. Ён адбіваў напады крыжакоў і сам спусташаў іхнія землі, помсцячы за страты радзімы. У той вайне перавага ў сіле была на баку крыжакоў. Іх падтрымлівала рыцарства ўсёй Заходняй Еўропы. Амаль кожны год да Прусіі, дзе размяшчаўся Ордэн, з'язджаліся рыцары са сваімі атрадамі, каб ісці ў паходы супраць язычнікаў. На самой справе тэўтонскія рыцары ваявалі не так за веру Хрыстову, як за свае інтарэсы ў Прыбалтыцы. Яны нападалі на беларусаў і гарады-рэспублікі Пскоў ды Вялікі Ноўгарад, нягледзячы на тое, што там таксама жылі хрысціяне. Вайна вялася вельмі жорстка, кожны год рыцары арганізоўвалі адзін ці нават некалькі нападаў на нашыя землі. Стараліся напасці нечакана, палілі і рабавалі вёскі, бурылі замкі (калі ўдавалася іх захапіць), забівалі мужчын, зводзілі ў палон жанчын і дзяцей.

Ліцвіны не паддаваліся, адбіваліся як маглі, будавалі новыя магутныя замкі, хадзілі паходамі на Прусію. У выніку гэтай вайны на мяжы паміж нашай дзяржавай і Тэўтонскім ордэнам утварылася пустынная незаселеная паласа зямлі шырынёй у некалькі дзесяткаў кіламетраў. Людзі баяліся тут жыць, бо гэта было вельмі небяспечнае месца: пастаянна туды-сюды праходзілі крыжацкія і ліцвінскія ваенныя атрады, разведчыкі і проста гурты рабаўнікоў.

На вайну з крыжакамі князь Кейстут паклаў усё сваё жыццё. Ён вызначаўся мужнасцю і высакародствам у баі, таму меў вялікую павагу нават сярод ворагаў. Князь двойчы трапляў у палон да крыжакоў. Першы раз яго абмянялі на вялікую колькасць палонных немцаў, другім разам ён здолеў уцячы з самога Мальбарка – сталіцы ордэнскай дзяржавы. У вязніцы Кейстуту прыслужваў хрышчоны крыжакамі ліцвін, якому тыя давяралі. Князь падгаварыў земляка, і яны разам уцяклі на радзіму, пераапрануўшыся ў крыжацкую вопратку.

Кейстут сябраваў са сваім братам – вялікім князем Альгердам, а той, у сваю чаргу, заўжды быў гатовы дапамагчы грашамі і вайсковай сілай.

Хлопчык, пра якога наша гаворка, нарадзіўся менавіта ў сям'і слаўнага князя Кейстута. Адбылося гэта ў Троках – сталіцы ўладанняў Кейстута. Хлопчык рос у магутным замку, збудаваным яго дзедам Гедымінам на востраве сярод чыстага ляснога возера з маляўнічымі берагамі. Старажытныя песні і паданні, дзівосныя легенды і казкі, пачутыя ад нянек і старых дзядзькоў-вояў, абудзілі ў хлопчыка глыбокую любоў да роднага краю. Усе гэтыя аповяды пра незвычайных волатаў, чарадзеяў, вядзьмарак, лесавікоў, берагіняў прымушалі заміраць і зноў моцна калаціцца сэрцайка.

Вітаўт быў чацвёртым сынам князя, але з цягам часу ён стаў бацькавым улюбёнцам і рыхтаваўся працягнуць справу Кейстута. Князь рос у атмасферы любові і павагі з боку сваякоў і служылых людзей. Разам з тым ён праходзіў суровую школу рыцарскай навукі, бо ў тыя часы быць князем значыла быць воінам і ваенным правадыром. З малых гадоў Вітаўт старанна вучыўся ездзіць верхам, трапна страляць з лука, дасканала валодаць дзідай, мечам і іншымі відамі зброі. Князь вырас не вельмі магутным з выгляду, ён меў невысокі рост і хударлявы целасклад, але заўжды вызначаўся рухавасцю і кіпучай энергіяй. Ён здзіўляў сучаснікаў сваёй выключнай трываласцю, мог з незвычайнай хуткасцю пераадольваць вялікія адлегласці і суткамі не злазіць з каня.

Акрамя фізічнай загартоўкі княжыч атрымаў адукацыю, належную чалавеку яго паходжання. Ён валодаў не толькі старабеларускай, але яшчэ нямецкай і лацінскай мовамі. Поруч з бацькам ён з трынаццаці гадоў браў удзел у далёкіх і небяспечных паходах супраць крыжакоў. Ва ўзросце 27 гадоў малады князь упершыню самастойна павёў войска на вайну. Бацька выдзеліў Вітаўту ўдзел – Гарадзенскае княства, дзе той самастойна кіраваў, засвойваў складаную навуку дзяржаўнай службы.

Быў у Вітаўта добры сябар – стрыечны брат Ягайла – сын вялікага князя Альгерда. Альгерд і Кейстут радаваліся дружбе сваіх сыноў. Яны хацелі, каб парадак і згода ў дзяржаве захоўваліся і пасля іхняга адыходу ад кіравання. Міналі гады. Вітаўт і Ягайла жылі весела і дружна. Маладыя сілы і энергія патрабавалі выйсця. Княжычы хадзілі ў баявыя паходы на землі крыжакоў. Гэта было цяжкай і вельмі небяспечнай справай. Патаемна сабраўшы дружыну, прабіраліся яны вузкімі ляснымі дарогамі і звярынымі сцежкамі ў бок Прусіі. Вораг мог падсцерагаць за кожным дрэвам ці лясным завалам, кожную хвіліну магло пачуцца рэзкае трымценне спушчанай цецівы... Далёка наперад і ў бакі высылаліся дазоры, важка адцягвалі плечы даспехі, рука сціскала рукаятку меча, сэрца поўнілася вострым пачуццём небяспекі і азарту. Князі ішлі на вайну, гэта была іхняя справа.







Амаль такім жа небяспечным было паляванне на буйнога пушчанскага звера. Дзікія быкі, тур ці зубр, лёгка падымалі на рогі паляўнічага разам з канём, маленькая неахайнасць ці прамаруда маглі каштаваць жыцця. Пазней, стаўшы сталымі мужчынамі і кіраўнікамі буйных дзяржаваў, Ягайла і Вітаўт усё роўна захаваюць любоў да пушчанскіх ловаў і будуць займацца паляваннем да самай глыбокай старасці.

Маладыя князі сталелі, станавіліся дарослымі мужчынамі, рыхтаваліся працягваць справу сваіх бацькоў. Краіна перажывала не самыя лепшыя гады. Час ад часу праходзілі новыя эпідэміі, працягвалася вайна з Ордэнам, на заходніх межах палалі гарады і вёскі, галасілі жанкі і дзеці. Але ацалелыя людзі зноў вярталіся на папялішчы, зноў адбудоўвалі жыллё, засявалі палеткі. Дзяржава не толькі не аслабела, але патроху мацавалася. Увесь народ, баяры і простыя людзі разумелі небяспеку крыжацкай навалы і ўсё цясней гуртаваліся вакол сваіх князёў для адпору чужынцам. Вялікае Княства Літоўскае само магло б справіцца з Ордэнам, калі б не вялікая падтрымка таму з боку Заходняй Еўропы. Краіна трымалася, ставіла заслоны крыжакам на Захадзе і пашырала свой уплыў на Усходзе. Але вось у 1377 г. ва ўзросце 81 года памёр вялікі князь Альгерд. Тады яшчэ ніхто не ведаў, што дзяржаву чакаюць новыя цяжкія выпрабаванні і ўнутраная смута.



# СТАЛЕННЕ ГЕРОЯ

На вялікакняскім пасадзе ў Вільні Альгерд пакінуў любімага сына Ягайлу. Здавалася, усё засталося па-ранейшаму, і стары Кейстут падтрымліваў пляменніка ў новай ролі. Аднак хутка між імі наступіў разлад. Ці Ягайла паверыў нагаворам на дзядзьку (кажуць, найбольш нагаворвала на Кейстута маці Ягайлы, княгіня Улляна), што той хоча скінуць яго з вялікакняскага пасада, ці то маладому князю хацелася стаць адзіным панам у дзяржаве. Напэўна, прычына была і ў тым, і ў другім. Вялікі князь Ягайла вельмі любіў уладу і дзеля гэтага парушыў бацькоўскі запавет. У 1380 г. ён уступіў у патаемную змову супраць Кейстута са злейшымі ворагамі айчыны – рыцарамі Тэўтонскага ордэна. Ён дамовіўся, што рыцары будуць нападаць толькі на землі Кейстута, а Ягайла будзе рабіць выгляд, што збіраецца памагаць дзядзьку бараніцца. Для дзяржавы наступілі неспакойныя часы. Князь Кейстут нейкі час нічога не ведаў пра здраду і займаўся сваёй звыклай справай – ваяваў з крыжакамі. Але раптам ён пачаў заўважаць, што ніяк не можа захапіць ворага знянацку, усюды, куды б ні прыйшло яго войска, крыжакі даўно былі гатовыя да абароны (іх папярэджваў Ягайла). Усё стала зразумелым старому вою, калі ён атрымаў ліст ад кіраўніка з парубежнага крыжацкага замку – той паведамляў аб дагаворы з Ягайлам. Магчыма, рыцары спецыяльна паслалі гэтае паведамленне, каб распачаць у Літве міжусобную вайну. Сапраўды, абураны Кейстут выступіў да Вільні, схапіў Ягайлу з паплечнікамі і знайшоў дакументы, якія пацвердзілі здраду. У гэты час да сталіцы прымчаўся Вітаўт, які знаходзіўся ў сваёй Гародні і нічога не ведаў. Відавочна, толькі праз яго заступніцтва Ягайла не быў строга пакараны – яго адправілі княжыць у родавае ўладанне Крэва.

Але на гэтым справа не скончылася. У Ягайлы былі браты, якія кіравалі буйнымі часткамі краіны і маглі сабраць значную вайсковую сілу ў яго падтрымку. Першым супраць Кейстута выступіў малодшы брат Ягайлы – ноўгарад-северскі князь Дзмітры Карыбут. Кейстут пайшоў на яго вайной. У гэты час Ягайла скарыстаўся зручным выпадкам, захапіў Вільню і пад яе сценамі разбіў дружыну Вітаўта. Кейстут з дарогі павярнуў назад да сталіцы. І вось, два войскі сустрэліся і сталі, гатовыя да бітвы, на адлегласці ў некалькі палётаў стралы адно ад другога. З аднаго боку дружыны Кейстута і Вітаўта, з другога – Ягайлы з дапаможным крыжацкім аддзелам.

Толькі крыжакі цешыліся з такога павароту справаў, ліцвінскія вoі з абодвух бакоў не мелі

ніякага жадання праліваць братэрскую кроў. Таму ўсе з надзеяй глядзелі, як ад стана Ягайлы аддзялілася купка вершнікаў – то ехаў на перамовы брат Ягайлы, князь Скіргайла. Ён прывёз прапанову скончыць справу мірам і запрашаў да Ягайлы на мірныя перагаворы. Найбольш узрадаваўся гэтай прапанове Вітаўт, які са скрухай перажываў разлад паміж бацькам і сябрам, шкадаваў парушанай згоды. Асцярожны Кейстут урэшце паддаўся на гарачыя ўгаворы сына і, прыняўшы ад Скіргайлы клятву ў тым, што Ягайла не прычыніць яму ніякай шкоды, паехаў разам з Вітаўтам.

Аднак у лагеры Ягайлы бацьку з сынам акружылі вершнікі і прымусілі накіравацца да Вільні. Войску Кейстута паведамілі, што ўсё ў парадку, і ўзрадаваныя баяры раз’ехаліся па хатах. У Вільні князёў кінулі ў вязніцу. Вітаўт ад перанесенага стрэсу цяжка захварэў. Старога князя па загаду Ягайлы вывезлі ў Крэўскі замак, дзе праз некалькі дзён ён загінуў – быў задушаны. Ягайла адмаўляў сваё дачыненне да смерці дзядзькі, якога шанавала і паважала ўся краіна. Ён загадаў прывезці цела старога ваяра да Вільні і наладзіў яму ўрачыстае пахаванне. Склалі вялікае вогнішча, на якім спалілі цела Кейстута разам са зброяй, коньмі, сабакамі, сокаламі і розным начыннем, як тое было прынята па паганскім звычаі.

Вось так Ягайла дамогся свайго і атрымаў непадзельную ўладу ў Літве. Ён не надта перажываў, што за перамогу было заплачана здрадай, клятвапарушэннем і забойствам. Ва ўсе часы, ва ўсіх краінах знаходзяцца людзі, гатовыя на любое злачынства, каб толькі атрымаць уладу над другімі людзьмі. Падчас гэтых падзей Вітаўт меў за плячамі трыццаць два гады жыцця. То быў ужо сталы мужчына, загартаваны ў ваенных паходах і фізічных практыкаваннях, дасведчаны розумам. Служыць радзіме, як бацька, і жыць у згодзе з Ягайлам, як Кейстут жыў з Альгердам, – вось усё, чаго ён хацеў, да чаго імкнуўся.

Здрада Ягайлы, смерць бацькі, няволя моцна паўплывалі на гэтага ўражлівага і вельмі эмацыянальнага чалавека. Напэўна, яго цяжкая хвароба ў вязніцы – вынік моцнага псіхалагічнага ўзрушэння. Раптоўна разваліўся, разбурыўся ўвесь ранейшы жыццёвы лад, які быў звыклы з дзяцінства, здаваўся такім справядлівым і дасканалым.

Вітаўт ніколі не дараваў свайму býлому сябру смерці бацькі і пазней не раз вінаваціў Ягайлу ў гэтым забойстве. Але пакуль ён не мог і думаць аб помсце, сам сядзеў у няволі і толькі ачуняў пасля хваробы. Яго таксама следам за бацькам вывезлі ў Крэўскі замак. Аднак не такі гэта быў чалавек, каб сядзець і пакорліва чакаць літасці пераможцы. Вітаўт вырашыў ратавацца самому. Дапамагала яму жонка – смаленская князёўна Ганна, якая была побач з мужам і адведвала яго ў цямніцы. Аднойчы яна затрымалася болей звычайнага. Вітаўт пераапрануўся ў адзенне адной са служанак жонкі і так выйшаў з вязніцы. Потым, непрыкметны ў цемры, асцярожна спусціўся па вяроўцы з высокага мура і перабраўся цераз запоўнены вадой роў. Ва ўмоўленым месцы яго ўжо чакалі верныя людзі з асядланымі коньмі.

І вось князь імчыць на поўдзень прэч ад страшнага Крэўскага замка з яго жудаснымі лёхамі і вечна сырымі сценамі (замак узведзены напалову на балоце). Сапраўды, замак у Крэве – не самая вясёлая мясціна на Беларусі. Сёння яшчэ яго руіны ўражваюць падарожнага сярэднявечным духам.

Шлях Вітаўта ляжаў у Мазовію да сястры, якая была замужам за мазавецкім князем. Аднак мазур адмовіў у прытулку, баючыся сапсаваць адносіны з вялікім князем літоўскім. Куды падзецца ўцекачу, якому не было месца на радзіме? Вітаўт мог накіравацца ў Еўропу да двара германскага імператара, мог паехаць на службу да маскоўскага князя. Але і тут, і там яго на ўсё жыццё чакала роля найміта, выканаўцы чужой волі. Такая доля не падыходзіла гордаму ўнуку Гедыміна.

Ён хацеў быць уладаром у сваёй краіне. Сэрца прагнула помсты за смерць бацькі, за тое, што яго самога змусілі стаць уцекачом-выгнанцам. Ён, чалавек, які не ўчыніў ніякага злачынства, павінен бадзяцца па чужых краінах, глытаць пыл чужынскіх дарог, сілкавацца кавалкам чужога хлеба. А здраднік Ягайла, загубіўшы свайго дзядзьку, захапіўшы ўсё яго майно, балюе ў сталічнай Вільні.

Асабліва балюча, што гэты забойца быў найлепшым сябрам. Вітаўт любіў яго больш за родных братоў, а той здрадліва карыстаўся гэтым сяброўствам. Нават тады, калі ўжо задумаў здраду і пад выглядам палявання паехаў дамаўляцца з крыжакамі, то ўзяў з сабой Вітаўта, каб не абудзіць падазрэнняў у дзядзькі. І пакуль Вітаўт займаўся ловамі, Ягайла рыхтаваў згубу ягонаму бацьку!

Такое не даруецца. Куды б ні паехаў, дзе б ні быў, у сэрца грукае прага помсты, і няма чалавеку спакою. Але што можа зрабіць ён, ледзь ўратаваны з няволі, амаль безабаронны, з купкай верных баяраў, якія таксама ратуюцца ад гневу Ягайлы. Заставаўся толькі адзін шлях, дзе можна было знайсці дапамогу – у Тэўтонскі ордэн.

Для тых часоў пераход на бок ворага быў звыклай справай, многія паны рабілі так шмат разоў дзеля ўласнай выгоды. Аднак Вітаўту было цяжка зрабіць падобны крок. Тэўтонскі ордэн – зацяты вораг яго радзімы. Бацька Вітаўта ўсё жыццё паклаў на змаганне з крыжакамі, і сам Вітаўт з дзяцінства ведаў: крыжакі – ворагі, якія хочуць пагубіць яго і з якімі не можа быць згоды. Аднак выбіраць не выпадала, і Вітаўт ступіў на гэты шлях. Тут не было месца шчыраму сяброўству, вернасці крыві і братэрскай любові. Усё вырашала ўлада. Яна была мэтай, яна была богам. За яе здраджвалі, пераступалі клятву, забівалі, ішлі вайной на родную зямлю.

Пераход князя на бок крыжакоў зрабіў вялікае ўражанне на сучаснікаў. Імя Вітаўта побач з імем Кейстута было сцягам барацьбы ліцвінаў за незалежнасць сваёй дзяржавы. Калі Вітаўт паслаў ганцоў на Жамойць (даўняе ўладанне бацькі) з заклікам збірацца да яго ў Прусы, то жамойты не маглі даць веры, што іх князь можа быць у хаўрусе з крыжакамі.

Крыжакі ахвотна прынялі ўцекача, хоць у іх была мірная дамова з Ягайлам. Рыцары карысталіся любым сродкам, каб аслабіць свайго галоўнага ворага – Вялікае Княства Літоўскае. І найлепшы з іх – унутраная вайна між ліцвінамі.

З Вітаўтам рыцары абыходзіліся не надта ветліва, бо для іх ён быў дробным тубыльскім князьком, які не мае ні зямлі, ні войска. Падчас першай сустрэчы хохмайстар (кіраўнік Ордэна) сказаў яму: «Чаму прыйшоў не раней, калі меў віленскі замак, а цяпер, калі не маеш ні людзей, ні зямлі?»

Вітаўт глыбока схаваў свае сапраўдныя пачуцці да крыжакоў, ён навучыўся не зважаць на абразы і ветліва ўсміхацца нават у той момант, калі хацелася пусціць у справу меч. Школа выгнання – вельмі жорсткая школа, і Вітаўт шмат чаму ў ёй навучыўся. Найперш навучыўся цярпець і чакаць свайго часу. Ад Тэўтонскага ордэна яму была патрэбна дапамога супраць Ягайлы. Галоўнай задачай князя становіцца адваёва бацькоўскай спадчыны. Дзеля гэтага ён быў гатовы на ўсё, нават на вайну супраць роднай краіны.

Аднак крыжакі не вельмі спяшаліся даваць Вітаўту войска, а трымалі яго як пагрозу для Ягайлы, спадзеючыся такім чынам змусіць вялікага князя на новыя ўступкі. Сапраўды, Ягайла добра ведаў цану свайму былому сябру і пабойваўся таго нават у выгнанні. Таму спачатку ён ва ўсім саступаў рыцарам, пакуль тыя не захацелі паставіць пад сваё падпарадкаванне самога вялікага князя разам з усёй яго дзяржавай. Тут ужо Ягайла не вытрымаў і адверг нахабныя патрабаванні. Тэўтонскі ордэн адразу ж абвясціў вайну Вялікаму Княству Літоўскаму і выдзеліў войскі Вітаўту.

На чале крыжацкіх ваенных аддзелаў Вітаўт хадзіў вайной на сваю радзіму. Палалі вёскі і гарады, крыжацкія рыцары і жаўнеры забівалі ліцвінаў, рабавалі іх маёмасць, сотнямі і тысячамі вялі ў палон жанчын і дзяцей. Князь абыякава глядзеў на слёзы і пакуты суайчыннікаў, водблескі пажараў не запальвалі гневам яго вачэй, сэрца яго скамянела і не адгуквалася на боль простых людзей. Князем валодала адна прага, адна мэта – вярнуць сабе бацькоўскую спадчыну, стаць уладаром у сваёй краіне.

Вітаўт падпісваў пагадненні, якія яму навязваў Ордэн, згаджаўся на перадачу часткі Літвы і Жамойці і нават на пераход усіх сваіх уладанняў да крыжакоў.

Пазней Вітаўт перанёс страшэнную і непапраўную страту – раптоўна памерлі двое яго маленькіх дзетак Іванка і Юрачка, якія выхоўваліся ў Ордэне. Хадзілі чуткі, што іх атруцілі крыжакі, каб адпомсціць князю за здраду Ордэну і потым забраць сабе яго землі. Урэшце ў Вітаўта засталася толькі адна дачка Соф'я.

У 1383 г. Вітаўту удалося на кароткі час здабыць сабе родавае гняздо – Трокі, але ўтрымацца там ён не здолеў. Рыцары хрысцілі князя па каталіцкаму абраду і далі нямецкае імя – Віганд. Новаспечаны каталік Віганд зноў і зноў хадзіў вайной на Літву, зноў і зноў помсціў Ягайлу. Нарэшце той вырашыў, што выгадней замірыцца з Вітаўтам, чым цярпець такія страты ад вайны. Акрамя таго, Ягайла ў гэты час збіраўся стаць яшчэ польскім каралём праз жаніцьбу з маладой польскай каралевай Ядзвігай. Каб заняцца жаніцьбай, яму патрэбен быў спакой у Літве.

Здаецца, мэта Вітаўта ўжо блізка. Ягайла патаемна прыслаў да яго паслоў, прасіў міра і сяброўства, узамен абяцаў вярнуць бацькоўскія ўладанні. З боку Вітаўта пярэчанняў не ўзнікла. Зразумела, пасля ўсяго, што між імі здарылася, не было гаворкі аб нейкіх сяброўскіх пачуццях, вяртанні юнацкай дружбы. Гэта быў кампрамісны саюз двух палітыкаў, кожны з якіх меў на ўвазе ўласныя мэты і задачы.

Нарэшце Вітаўт мог выказаць свае сапраўдныя пачуцці да крыжакоў, скінуць маску добразычліўца і вернага васала[1], адпомсціць за ўсе крыўды і прыніжэнні. Рыцары надоўга запомнілі адыход Вітаўта з Прусаў у ліпені 1384 г. Князь са сваёй дружынай знянацку захапіў і разбурыў некалькі крыжацкіх замкаў, пазабіваў многіх рыцараў і з трыумфам рушыў да Літвы. Пачаўся новы этап жыцця і дзейнасці нашага героя. Наперадзе былі новыя выпрабаванні, здабыткі і расчараванні, новыя сваркі і замірэнні з Ягайлам.

[1] *Так у сярэднявеччы называўся пан, які падпарадкоўваўся другому, буйнейшаму ўладару – сюзэрэну.*





# УЛАДА ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ

Вітаўт зноў на радзіме. Здавалася, ён дасягнуў таго, за што так упарта змагаўся і плаціў такой дарагой цаной. Вернутая бацькава спадчына. Аднак становішча Вітаўта ў дзяржаве было зусім не падобнае на адносіны Кейстута з Альгердам. Там быў раўнапраўны саюз, змацаваны братэрскім сяброўствам. Ягайла ж і не думаў раўняць з сабою былога сябра, а паставіў Вітаўта ў шэраг іншых удзельных князёў, залежных ад уладара Літвы. Ён перадаў Вітаўту не ўсе кейстутавы землі. У Троках сядзеў малодшы брат вялікага князя – Скіргайла, той самы, які ў 1382 г. падманнай клятвай прывёў Вітаўта з бацькам у рукі ворага. Ягайла не хацеў скласці афіцыйны дакумент, дзе былі б юрыдычна замацаваныя яго адносіны са стрыечным братам.

Вітаўт на першых часах выступаў як верны васал Ягайлы і падтрымліваў таго ва ўсіх справах. Галоўная з іх – жаніцьба вялікага князя з Ядзвігай, а затым каранацыя на Польскае каралеўства. Ягайла дамогся-такі свайго, пераадолеўшы ўсе перашкоды. Самай непрыемнай акалічнасцю было тое, што Ядзвіга ўжо была заручаная з аўстрыйскім герцагам Вільгельмам і шчыра кахала таго. Вільгельм патаемна прыехаў у Кракаў, аднак польскія паны, якія хацелі бачыць каралём ліцвіна, выправадзілі аўстрыяка са сталіцы і давялі справу да патрэбнага ім выніку.

Ягайла дорага заплаціў за каралеўскі тытул. Найперш яму давялося аддаць агромністую суму грошай (з дзяржаўнай скарбніцы Вялікага Княства) у якасці адступнога аўстрыйскаму жаніху. Затым ён, нядоўга думаючы, вырашыў ахвяраваць незалежнасцю сваёй радзімы і ў 1385 г. у Крэве падпісаў унію, якая прадугледжвала ўключэнне Вялікага Княства ў Польскае каралеўства. Акрамя таго новаму каралю давялося пісьмова даць цэлы шэраг шлюбных абяцанняў палякам. Сярод іх – вяртанне усіх земляў, захопленых крыжакамі, і цэлы шэраг прывілеяў панам, якія прывялі яго да кароны. Вітаўт разам з іншымі ўдзельнымі князямі павінен быў асобнай граматай пацвердзіць усе ягайлавы абяцанкі і сваю вернасць польскай кароне. Ён суправаджаў Ягайлу на каранацыю ў Кракаў і нейкі час заставаўся там. Палякі, відаць, баяліся, што хітры Ягайла, атрымаўшы карону, можа хутка забыцца на свае абяцанні.

Вітаўт шмат рупіўся над гаспадарчым развіццём сваіх земляў, падтрымліваў гандаль і рамёствы. Князь таксама мужна абараняў Літву. Разам з братамі Ягайлы ён здабываў ордэнскія замкі і адбіваў крыжацкія напады. На ўсходзе даў рашучы адпор смаленскаму князю, які сабраўся захапіць Мсціслаў і Оршу. Адначасова Вітаўт пачаў рыхтавацца да адкрытага выступлення супраць Ягайлы. У яго накапілася шмат крыўдаў на новаспечанага польскага караля, які хацеў па-ранейшаму панаваць над Літвой. Абяцаў бацькаву спадчыну, ды не ўсю аддаў. Не хацеў даваць ніякіх пісьмовых гарантыяў і збіраўся нават вывесці Вітаўта з родавых уладанняў і адправіць княжыць на поўдзень у чужыя землі. Ягайла крыўдзіў братоў Вітаўта, дарыў каталіцкай царкве землі з яго ўладанняў.

Незадаволенасць Ягайлам шырылася па ўсёй Літве. Ліцвіны не хацелі ні ад каго залежаць, тым больш ад палякаў. Яны заўжды былі вольным народам і стварылі магутную дзяржаву. А тут сам вялікі князь з лёгкасцю згаджаецца на далучэнне яе да Польшчы, уводзіць у ліцвінскія гарады польскія залогі, аддае землі і замкі палякам. Вітаўт вырашыў скарыстаць выгадную сітуацыю і падтрымаць незадаволеных. Урэшце ён стаў на чале барацьбы ліцвінаў за незалежнасць сваёй краіны.

Аднойчы ў пачатку 1389 г. Вітаўт патаемна сабраў на нараду ліцвінскіх баяраў, каб дамовіцца аб сумесных дзеяннях. Вынікам той нарады стала спроба хітрасцю захапіць Вільню. Сястра Вітаўта выходзіла замуж, і князь папрасіў дазволу правесці шлюбныя ўрачыстасці ў сталіцы. Быццам дзеля гэтага ён паслаў у Вільню вялікі санны абоз, які суправаджалі ўзброеныя людзі. Аднак хітрасць раскрылі, і абоз быў затрыманы. Пасля гэтага здарэння становішча Вітаўта ў Літве стала яшчэ больш няпэўным і небяспечным. Ён прыняў рашэнне зноў пакінуць радзіму і ўступіць у саюз з Тэўтонскім ордэнам.

Крыжакі не забыліся на падзеі, якія адбыліся шэсць гадоў назад, яны не даравалі Вітаўту разбураных замкаў і пабітых рыцараў. Але палітычныя разлікі ўзялі верх над крыўдамі. Вітаўт быў ужо не той адзінокі ўцякач-выгнаннік, на Прусы ішоў сталы палітык з моцнай падтрымкай па ўсяму Вялікаму Княству Літоўскаму. Аднак на гэты раз яго прымалі з вялікай насцярогай і падазронасцю. Напачатку да Прусіі выклікалі ў якасці закладнікаў бліжэйшых сваякоў князя: малодшага брата Жыгімонта, жонку Ганну, сястру Рынгалу. 19 студзеня 1390 г. Вітаўт выдаў Ордэну дакумент, дзе абяцаў выканаць усе ранейшыя дамовы, прыйсці ў Прусы і аддаць свой лёс у рукі Бога і хохмайстра Тэўтонскага ордэна.

З Прусаў Вітаўт пачаў новы рашаючы этап змагання за ўладу ў Літве. Разам са сваімі прыхільнікамі, крыжацкім войскам, шматлікімі еўрапейскімі рыцарамі-«гасцямі» ён праводзіў небывалыя па размаху паходы на Літву і найперш на Вільню. Зноў з дапамогай ворагаў ён здабываў сабе дзяржаву і зноў ад гэтага цярпеў просты люд яго радзімы. У 1390 г. тры вялікія войскі адправіліся з Прусаў у ваенны паход на Вільню. Адным з тых атрадаў камандаваў сам Вітаўт. Сярод мноства еўрапейскіх рыцараў вылучаўся заморскі каралевіч – будучы кароль Англіі Генрых IV. Войскі пустошылі ўсё, што траплялася на іхнім шляху, па Нёмане везлі абложныя машыны. Сярод іх былі катапульты велічынёй з добры дом.

Вільню баранілі галоўным чынам польскія залогі, і хоць прыхільнікі Вітаўта падпалілі Крывы горад, сталіца ўстаяла. Абодва бакі пацярпелі падчас аблогі значныя страты, загінуў брат Ягайлы Карыгайла і брат Вітаўта Таўцівіл. Не скарыўшы замкаў, крыжакі з вялікай здабычай адышлі.

Вітаўт станавіўся ўсё больш небяспечным для Ягайлы. Справа ішла да таго, што ён мог пры падтрымцы ліцвінаў усталявацца ў Літве. Вітаўт ужо здабыў уласнымі сіламі без крыжацкай падмогі сваю Гародню. Тут справа таксама не абышлася без унутранай падтрымкі. Ліцвіны з залогі нечакана напалі на палякаў, захапілі іх і перадалі Вітаўту разам з ключамі ад замка. Вырас міжнародны аўтарытэт Кейстутавіча. Маскоўскі вялікі князь Васіль Дзмітравіч узяў за жонку яго дачку Соф'ю. Спецыяльнае пасольства, мінаючы ўладанні Ягайлы, прыехала ў Прусію за маладой. Соф'я накіравалася ў далёкую Масковію таксама кружным шляхам праз Балтыйскае мора і стала вялікай княгіняй маскоўскай.

Урэшце Ягайла вырашыў зноў мірыцца з братам і зрабіць Вітаўта саюзнікам, пакуль той сам не ўзяў, што хацеў. Аднак узнікла адна цяжкасць – крыжакі пільна сцераглі Вітаўта, а патрэбна было ўсё абгаварыць і паразумецца. Ягайла хутка знайшоў магчымасць паслаць надзейнага чалавека, не абуджаючы падазрэнні тэўтонаў. Тым чалавекам стаў адзін з мазавецкіх князёў – Генрых. Ён карыстаўся даверам у Ордэне, бо атрымаў нямецкае выхаванне, і прыбыў зараз да Прусаў у якасці афіцыйнага прадстаўніка польскага караля. Генрых наладзіў сувязь з Вітаўтам і паціху давёў справу да агульнай згоды. Цяпер Вітаўту патрэбна было арганізаваць вяртанне на радзіму, пакуль рыцары ні аб чым не здагадваліся. Ён правёў гэтую аперацыю бліскуча. Спачатку пачаў патроху збіраць да сябе ў замак Рыттэрсвердэр сваякоў і верных прыхільнікаў. Па яго прозьбе хохмайстар адпусціў жонку, затым па чарзе прыехалі князі і баяры. Не ўдалося забраць толькі малодшага брата Жыгімонта. Пасля адыходу Вітаўта той доўгія шэсць гадоў правёў у крыжацкай няволі, пакуль брат не вызваліў яго.

Наступіў вызначаны час. Каб зусім заспакоіць сваіх наглядчыкаў, Вітаўт сабраў замежных «гасцей» быццам для паходу на Літву. Раптоўна ліцвінская дружына напала на крыжакоў у замку, захапіла і разбурыла ўмацаванні. Затым гэтак жа нечакана Вітаўт захапіў яшчэ два ордэнскія замкі і, адаслаўшы еўрапейскіх рыцараў, накіраваўся ў Літву. Насустрач яму выехаў Ягайла. 5 жніўня 1392 г. у Востраве на Гарадзеншчыне стрыечныя браты заключылі афіцыйную дамову, вядомую ў гісторыі як Востраўскае пагадненне. Нарэшце Вітаўт стаў вялікім князем літоўскім.



# РУПЛІВЕЦ ГАСПАДАРСТВА

Перад новым вялікім князем ляжала агромністая краіна, аслабленая войнамі і міжусобнымі сварамі. Хоць паводле традыцыі Вітаўт меў афіцыйны тытул гаспадара дзяржавы, сапраўдным гаспадаром ён не быў. Многія ўдзельныя князі лічылі сябе ледзь не цалкам самастойнымі ўладарамі сваіх земляў. Самымі моцнымі з іх былі Альгердавічы – браты Ягайлы, якія ў большасці ставіліся да Вітаўта варожа. Ягайла падчас перамоваў здолеў навязаць як мага болей выгодных для яго і невыгодных для Вітаўта ўмоваў. Вітаўт вымушаны быў прызнаць сябе васалам польскага караля. Аднак гэта не вельмі непакоіла вялікага князя – былі б сілы, то будзе і воля. Значна цяжэй складваліся яго адносіны са сваімі ўдзельнымі князямі. Першым паўстаў Дзмітры Карыбут, які ваяваў яшчэ супраць Кейстута. У адкрытым баі Вітаўт яго разбіў, захапіў у палон і адправіў у Кракаў на суд каралю. Падобны лёс напаткаў шмат каго з тых, хто не хацеў паддавацца волі вялікага князя.

Гэты невысокі і нястрашны з выгляду чалавек з заўсёднай лагоднай усмешкай на вуснах меў нязломную волю, умеў без знешніх эфектаў прывесці да пакоры любога і мог, не змяніўшыся ў твары, прысудзіць чалавека да смерці. Княскі гнеў быў страшнейшы за смерць. Летапісец паведамляе, як падчас грунвальдскага паходу два ліцвінскія воі былі спайманыя на рабаўніцтве. Іх прывялі да Вітаўта, і той без лішніх слоў загадаў ім самім сябе павесіць. Тыя не прамарудзілі выканаць загад, надзелі сабе на шыі петлі.

У 1395 г. раптоўна развітаўся з жыццём галоўны сапернік Вітаўта ў Літве – Скіргайла Альгердавіч. Летапіс паведамляе, што князь памёр ад атруты. Шмат хто лічыў, што тут не абышлося без Вітаўта. Усяго праз некалькі гадоў пасля яго ўзыходу на вялікакняскі пасад Літва зноў стала адзінай дзяржавай з моцнай цэнтральнай уладай.

Вітаўт паступова скарыў удзельных князёў, адных разбіў у адкрытым баі, другіх пераведў на меншыя ўдзелы. Адначасова князь мацаваў сваю галоўную апору ў дзяржаве – служылае баярства. Атрымліваючы ад вялікага князя маёнткі, пасады, узнагароды, баяры былі гатовыя служыць уладару душой і целам і без ваганняў пакласці за яго галаву. Вітаўт умеў быць шчодрым і ніколі не пакідаў без узнагароды верную службу. Шмат хто разбагацеў з яго дараванняў.

Гісторыя памятае здарэнне, калі адзін паляк, верна справіўшы службу вялікаму князю, збіраўся вярнуцца на радзіму. Вітаўт паклікаў яго да сябе і надзяліў значнай сумай грошай. Побач была жонка князя Ульяна (князь жаніўся другі раз пасля смерці Ганны). Яна пачала вымаўляць мужу за тое, што ён раздае дзяржаўныя грошы. Вітаўт нічога не адказаў, толькі падвоіў узнагароду. Жонка зноў не сцярпела. Так адбывалася некалькі разоў, пакуль спалоханая кабета не замоўкла. Паляк, разгублены ад неспадзеўкі, паехаў на радзіму багацеем.

Патроху пашыраўся ўплыў Літвы на Русі. Асаблівa прыязныя адносіны склаліся з Цвярскім княствам – адвечным сапернікам Масквы. З рэспублікамі Псковам і Вялікім Ноўгарадам Вітаўт то мірыўся, то пагражаў вайной і хадзіў на іх у паходы. У 1389 г., выконваючы яго волю, ноўгарадцы прынялі да сябе князем выдатнага літоўскага палкаводца Сямёна Лінгвена Альгердавіча.

Вітаўт быў шчодрым уладаром, справядлівым суддзёй і верным сябрам. Але ён мог быць таксама хітрым і жорсткім палітыкам. Аб апошнім сведчыць яго ўчынак са смаленскімі князямі. У 1395 г. вялікі князь сабраў войска і аб’явіў паход супраць татараў. Па дарозе ён падышоў да Смаленска і спыніўся побач з горадам. Смаленскае княства было амаль незалежнай дзяржавай і мела сваю княскую дынастыю. Аднак мясцовыя князі сварыліся між сабой, дзялілі і ўсё ніяк не маглі падзяліць уладу. Вітаўт запрасіў да сябе ў лагер двух варагуючых князёў, каб вырашыць іх спрэчку. Тыя, узрадаваныя, прыехалі – спадзяваліся, што уладар Літвы сваім аўтарытэтам спыніць разлад між імі. Аднак даверлівых смалянаў чакала горкае расчараванне. Вітаўт прыйшоў да Смаленска зусім не для таго, каб займацца дробнымі мясцовымі звадамі. Па яго загаду смаленскія князі былі схопленыя і вывезены ў Літву. Ліцвінскае войска заняло горад, а потым і ўсё княства.

Пасля апошняга разрыву Вітаўта з Ордэнам крыжакі пачалі помсціцца і павялі вайну супраць Літвы з небывалым да гэтага імпэтам. Войскі Ордэна амаль штогод урываліся ў межы Вялікага Княства, нішчылі паселішчы, забіралі ў палон мясцовы люд. Яшчэ нядаўна Вітаўт сам поруч з рыцарамі ўдзельнічаў у такіх нападах, а цяпер ён старанна арганізоўваў абарону і рашучы адпор крыжакам.

У тагачаснай вайне галоўнай задачай было своечасова даведацца аб намерах ворага, яго сіле і накірунку паходу. Для гэтага ствaралася дасканалая сістэма выведу. Памежная варта трымала пад наглядам лясныя дарогі, рачныя броды, каб пры першым з'яўленні ворага перадаць па ланцужку ў бліжэйшы замак сігнал трывогі. Тады ва ўсе бакі ляцелі ганцы, людзі з навакольных вёсак беглі да замка, неслі свой скарб, гналі жывёлу. Збіраліся мясцовыя баяры і рыхтаваліся да абароны. Аднак не так шмат было на мяжы магутных замкаў, каб усе жыхары ваколіцы маглі ў іх схавацца. Таму мясцовы люд рыхтаваў сабе сховішчы ў дрымучых гушчарах і непраходных балотах, ладзіў тайнікі для захавання збожжа і маёмасці.

Вось наехалі крыжакі, падступілі да замка, пачалі рыхтавацца да аблогі: апранаць даспехі, рыхтаваць балісты і тараны. Развяваюцца харугвы, бегаюць жаўнеры і збраяносцы, трубяць ражкі. Сярод шэрай масы выдзяляюцца постаці ў белых плашчах з чорным крыжам на грудзях. Гэта рыцары Тэўтонскага ордэна.

Асобна выстройваюцца атрады прыезджых еўрапейскіх рыцараў-гасцей. Яны апранутыя больш страката і ярка. На шчытах і харугвах намаляваныя каляровыя рыцарскія гербы. Пачынаецца аблога замка. Абложныя машыны, балісты і гарматы са страшэннай сілай б'юць каменнымі ядрамі ў замкавыя муры, шпурляюць у двор гаршкі з палаючай смалой.

Калі ўдавалася зрабіць у сцяне пралом, то туды кідаліся штурмавыя групы з лесвіцамі. Іх прыкрывалі арбалетчыкі і лучнікі, якія безупынна абстрэльвалі байніцы замка. Рыцары Тэўтонскага ордэна былі спрактыкаванымі ў аблозе і штурме замкаў, ведалі шмат розных прыёмаў і хітрасцяў. Пад прыкрыццём вялізных шчытоў-насцілаў жаўнеры і палонны мясцовы люд (яго гналі пад прымусам) падбіраліся да замкавага рова і засыпалі яго ў патрэбным месцы галлём, каменнем, зямлёй. Тады ў справу ўводзілася драўляная штурмавая вежа на калёсах. Гэтае збудаванне спецыяльна выкарыстоўвалася для штурму замкаў і рыхтавалася загадзя. Вежу ў разабраным выглядзе падвозілі да месца, хутка даводзілі да ладу і ставілі на колы. Потым яе павольна пасоўвалі ўпрытык да замкавых муроў, і ўдарныя групы з самых моцных і адчайных вояў пераскоквалі з яе на замак і мячамі пракладвалі дарогу астатняму войску.



Падрыхтоўка і выкарыстанне вежы было вельмі складанай задачай, якая далёка не заўсёды вырашалася паспяхова. Нейкая выпадковасць ці пралік маглі сапсаваць усю справу. Найперш патрэбна было дакладна вызначыць вышыню вежы, бо калі яе верхняя пляцоўка знаходзілася ніжэй замкавай сцяны, то ўся работа аказвалася марнай. Вельмі няпроста было падвесці вежу да патрэбнага месца. Калі роў быў засыпаны недастаткова шчыльна, то магло праваліцца кола і засесці ў выбоіне – ні ўзад ні ўперад.

Абаронцы ў гэты час не спалі ў шапку. Яны таксама мелі багаты баявы вопыт, умелі будаваць балісты і трапна страляць. На вежу абвальваліся агромністыя камяні, сыпаліся запальныя стрэлы, спецыяльныя атрады былі гатовыя ў зручны момант падабрацца



да яе, каб разваліць або падпаліць. Часта вежа не паспявала і блізка падабрацца да замкавых муроў, як ужо палала, развальвалася пад градам камянёў. Звычайна абложнікі адначасова выкарыстоўвалі розныя метады штурму, каб раздзяліць сілы абаронцаў, прымусіць іх змагацца адразу ў некалькіх месцах. Не грэбавалі подкупам і катаваннем палонных, каб даведацца аб слабых месцах абароны і патаемных выхадах з замка.

Паспрабуем уявіць, як адбываўся штурм замка. Балісты крыжакоў бесперапынным боем зрабілі ў верхняй частцы сцяны шырокі пралом, куды можна дабрацца па лесвіцы. У некалькіх месцах пад прыкрыццём шчытоў удалося заваліць абарончы роў. Ужо стаіць на колах штурмавая вежа, у ёй схаваліся воі, гатовыя па першым сігнале зрушыць гэтую махіну і пасоўваць у патрэбным кірунку. Затаіліся штурмавыя групы, забяспечаныя доўгімі лесвіцамі, вяроўкамі з крукамі, расстаўлены лучнікі і арбалетчыкі стралковага прыкрыцця. Усе гатовыя, кожны ведае сваё месца і баявую задачу.

Пачынае світаць, спачатку амаль непрыкметна, а потым усё хутчэй і хутчэй начныя прыцемкі саступаюць месца дзённаму святлу. Усё выразней вымалёўваюцца ў ранішнім тумане суровыя і строгія абрысы ліцвінскага замка. Там таксама не спяць і чакаюць. Яны ведаюць аб атацы. Такія рэчы немагчыма рыхтаваць незаўважна. Здаецца, неймаверная трывожная напруга, якая авалодала тысячамі ўзброеных, гатовых да бою людзей, хваляй сягае за замкавыя муры і перадаецца іх абаронцам. Там усю ноч адчуваўся нейкі рух. Ліцвіны спрабавалі заваліць пралом у сцяне, рыхтавалі зброю і рыштунак. Але пад раніцу і там усё сціхла.



Вось, на макаўцы спічастай вежы замка, пакрытай чырвонай дахоўкай, бліснуў першы сонечны прамень. Сонца – зорка, якая паклала пачатак зямному жыццю, зараз мусіла стаць сігналам для смерці. Пачуўся высокі гук баявога ражка, і ўсё прыйшло ў рух. З лязгам апусціліся на твар прылбіцы шлемаў, рукі сціснулі рукаяткі мечаў і перакладзіны лесвіцаў, зашчоўкалі механізмы зарадкі арбалетаў, натужна зарыпелі колы абложнай вежы. Штурмавыя атрады высоўваюцца з прыкрыцця і подбегам кіруюцца да замкавых сценаў. Грудзі напаўняе свежае ранішняе паветра, вось ужо чуваць посвісты першых ліцвінскіх стрэл. Трапечуцца харугвы, ляскоча зброя, гудуць трубы, з сотняў грудзей вырываецца глухі рык, каб падбадзёрыць сябе, заглушыць страх.

Многае залежыць ад гэтых першых хвілінаў бою. Самы нязначны поспех аднаго ці другога боку можа акрыліць або прывесці ў роспач войска і вырашыць усю справу. Вось запалала штурмавая крыжацкая вежа і з замка данёсся шматгалосы пераможны крык. Вось са сцяны над праломам сарваўся ўніз працяты арбалетнай стралой ліцвін, і адразу – радасны покліч у шэрагах штурмавікоў. Полымя на вежы ўдалося збіць, яна няўмольна сунецца наперад, дзесяткі лесвіц прыхінуліся да сценаў, найбольш каля пралома, па іх, як саранча, лезуць наверх рыцары і жаўнеры. Абаронцы сякерамі разносяць у шчэпкі драбіны, басакамі адпіхваюць іх ад сцяны, льюць на галовы крыжакам кіпень, гарачую смалу, нечыстоты, скідваюць буйныя камяні і бярвенні. З абодвух бакоў свішчуць стрэлы. Воі звярэюць ад страху, болю, крыві, многія губляюць кантроль над сабой, скідваюць цесныя шлемы. Адзін крыжак, вылезшы ў пралом з мечам у руцэ, раптам рынуўся ўсім целам уніз на падворак, прама на дзіды абаронцаў. Групе крыжакоў удаецца прабіцца праз пралом у замак. Тут ужо гатовы іх сустрэць. Насупраць пралому выстраены спецыяльны ўдарны атрад ліцвінаў. Наперадзе яго шэраг арбалетчыкаў. Яны даюць залп ва ўпор па штурмавіках і разбягаюцца ў бакі, прапускаючы калону цяжкаўзброеных вояў. Праз некалькі хвілін роспачнай сечы група крыжакоў знішчана – ацалелыя ад стрэл, паляглі пад дзідамі і мечамі.

Прыпыніўся рух абложнай вежы, яна засела ў рове ў некалькіх кроках ад сцяны замка. Адзін з крыжацкіх вояў у азарце скочыў з яе верхняй пляцоўкі прама на дах баявой галерэі замка. Ён упаў грудзьмі на дахоўку, пачаў апаўзаць, зачапіўся рукамі, завіс нагамі над байніцай і стаў выбірацца наверх, але ў гэты момант быў працяты з байніцы дзідай і з роспачным крыкам паляцеў уніз. Пахіленую вежу ўсё ніяк не ўдаецца зрушыць з ямы, абаронцы з трох бакоў кідаюць на яе палаючыя паходні, гаршкі са смалой, ва ўпор расстрэльваюць вояў, пакуль тыя не пакідаюць вежу, каб не згарэць зажыва.

Праз нейкую гадзіну становіцца зразумелым, што штурм адбіты. Ліквідаваныя невялікія групы аблжнікаў, якія здолелі прарвацца на замкавыя сцены, але не атрымалі своечасовай падтрымкі, палае аблжная вежа.

Нарэшце камандзір крыжацкага войска дае загад трубіць адбой. На душы ў яго прыкра. Усё было арганізавана як след, і быў момант – ён адчуў, што справа зроблена, калі групе атакуючых удалося пераадолець пралом у сцяне. Ён адразу накіраваў туды рэзервовы атрад, каб развіць поспех. Але калі атрад пачаў набліжацца да сценаў, раптам камень з замкавай балісты збіў з ног яго камандзіра. Некалькі хвілін затрымкі, пакуль выносілі параненага, дорага каштавалі крыжацкаму войску. Ліцвіны ліквідавалі прарыў і зноў наладзілі абарону.

Комтур – правадыр паходу – зразумеў: гэты замак ён зараз не возьме. Мала людзей, мала харчовых прыпасаў, мала часу. Калі затрымацца яшчэ на некалькі дзён, то можна трапіць пад удар ліцвінскай падмогі, а не дай Бог, сам вялікі князь наедзе з войскам. І вось, крыжакі кіруюць дамоў у Прусы, яны вязуць параненых і здабычу, вядуць палонных.

Пройдзе шмат гадоў, і археолагі падчас раскопак будуць знаходзіць сляды той сечы: вялізныя старанна абчасаныя каменныя ядры ад балістаў, дэталі лука ці арбалета, важкія сталёвыя наканечнікі арбалетных стрэлаў. Аўтару гэтых радкоў давялося ўдзельнічаць у раскопках аднаго з такіх замкаў ў горадзе Ліда. Там сярод знаходак быў конскі чэрап, у якім стырчэў глыбока ўвагнаны арбалетны болт, так яго і перадалі ў музей. Рэчы з археалагічных раскопак, ды яшчэ скупыя радкі крыжацкай хронікі – вось амаль і ўсё, што дайшло да нас ад тых далёкіх падзей, ад людзей, якія былі іх удзельнікамі.

Але нават па тых сцiслых нешматслоўных апiсаннях храністаў мы адчуваем напоўненасць тагачаснага жыцця, адчуваем дух сярэднявечча. Вось, напрыклад, урыўкі з паведамлення аб адным з вялікіх крыжацкіх паходаў на Літву, у якім, верагодна, удзельнічаў сам храніст. У 1394 г. хохмайстар Ордэна Конрад фон Юнгінген арганізаваў выправу, якая мела мэтай адбудову знішчанага ліцвінамі замка Рыттэрсвердэр і напад на Вільню. Войска складалася з ордэнскіх аддзелаў, рыцараў з Францыі, Германіі, а таксама наймітаў – 150 бургундскіх лучнікаў. Пакуль крыжакі плылі па невялікіх рэках да Нёмана, жамойты данеслі аб гэтым Вітаўту. Слухаем далей храніста 14 ст.: «Магістр са сваімі людзьмі хутка плыў на лоддзях па Нёмане, дайшоў да Рыттэрсвердэра, стаяў там чатыры дні і чуў, як надышоў Вітаўт з вялікім войскам, які прыбыў да гэтага краю з нядобрымі намерамі і гарматамі. Ён страляў па палатках магістра, вялікага маршала, а найбольш па палатцы комтура з Балгі. Хохмайстар таксама загадаў нацэліць свае гарматы на ворага».



Некалькі дзён прайшло ў перамовах і дробных сутычках. Вітаўт ухіляўся ад бітвы і перашкаджаў крыжакам адбудоўваць замак. Нарэшце ордэнскае войска, не выканаўшы першай задачы, накіравалася ў бок Вільні па кароткай дарозе. Далей зноў слова храністу: «Схапілі аднаго ліцвіна, ад якога даведаліся, што Вітаўт стаў у лесе паміж засекамі ў васьмі далінах, ён мае гарматы і да іх безліч боепрыпасаў і ў яго войску былі жмудзіны. Пачуўшы гэта, хохмайстар правёў нараду, адважыўся ісці іншай дарогай цераз пушчу. Той дарогай прусакі ніколі не хадзілі і пракладалі сабе шлях і клалі масты праз дрыгву. На ноч хохмайстар стаў у нейкім вялікім лесе, дзе мала меў спакою і дзе не знайшлі пашы для коней».

Нарэшце крыжакі прайшлі пушчу і выйшлі да сталіцы Вялікага Княства. Распачалася аблога віленскіх замкаў. Ліцвіны мужна трымаліся і выходзілі біцца з ворагам за муры. Ім дапамагаў Вітаўт, які пастаянна быў непадалёк з моцным войскам і праз разведчыкаў пільна сачыў за ўсімі дзеяннямі ворага. Зноў слова храністу: «Ноччу 400 чалавек (ліцвінаў) выйшлі з замка, каб напасці на спаўшых лучнікаў і гарматы. Але сустрэлі брата[1] Ёгана фон Штрыфена, комтура з Брандэнбурга, які выйшаў у дазор; яго па-непрыяцельску пачалі біць стрэламі, але на крык на дапамогу комтуру прыбеглі людзі з Балгі. І так біліся ў ночы».

[1] *Рыцары Тэўтонскага ордэна называлі адзін аднаго братамі.*

Бесперапынным гарматным абстрэлам крыжакі ў некалькіх месцах разбілі замкавыя муры, але праврацца ў замак не здолелі. «Хацелі таксама новым ровам адвесці ваду ад сценаў замка і пачалі капаць яго, але шмат прусакоў было паранена, таму кінулі працу, пакінуўшы равы, як даўней былі. Выбілі таксама пралом у муры, праз які быццам ластаўкі (ліцвіны) вылятаючы і вяртаючыся з дзідамі і мечамі забівалі хрысціянаў і зноў папраўлялі прабіты мур. Прыдумлялі розныя хітрасці, якімі дражнілі войска, бо беглі да шалашоў (крыжацкіх), быццам хацелі іх запаліць, і ўжо ўстанавілі гарматы для страляння па хрысціянах. Аднаму дваранiну адарвала абедзве галёнкі, другі быў забіты паганамі, і так ад каменняў і стрэлаў шмат хрысціянаў пацярпела, а войска было змушана адступіць».

Крыжакі вярнуліся ў Прусы, не выканаўшы пастаўленых задач. Пасля гэтага паходу некалькі гадоў прайшло ў дробных стычках, перамовах і перамір'ях.

У 1398 г. Вітаўт зрабіў чарговы паварот у сваёй знешняй палітыцы, скіраваўшы пагляд на Усход. Перад гэтым ён пастараўся забяспечыць спакой на заходняй мяжы дзяржавы і дамогся мірнага пагаднення з Ордэнам шляхам часовых уступак крыжакам. Непасрэдным штуршком да замірэння з рыцарамі стаў абразлівы ліст, пасланы вялікаму князю польскай каралевай Ядзвігай. Гэтая кабета ўдзельнічала ў дзяржаўных справах не менш за Ягайлу і мела не менш за яго ўлады. Яна не любіла Вітаўта, найперш за тое, што ён мала лічыўся з Польшчай і вёў самастойную палітыку. Раздражнёная жанчына, падбухтораная сваімі дарадцамі, паслала вялікаму князю ліст, у якім запатрабавала, каб Літва ў знак васальнай залежнасці заплаціла даніну Польшчы. Вітаўт сабраў да сябе на раду баяраў і запытаў іх, ці згодныя яны быць пад палякамі. Абураныя ліцвіны заявілі, што іхні край заўжды быў вольны.

Неўзабаве Вітаўт заключыў мір з Тэўтонскім ордэнам, вядомы ў гісторыі як Салінскае пагадненне 1398 г. Салін – востраў у ніжнім цячэнні Нёмана. Сюды ў атачэнні вялікай світы з’ехаліся вялікі князь з хохмайстрам і пастанавілі: Вітаўт саступае Ордэну частку земляў у Жамойці і дапамагае збудаваць два ці тры замкі на мяжы, а рыцары адпускаюць з палону яго брата Жыгімонта. Вітаўт будзе дапамагаць Ордэну заваёўваць Пскоў, а рыцары Вітаўту – Вялікі Ноўгарад.

Улетку 1398 г. Вітаўт вадзіў свае войска ў стэп і прывёў адтуль шмат палонных татараў, якіх ён рассяліў па Літве. Нашчадкі тых палоннікаў і сёння жывуць у нас на Гарадзеншчыне ды Віленшчыне. Яны засвоілі беларускую мову, але захавалі даўнюю веру – мусульманства.

Новая выправа ў стэп рыхтавалася няспешна і грунтоўна. Татарскія орды былі галоўнай перашкодай да пашырэння ўплываў Літвы на паўднёвую частку Русі. Са стэпу заўжды павявала пагрозай. Напады качэўнікаў былі імклівымі і спусташальнымі. Пасля іх заставалася пустка. Вітаўт спачатку імкнуўся выкарыстаць дыпламатычныя сродкі. Ён прыняў да сябе хана Тахтамыша, які пацярпеў няўдачу ў змаганні за ўладу ў Залатой Ардзе і ратаваўся ўцёкамі. Вітаўт абяцаў хану дапамогу і сваё слова стрымаў – пройдзе час і Тахтамыш стане татарскім уладаром.



Летам 1399 г. у паход на татараў выправілася моцнае ліцвінскае войска, а таксама дапаможныя аддзелы палякаў і рыцараў Тэўтонскага ордэна (адпаведна 400 і 100 капейшчыкаў). Месцам збору быў Кіеў. Вось войска ўступае ў стэп. Рыцары і жаўнеры пачуваюць сябе ўпэўнена, ідуць і едуць спакойна – ніхто ў стэпе не асмеліцца напасці на такую магутную армію. Сустрэча з ардой адбылася на рацэ Ворскле. Хан Цемір-Кутлук, пабачыўшы моц хрысціянскага войска, пачаў перамовы аб міры.

Вітаўт патрабаваў, каб татары прызналі вяршэнства над сабой Літвы і ў знак гэтага плацілі даніну, а на сваіх манетах чаканілі партрэт вялікага князя літоўскага. Цемір-Кутлук не пярэчыў, толькі папрасіў некалькі дзён на роздум. Як потым высветлілася, хітры татарын наўмысна зацягваў час, бо чакаў падмацаванне. І вось на пяты дзень перамоваў з грукатам і крыкам, скрыпам нязмазаных колаў і ржаннем коней са стэпу насунулася цёмная маса вершнікаў і павозак – то прыйшла другая татарская арда. Вёў яе хан Эдыгей. Цяпер перавага ў сілах была ўжо на карысць стэпавых жыхароў.

Ханы паводзілі сябе незалежна і з выклікам, чулі сваю сілу. Эдыгей нават дазволіў сабе пакпіць з Вітаўта. Яшчэ нядаўна той патрабаваў ад Цемір-Кутлука называць яго бацькам у знак прызнання першынства Літвы. Цяпер жа Эдыгей са здзекам заявіў, што ён разумее жаданне Вітаўта называцца бацькам Цемір-Кутлука, бо той маладзейшы. Але, ў сваю чаргу, Вітаўт павінен называць бацькам яго – Эдыгея як самага старэйшага сярод іх. Вялікі князь разгневаўся і вырашыў на полі бою паказаць нехрысцю, хто ёсць хто. Іншыя князі і дарадцы раілі Вітаўту не прымаць бітву, а як найхутчэй падпісваць мірную дамову, але дарэмна. Вялікі князь прагнуў помсты і рваўся ў бойку.

Пачалася бітва. Татары ўсёй сваёй масай навaліліся на хрысціянаў, тыя моцна трымаліся, але ўрэшце былі літаральна змеценыя лавінай дзікай татарскай конніцы. Хто мог, той ратаваўся ўцёкамі. Першым пабег Тахтамыш. Сам Вітаўт у роспачы ўцякаў, днём і ноччу не злазячы з каня. Выратавалася толькі невялікая частка войска, астатнія воі злажылі галовы на чужыне ў тым нешчаслівым паходзе. На полі бою загінула каля дваццаці князёў і дзесяць слыннейшых тэўтонскіх рыцараў. Татары таксама панеслі значныя страты, памёр ад раны хан Цемір-Кутлук. Татарская лава следам за ўцекачамі дакацілася да Кіева, узяла з горада багаты выкуп і са здабычай павярнула ў стэп.

Цяжкае паражэнне на Ворскле не было катастрофай для Вялікага Княства. У паходзе ўдзельнічала толькі частка ліцвінскага войска. Але на нейкі час Вітаўту давялося адмовіцца ад амбітных знешнепалітычных планаў.

Найперш Вітаўт узяўся за рускія справы, якія патрабавалі шмат клопату. Адбыліся ваенныя сутыкненні з разанскімі і вяземскімі князямі, якія скончыліся перамогай Літвы. Многа непрыемнасцяў прынеслі Вітаўту смаляне. Яны паўсталі, забілі вялікакняскага намесніка і пасадзілі на княжэнне аднаго з мясцовых князёў. Тры паходы на Смаленск правёў Вітаўт, пакуль у 1405 г. праз здраду аднаго са смалянаў не заняў горад, на гэты раз канчаткова. У 1406 г. вялікі князь нечакана напаў на пскоўскі прыгарад Каложу, захапіў шматлікі палон і вывеў у Літву. У Гародні да нашага часу частка горада мае назву Каложа, як мяркуюць, менавіта тут Вітаўт пасяліў тых палонных.

Пасля Ворсклы вялікаму князю давялося часова змяніць свае адносіны да Польшчы. Літоўскія ўдзельныя князі, а потым і сам Вітаўт зноў выдалі граматы на вернасць польскаму каралю. У сваю чаргу, польскія паны абяцалі ва ўсім падтрымліваць ліцвінаў.

Зацятую барацьбу супраць Вітаўта вёў малодшы брат Ягайлы – князь Свідрыгайла. Ён быў вельмі неўраўнаважаным чалавекам і ў гневе станавіўся шалёным. Свідрыгайла шмат разоў то ўцякаў з Літвы, каб змагацца супраць Вітаўта, то вяртаўся назад і мірыўся з вялікім князем. Ён пабываў і ў германскага імператара, і ў маскоўскага князя, неаднойчы з'язджаў у Прусію, пакуль падчас чарговай змовы не быў схоплены і пасаджаны ў турму.

Няроўна складваліся адносіны Літвы з Тэўтонскім ордэнам. Замірэнне на востраве Салін трывала да 1401 г., потым зноў запанавала варожасць. Затым у 1404 г. у Рацяжы быў заключаны мір паміж Літвой, Польшчай і Ордэнам. Некалькі гадоў пасля гэтага Вітаўт уладкоўваў справы на ўсходзе і ў самой Літве. Але каля 1408 г. ён прыйшоў да рашэння, што пара ўсур'ёз заняцца самым небяспечным, самым страшным і непрымірымым ворагам – крыжакамі. Пачалася падрыхтоўка да Вялікай вайны.





# ВЯЛІКАЯ БІТВА

Тэўтонскі ордэн быў для Вялікага Княства Літоўскага пастаяннай і страшнай пагрозай. Нягледзячы на шматлікія замірэнні, розныя мірныя дамовы, абодва бакі разумелі іх нетрываласць і непрацяглaсць. Справа ішла аб жыццёвых інтарэсах. Рыцары нямецкага паходжання ў свой час здолелі стварыць магутную арганізацыю ў Палесціне, потым перабраліся ў Прыбалтыку і стварылі тут невялікую, але багатую і моцную дзяржаву. Галоўнай прычынай іх ваенных поспехаў была падтрымка ўсяго каталіцкага свету. Рыцары Тэўтонскага ордэна не мелі права ўступаць у шлюб, таму іх маёмасць і пасады не маглі перадавацца ў спадчыну ад бацькі да сына. Ордэн папаўняў свае шэрагі за кошт непарыўнага паступлення маладых шляхціцаў з Германіі. Рыцараў у Ордэне ніколі не было вельмі многа, у найлепшыя часы іх колькасць не перавышала 700 чалавек. Сваёй дзяржавай яны кіравалі калектыўна. Кожны рыцар займаў якую-небудзь кіруючую пасаду, а ў час вайны камандаваў атрадам. Аснову эканомікі дзяржавы стваралі сяляне, якія паходзілі з заваяваных крыжакамі тутэйшых людзей – прусаў, а таксама каланістаў з Германіі, Чэхіі, Польшчы.

Рыцары заснавалі вялікую колькасць гарадоў. Да Прусаў запрашалася таксама шляхта, якая не ўступала ў Ордэн, а несла службу за зямельны надзел. Прусы багацелі дзякуючы прадуманай і добра арганізаванай гаспадарцы. Ордэн меў свае шматлікія філіі ў Еўропе, якія таксама прыносілі значныя прыбыткі. Маючы буйныя і пастаянныя даходы, рыцары мелі магчымасць выставіць на вайну моцнае войска з наймітаў. Дзесяткі і сотні рыцараў з усіх еўрапейскіх краінаў са сваімі атрадамі ледзь не штогод збіраліся да Прусаў, каб прыняць удзел у паходах супраць язычнікаў. Калі ўлічыць яшчэ значныя ўласныя ваенныя сілы, то стане зразумелым, як невялікая ордэнская дзяржава магла нароўных змагацца з Вялікім Княствам Літоўскім, Каралеўствам Польскім і нават перамагаць іх.

Галоўнай задачай Тэўтонскага ордэна лічылася барацьба з язычнікамі да таго часу, пакуль яны не прымуць хрысціянства. Таму, каб апраўдаць свае войны з каталіцкай Польшчай і праваслаўна-каталіцкай Літвой, рыцары стараліся запэўніць увесь свет, што гэтыя краіны падтрымліваюць язычнікаў, а хрысціянства прынялі толькі для выгляду. Наступ на ліцвінскія і польскія землі праводзіўся няспынна і арганізавана. Рыцары дзе подкупам ды хітрыкамі, а найчасцей ваеннай сілай захоплівалі ўсё новыя і новыя ўладанні. Цяжкаўзброенае, закаванае ў латы войска ўпарта прабівалася ў глыб чужой тэрыторыі, забівала мужчын, брала ў палон жанчын і дзяцей. Потым будаваўся замак, у якім заставалася залога. Адсюль арганізоўвалі новыя паходы.

Крыжакі ўпарта імкнуліся злучыцца па сушы са сваёй філіяй у Інфлянтах. Для гэтага ім патрэбна было захапіць Жамойць. Пасля працяглай барацьбы крыжакі прымусілі Вітаўта падпісаць перадачу Ордэну гэтай зямлі. У Польшчы крыжакі адабралі Памор'е і некаторыя іншыя землі. Урэшце Вітаўт вырашыў, што прыйшла пара сур'ёзна заняцца Ордэнам. Ён лёгка

паразумеўся з Ягайлам, які ў свой час даў абяцанне вярнуць палякам усе захопленыя крыжакамі ўладанні. Так пачаў стварацца цесны саюз двух славянскіх дзяржаў супраць агульнага ворага. Вітаўт і Ягайла трымалі свае нарады ў сакрэце, запісаў не вялі, таму даследчыкі толькі здагадваюцца аб дэталях іх дамовы.

Зімой 1408 г. стрыечныя браты сабраліся ў Навагрудку. Відаць, якраз тады выспела рашэнне аб расправе з Ордэнам. Два мудрыя ліцвіны, меўшыя за плячамі дзесяткі гадоў ваеннага вопыту і дасведчаныя ў дзяржаўным кіраванні, задумалі небывалую справу. Яны вырашылі выправіць даўнюю памылку князя Конрада Мазавецкага, які ў 13 ст. прывёў Тэўтонскі ордэн у Прыбалтыку, і зліквідаваць ордэнскую дзяржаву ў Прусах. Для таго часу гэта была сапраўды небывалая задума. Галоўнай мэтай тагачаснай вайны лічылася спусташэнне, а ў лепшым выпадку захоп прыгранічнай вобласці варожай дзяржавы.

Вітаўт і Ягайла даўно пазбавіліся сантыментаў у адносінах між сабой. Саюз уладароў будаваўся на чыста практычнай аснове ўзаемнай выгоды і супадзенні інтарэсаў. Саюзнікі цалкам давяралі адзін другому, бо Тэўтонскі ордэн быў найстрашнейшым ворагам абедзвюх дзяржаў. Вялікі князь і кароль распрацоўвалі план вайны, абдумваючы і ўзважваючы кожную драбніцу. Рыцары таксама рыхтаваліся да вайны. І крыжакі, і ліцвіны з палякамі вербавалі жаўнераў-прафесіяналаў, праводзілі дыпламатычную падрыхтоўку. У Польшчы і Літвы былі саюзныя адносіны з чэшскім каралём Вацлавам і венгерскім Жыгімонтам, аднак Ордэн перацягнуў іх на свой бок, заплаціўшы агромністыя сумы грошай. У 1408 г. Вітаўт заключыў перамір’е са сваім зяцем – маскоўскім князем Васілём Дзмітравічам, і можна было не асцерагацца ўдару ў спіну. Крыжакі стараліся пасварыць Вітаўта з Ягайлам, а вялікі князь рабіў выгляд, што ў яго няма ніякага саюзу з польскім каралём.

У самым канцы вясны 1409 г. на Жамойці выбухнула паўстанне супраць крыжакоў. Жамойты палілі крыжацкія замкі, забівалі немцаў, якія не паспелі ўцячы. Вітаўт тайна падтрымаў гэтае паўстанне. Рыцары рыхтаваліся ісці вайной на Жамойць і Літву, яны паслалі пасольства да польскага караля, каб даведацца, ці будуць палякі падтрымліваць Вітаўта. Ягайла, у сваю чаргу, выслаў да хохмайстра пасольства з прапановай мірна вырашыць канфлікт з Жамойцю. Польскія паслы ніяк не хацелі даваць адказ на прамое пытанне, ці будзе Польшча перашкаджаць Ордэну ў барацьбе з паўстанцамі. Нарэшце хохмайстру ўдалося выведаць у кіраўніка польскага пасольства сапраўдныя намеры Ягайлы. Маўляў, калі Тэўтонскі ордэн нападзе на Літву, то польскі кароль павядзе войска на Прусію. Адказам рыцараў было аб’яўленне вайны Польскаму каралеўству. 16 жніўня ордэнскія войскі перайшлі мяжу і пачалі пустошыць польскія землі. Так пачалася Вялікая вайна 1409 – 1411 г.

Палякі былі не гатовыя да ваенных дзеянняў. За два тыдні крыжакі здабылі ўсе галоўныя замкі Добжыньскай зямлі. У Жамойці перавагу мелі жамойты і ліцвіны.





У канцы верасня ў паход рушыла галоўнае польскае войска. 6 кастрычніка яно вярнула замак Быдгашч, і на гэтым ваенныя дзеянні ў 1409 г. былі скончаныя. Польшча і Ордэн заключылі перамір'е на восем з паловай месяцаў – «да заходу сонца» 24 чэрвеня 1410 г. Спрэчку паміж суседзямі даручылі рассудзіць чэшскаму каралю. А мы ўжо ведаем, што ён быў падкуплены крыжакамі. Рашэнне Вацлава выйшла на карысць Ордэна. Палякі і ліцвіны не збіраліся яго прызнаваць. Зноў пачалася актыўная падрыхтоўка да вайны. Крыжакі спрабавалі ў чарговы раз пасварыць Вітаўта з Ягайлам, на гэты раз з дапамогай венгерскага караля. Той падчас сустрэчы з вялікім князем прапанаваў яму каралеўскую карону і саюз супраць Польшчы. Вітаўт тут жа спыніў перамовы і аб усім паведаміў Ягайле. Калі князь вяртаўся ў Літву, крыжакі спрабавалі яго перахапіць у дарозе. Вялікі маршал нечакана напаў на Ваўкавыск, захапіў і спаліў горад, але Вітаўт у гэты час быў ужо ў Слоніме.

У снежні 1409 г. вялікі князь і кароль сабраліся на нараду ў Бярэсці. Адначасова было наладжана паляванне ў Белавежскай пушчы. Мяса дзікіх звяроў засольвалі ў бочках. Усім, у тым ліку і крыжацкім шпегам, стала ясна, што рыхтуюцца харчовыя прыпасы да паходу.

Хохмайстар Ульрых фон Юнгінген збіраў і аналізаваў інфармацыю, якую дастаўляла добра арганізаваная разведка Ордэна. Крыжацкія шпегі пад выглядам купцоў, вандроўных манахаў, святароў перамяшчаліся па Літве і Польшчы, выведвалі подкупам і хітрасцю важныя звесткі і перадавалі іх у ордэнскую сталіцу Мальбарк. Па ўсім выходзіла, што ворагі збіраліся нанесці ўдары па Прусіі з розных бакоў: Літва – з усходу, Польшча – з поўдня. Адпаведна гэтаму меркаванню, крыжакі пачалі рыхтаваць свой план вайны. Галоўная задума – затрымаць наступ варожых войскаў з дапамогай шматлікіх добра ўмацаваных замкаў, прымусіць ліцвінаў і палякаў з вялікімі цяжкасцямі здабываць гэтыя замкі і такім чынам знясіліць іх. Потым перайсці ў наступ і разбіць ворага.

На самай справе высновы кіраўніцтва Ордэна аб намерах саюзнікаў былі памылковымі. Вітаўт і Ягайла збіраліся весці вайну зусім іншым чынам і толькі рабілі выгляд, што намерваюцца наступаць на Прусы з двух бакоў. Яны да апошняга трымалі сваю задуму ў сакрэце, войскі рыхтаваліся, але не ведалі, куды яны будуць накіраваныя. Сапраўдныя намеры ліцвінаў стануць вядомыя толькі ў ліпні 1410 г.

Надышло лета 1410 г. Вітаўт і Ягайла дзейнічалі адпаведна свайму плану. Яны здолелі абхітрыць крыжакоў. Спецыяльна выдзеленыя вайсковыя аддзелы праводзілі падрыхтоўку да паходу каля ордэнскай мяжы. Крыжацкія шпегі даносілі аб гэтым свайму начальству, і тое рыхтавалася да нападу з двух бакоў. Буйныя групоўкі крыжацкіх войскаў былі выдзеленыя для прыкрыцця магчымых накірункаў наступу ворагаў. Галоўная армія збіралася ў цэнтры краіны.

На самой справе, Вітаўт і Ягайла задумалі злучыць свае войскі ў адно і напасці на Прусію разам. Яны рабілі выгляд, што збіраюцца наступаць у розных кірунках, каб ордэнскае войска не перашкодзіла злучэнню. План удаўся.

Набліжалася заканчэнне пераміра'я. І днём і ноччу не спыняўся рух у крыжацкіх замках. Доўгія абозы падвозілі прыпасы, працавалі кузні – Ордэн рыхтаваўся да абароны.

І днём і ноччу па ліцвінскіх дарогах прабіраліся атрады вершнікаў і пехацінцаў – ліцвіны ішлі да месца збору. Войска збіралася каля ракі Нараў. Вялікімі і маленькімі атрадамі, групамі і паасобку з усіх канцоў неабсяжнай краіны сцякаліся воі, як ручаіны да ракі. Добра ўзброеныя, на дагледжаных конях.

Кожны ведаў сваё кап'ё і харугву[1]. Не бралі з сабой вялікага абозу – наперадзе была далёкая дарога. З гэтай жа прычыны ў войску было няшмат пяхоты і невялікая колькасць лёгкіх гармат. Збіралася войска, выстройвалася да паходу. Трапяталіся на ветры прапорцы[2], на хуткіх, як вецер, невысокіх конях насіліся татары з атрада саюзнага хана Джэлалэддзіна. Лёгкая татарская конніца была выдатна прыстасаваная для разведкі, аховы войска ў паходзе і асабліва ў пагоні за разбітым ворагам. Аднак стэпавікі гэтак жа лёгка маглі кінуцца і ў рабунак мірных паселішчаў, таму за імі патрабаваўся пільны нагляд.

[1] *Харугва – назва палка, а таксама сцяга.*

[2] *Невялікі сцяг для арыентацыі вояў у паходзе.*

Нарэшце ўсё гатова. Князь узняў руку, і адразу пранізліва зараўлі паходныя ражкі і дуды, ударылі бубны, уся разнашэрсная маса сярэднявечнага беларускага войска скранулася і рушыла, на хаду падстройваючыся, раўняючыся, набіраючы паходны тэмп. Едуць, гайдаюцца ў такт конскай хадзе баявыя літоўскія і русінскія баяры-рыцары – вопытныя воі, загартаваныя ў бясконцых войнах і паходах. З крыжакамі біліся яшчэ іх дзяды і прадзеды. Яны заўжды ў баявой гатоўнасці, іх не заспееш знянацку, яны ў агонь і пекла пойдуць за сваім князем і ў любы момант гатовыя ахвяраваць за яго жыццём. Па бакавых дарогах і далёка наперадзе войска гойсаюць татарскія і ліцвінскія дазоры: сцерагуць шлях, разведваюць пераправы, высочваюць варожых шпегаў. Хоць з крыжакамі перамір'е да 24 чэрвеня і яны яшчэ нічога не ведаюць аб гэтым паходзе, але шлях ляжыць уздоўж ордэнскай мяжы, а вораг ёсць вораг. Ужо высланыя да караля Ягайлы надзейныя ганцы, якія нават пад катаваннем не выдадуць ворагу вестку, прызначаную каралю: «Вялікі князь з войскам ідзе да Віслы!»



У Мазовію да Чэрвінска сыходзіліся польскія войскі. Ажыццяўлялася стратэгічная задума Вітаўта з Ягайлам – арміі дзвюх краінаў збіраліся ў адзін кулак, каб потым усёй сілай абрынуцца на варожую дзяржаву. Такому тарану немагчыма было супрацьстаяць. Галоўная задача саюзнікаў – зрабіць так, каб армія ордэна трапіла пад гэты таран, прыняла бой у адкрытым полі, а не адседжвалася ў замках. Для гэтага Вітаўт і Ягайла вызначылі накірунак руху прама на ордэнскую сталіцу – Мальбарк.

А што крыжакі? Яны па-ранейшаму не здагадваліся аб сапраўдных намерах ворага. Ужо калі Вітаўт рухаўся да Віслы, то атрады, пакінутыя ім у Літве, напалі на прыгранічныя ордэнскія землі. Рыцары, як і раней, чакалі ўдару з двух бакоў. Не дапамагла і выдатная ордэнская разведка. Хохмайстар не хацеў даваць веры сведцы, які на ўласныя вочы бачыў на пераправе цераз Віслу Вітаўта побач з Ягайлам.

Аб'яднаная саюзная армія дакладна выконвала план. Баявы дух войска быў высокім. Усе адчувалі, што гэта не звычайны паход, ніхто ніколі не бачыў такой масы войскаў, сабраных у адно цэлае. Воі ішлі ваяваць за святую справу, кожны меў да крыжакоў асабістыя рахункі. Здзіўленне і захапленне выклікаў пантонны мост, наладжаны для пераправы цераз мнагаводную Віслу. Войскі арганізавана перайшлі на правы бераг, затым мост разабралі на часткі і сплавілі да Плоцка, каб выкарыстаць на зваротнай дарозе.

9 ліпеня войскі саюзнікаў перайшлі мяжу з Прусіяй і накіраваліся ў глыб краіны. Кіраўніцтва Ордэна, нарэшце, зразумела план ворага. Па загаду хохмайстра ордэнская армія перакрыла дарогу на сталіцу і пачала рыхтавацца да бою. Сабраць аддзелы, якія прыкрывалі ліцвінскую мяжу і дарогу на Памор'е, ужо не было часу.

Войскі сустрэліся ў сярэдзіне ліпеня паміж вёскамі Грунвальд і Таненберг. Адбылася знакамітая бітва, вядомая ў гісторыі як Грунвальдская (яшчэ яе называюць Таненбергская, або Дубровенская – па бліжэйшым горадзе), у якой вырашаліся лёсы Еўропы. У ёй удзельнічала каля 60 тысяч чалавек – агромністая па тых часах лічба.

Раніцай 15 ліпеня войскі выстраіліся тварам у твар на пакатых пагорках між Грунвальдам і Таненбергам. Аднак бітва не пачыналася. Развяваліся харугвы і плюмажы[3] на шлемах, лесам стаялі дзіды, сонца бліскала на сталёвых даспехах і зброі. Скакалі ў розныя бакі ганцы, войскі не рухаліся. Крыжакі не хацелі наступаць першымі. Яны прыйшлі сюды раней за ліцвінаў з палякамі і паспелі падрыхтаваць пазіцыю: выкапалі і замаскіравалі ямы-пасткі, за імі паставілі артылерыю і арбалетчыкаў. Чакалі, каб ворагі пайшлі ў наступ і натрапілі на пасткі ды гарматны абстрэл.

*[3] Плюмаж – пучок пёраў на макаўцы шлема.*

Саюзнікі не пачыналі бітву з-за польскага караля. Вітаўт даўно быў гатовы, кіпеў энергіяй, рваўся ў бой, а Ягайла бавіў час у малітве і цырымоніях. Нарэшце, блізка да поўдня, немцы прыслалі два мечы для вялікага князя і караля з заклікам да бою. Па камандзе Вітаўта ліцвінскае войска з поклічам: «Вільня!» рынулася ў атаку. Скрануўся з месца і левы польскі фланг, на хаду спяваючы «Багародзіцу».

Надзеі крыжакоў на пасткі і артылерыю не апраўдаліся. Наперадзе была лёгкая манеўровая конніца, якая не панесла значных стратаў. Артылерысты паспелі стрэліць толькі адзін раз. Сутыкненне было жахлівым. Ад лязгату мечаў, сякераў, пошчакаў арбалетаў, трэску паламаных дзідаў, іржання коней, крыкаў, енку, стогну стаяў страшэнны грукат, «як быццам абрушваўся нейкі велізарны будынак». Гул бітвы чулі людзі за некалькі кіламетраў ад месца падзеі.

Зацятая бойка цягнулася каля сямі гадзін. Шаля вагаў хісталася то ў адзін, то ў другі бок. Фактычна ішлі дзьве бойкі – на правым, ліцвінскім, і левым, польскім, флангах. Ліцвіны дзейнічалі больш вынаходліва, яны падманулі крыжакоў, прыкінуліся, быццам уцякаюць, рыцары кінуліся следам, расстроіўшы свае шэрагі. Тады іх акружылі і ўсіх пабілі. Урэшце пад вечар стала зразумела, што справы Ордэна кепскія. Ліцвіны і палякі, больш шматлікія, пачалі адольваць. Крыжакоў акружылі і дабівалі, пакуль не здаліся тыя нямногія, якія засталіся ў жывых. Загінулі амаль усе рыцары, у тым ліку хохмайстар і ўсе вышэйшыя чыны. Крыжакі спрабавалі бараніцца ва ўмацаваным абозе, але былі выбітыя магутным націскам. Толькі нямногія здолелі выратавацца ўцёкамі. Цэлую ноч працягвалася пагоня за ўцекачамі. Назаўтра, пахаваўшы забітых, падлічыўшы страты і набыткі, войска пачало рыхтавацца да руху на Мальбарк.



Здавалася, што з ордэнскай дзяржавай у Прусах было пакончана. Армія саюзнікаў без бою займала гарады і магутныя замкі. Жыхары многіх з іх самі абяззбройвалі крыжацкія залогі і перадавалі пераможцам. Заставалася толькі заняць Мальбарк і падзяліць між сабой здабытыя землі.

Аднак ліцвінаў і палякаў апярэдзіў комтур Генрых фон Плаўэн, які з пачатку вайны прыкрываў шлях на Памор'е і ў Грунвальдскай бітве не ўдзельнічаў. Атрымаўшы вестку аб жахлівым разгроме ордэнскага войска, ён, не губляючы часу, павёў свой атрад да Мальбарка і паспеў арганізаваць абарону сталіцы. Мальбарк быў непрыступнай крэпасцю і, маючы добрыя запасы харчавання, зброі і рыштунку, мог вытрымаць любую аблогу. Амаль два месяцы ліцвіны і палякі трымалі ў аблозе ордэнскую сталіцу, але ўзяць яе не маглі. Нарэшце яны рушылі дамоў.

Вайна працягвалася далей і ўрэшце скончылася Торуньскім мірам у пачатку 1411 г. Ордэнская дзяржава ацалела, ёй нават удалося вярнуць амаль усе землі, страчаныя пасля Грунвальдскай бітвы. Але хрыбет драпежніку быў зламаны. Тэўтонскі ордэн ужо не змог узняцца да сваёй ранейшай магутнасці. Грунвальдская перамога назаўжды пакончыла з крыжацкай агрэсіяй супраць Літвы і Польшчы. І ў тым найвялікшае значэнне Грунвальда для нашага народа. Мы ніколі не павінны забываць аб тым, што гэтая слаўная старонка ўпісана ў беларускую гісторыю вялікім князем Вітаўтам.



# ШЛЯХ ДА ЕЎРОПЫ

Апошнія дваццаць гадоў княжання Вітаўта вызначаліся пачаткам гаспадарчага ўздыму краіны пасля заняпаду ў 14 ст. Мір і спакой усталяваліся на заходніх межах княства. Пасля разгрому пад Грунвальдам рыцары Тэўтонскага ордэна і думаць не маглі аб якім-небудзь наступленні на ліцвінскую тэрыторыю. Крывавыя крыжацкія набегі скончыліся назаўсёды. Людзі вярталіся на свае месцы, адбудоўваліся. Над спустошанымі вайной абшарамі зноў падымаліся мірныя дымкі сялянскіх хатаў, зноў зелянелі жытнёвыя палеткі. На поўначы, усходзе і поўдні ніхто не адважваўся ўступаць у канфлікт з магутнаю Літвою.

Вялікі ўплыў Вітаўт меў на багатыя гарады-рэспублікі Ноўгарад і Пскоў. Маскоўскім князем на той час быў унук Вітаўта Васіль Васільевіч, які раіўся з дзедам па важных справах. Вялікі князь актыўна ўдзельнічаў у татарскіх праблемах, нават прызначаў ханаў. Здараліся таксама і набегі на яго землі варожых татарскіх атрадаў.

У Вітаўта было ўсё, што мог пажадаць чалавек у 15 ст. Па адным яго слове ўзводзіліся і бурыліся замкі, выраслі новыя вёскі і гарады. Калі князь куды-небудзь выязджаў, то па ўсёй дарозе яго чакалі свежыя коні. Гэты на дзіва вынослівы чалавек за кароткі час пераадольваў вялізныя адлегласці. Князь мог дазволіць сабе самую дарагую раскошу ці заморскае дзіва. Жонка Вітаўта, вялікая княгіня Ганна, аднойчы на піры ў Прусах выйшла ў такім шыкоўным і дарагім строі, што бывалыя еўрапейскія госці былі літаральна ашаломленыя і занатавалі такое здарэнне ў сваіх дзённіках.

Здавалася б, жыві сабе, смачна еш, мякка спі і кіруй краінай. Але Вітаўта такое салодкае жыццё не прываблівала. Ён быў папраўдзе дзяржаўным чалавекам, рупіўся аб сваёй краіне. Лёс Літвы стаў яго лёсам, яе інтарэсы – кроўнымі справамі князя. Вітаўт нястомна працаваў. Летапісец паведамляе, што ён нават у дарозе займаўся справамі дзяржавы, прымаў і выслухоўваў наведнікаў, вырашаў спрэчкі і судовыя справы. Ён быў справядлівым суддзёй і за адно гэта карыстаўся вялікай павагай. Калі князь стамляўся, то гуляў у шахматы, або выязджаў на паляванне.

Перамога пад Грунвальдам над Тэўтонскім ордэнам падняла міжнародны аўтарытэт Літвы і яе гаспадара. Доўгі час гэтая краіна ўяўлялася еўрапейцам далёкай ускраінай, заселенай дзікунамі. Вітаўт здолеў давесці адваротнае. Вялікае Княства Літоўскае трывала ўвайшло ў ганаровае кола еўрапейскіх дзяржаваў, паступова яно станавілася ўплывовым фактарам еўрапейскай палітыкі. За дапамогай да Літвы звярталіся самыя розныя краіны. Венецыянская рэспубліка і каралеўства Чэхія шукалі ў Вітаўта падтрымкі супраць германскага імператара. Справа зайшла так далёка, што вялікаму князю літоўскаму была прапанавана чэшская карона, і ён даў згоду яе прыняць.

У Чэхіі ў першыя дзесяцігоддзі 15 ст. разгарнуўся магутны нацыянальна-вызваленчы рух супраць немцаў і каталіцкай царквы. Яго ўдзельнікі называлі сябе гусітамі, гэта значыць, паслядоўнікамі чалавека, які меў прозвішча Гус. Ян Гус – рэктар Пражскага універсітэта палымяна заклікаў да справядлівасці, абвінавачваў каталіцкую царкву за імкненне да багацця і маральную распусту. Гус канфліктаваў з нямецкімі прафесарамі, якія выступалі супраць яго рэфарматарскіх ідэй.

6 ліпеня 1415 г. па прысуду вышэйшага святарства Гуса спалілі на вогнішчы. Гвалтоўная смерць Гуса выклікала абурэнне ва ўсёй Чэхіі. Яго паслядоўнікі захапілі ўладу ў краіне і паспяхова ваявалі з германскім імператарам, які спрабаваў задушыць рух і авалодаць Чэхіяй. Гусіты звярнуліся за дапамогай да Літвы і прапанавалі Вітаўту стаць іхнім каралём. Вітаўт прыняў прапанову і накіраваў у Чэхію свайго намесніка князя Жыгімонта Карыбутавіча з пяцітысячным войскам. Некалькі гадоў ліцвінскі князь кіраваў каралеўствам, пакуль не пацярпеў паражэнне і быў змушаны вярнуцца.


1350 - 1430
ВІТАЎТ

У тыя часы Вітаўт ужо быў чалавекам сталага веку, меў узрост больш за 70 гадоў. Ён умела кіраваў краінай, клапаціўся аб дзяржаўнай гаспадарцы, падтрымліваў мір і спакой. Сяляне працавалі, здабывалі хлеб, баяры і князі ваявалі – баранілі дзяржаву, святары дбалі аб выратаванні душаў. Над усімі стаяў вялікі князь, ён увасабляў сабой дзяржаву, і яго называлі гаспадаром.

Вітаўт шчодрай рукой раздаваў узнагароды за дзяржаўную службу і найперш баярам-шляхце, якая падтрымала яго ў барацьбе за ўладу, бараніла краіну ў бясконцых войнах і паходах. У 1413 г. Гарадзельскім прывілеем князь надаў асаблівыя правы і вольнасці найбольш слынным баярскім родам каталіцкага веравызнання. Не забываў гаспадар і сваіх праваслаўных падданых, дараваў землі праваслаўнай царкве і баярам, якія спавядалі праваслаўную веру.

Спакойнымі сталі адносіны князя з польскім каралём і стрыечным братам – Ягайлам. Яны часта сустракаліся, абмяркоўвалі дзяржаўныя справы, успаміналі мінулыя гады.

У 1418 г. памерла жонка Вітаўта, вялікая княгіня Ганна, з якой ён прайшоў поруч лепшыя гады жыцця. Князь моцна гараваў, але праз некаторы час ажаніўся другі раз з княгіняй Уллянай Гальшанскай.

Дзяржаўная энергія Вітаўта з гадамі не слабела. Ён па-ранейшаму ўпэўнена кіраваў гаспадарствам, прымаў адказныя рашэнні, вёў актыўную дыпламатычную перапіску. Імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі звяртаўся да яго з вялікай павагай, рымскі папа слаў князю сваё благаславенне. Аслаблены Тэўтонскі ордэн з усіх сілаў стараўся падтрымліваць мір з Літвой і адначасова пасварыць яе з Польшчай. Германскі імператар Жыгімонт не аднойчы прапаноўваў Вітаўту зрабіць вялікае княства каралеўствам. Нарэшце князь вырашыў, што прыйшоў час, і даў згоду на каранацыю. Яна павінна была адбыцца ў 1430 г. у Вільні. Шматлікія госці, уладары з розных краінаў з'ехаліся да ліцвінскай сталіцы, каб прысутнічаць на гэтай падзеі. Папа рымскі ўрачыста асвяціў ліцвінскую карону, падрыхтаваную германскім імператарам. Спецыяльнае пасольства павезла яе ў Літву. Аднак па дарозе абоз быў затрыманы адным з польскіх паноў. Госці Вітаўта пасля доўгага чакання пачалі патроху раз'язджацца з Вільні.

Вялікі князь таксама не дачакаўся сваёй кароны. У 1430 г. па дарозе з Вільні да Трокаў 80-гадовы Вітаўт упаў з каня, быў перавезены ў Трокі, дзе праз некалькі дзён памёр. Уся краіна аплаквала яго смерць. Польскі гісторык Длугаш пісаў, што гэты чалавек здаваўся годным жалю і слёз не толькі свайму, але і іншым народам.

Так закончылася жыццё вялікага князя Вітаўта. Дзякуючы свайму дзяржаўнаму розуму, працаздольнасці і таленавітасці Вітаўт узвысіў Вялікае Княства Літоўскае, зрабіў яго славутай еўрапейскай дзяржавай. Ён шмат паспеў папрацаваць для радзімы. Ён пакінуў Літву ў росквіце славы і велічы, мір і спакой запанавалі на яе межах. Нашыя продкі атрымалі магчымасць бесперашкодна ладзіць сваё жыццё, будаваць гарады і мястэчкі, ствараць дзівосныя творы мастацтва, унікальную беларускую культуру.

За гэта мы шануем памяць нашага слаўнага продка – вялікага князя Вітаўта.





# АСНОЎНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ЖЫЦЦІ ВІТАЎТА

*1350 г.* – у Троках (?) у сям'і Кейстута нарадзіўся хлопчык Вітаўт.

*1363, 1370, 1372* – першыя ваенныя паходы Вітаўта пад началам бацькі і дзядзькі – вялікага князя Альгерда. 1377г. – першы самастойны паход супраць Тэўтонскага ордэна.

*1377 г.* – памёр вялікі князь Альгерд.

*1380 г.* – патаемная змова Ягайлы з крыжакамі.

*1381 г.* – Кейстут заняў Вільню і арыштаваў Ягайлу.

*1382 г.* – Ягайла захапіў у палон Кейстута і Вітаўта. Кейстут задушаны ў Крэўскім замку, Вітаўт уцёк з няволі ў Прусію.

*1384 г.* – Вітаўт замірыўся з Ягайлам і вярнуўся ў Літву.

*1385 г.* – Крэўская унія Літвы і Польшчы.

*1390 г.* – Вітаўт зноў адышоў у Прусію. Адзіная дачка Вітаўта Соф'я ўзяла шлюб з вялікім князем маскоўскім Васілём Дзмітравічам.

*1392 г.* – новае замірэнне Вітаўта з Ягайлам, Востраўскае пагадненне, Вітаўт стаў вялікім князем.

*1395 г.* – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Смаленскага княства.

*1398 г.* – Салінскі мір з Тэўтонскім ордэнам.

*1399 г.* – паражэнне ад татараў на рацэ Ворскле.

*1409–1411 г.* – Вялікая вайна з Тэўтонскім ордэнам.

*15 ліпеня 1410 г.* – Грунвальдская (Таненбергская, Дубровенская) бітва.

*1413 г.* – Гарадзельскі прывілей баярам-каталікам.

*1418 г.* – памерла вялікая княгіня Ганна.

*1422 г.* – Вітаўт прыняў прапанову чэхаў стаць іхнім каралём.

*1430 г.* – падрыхтоўка да каранацыі, смерць вялікага князя.

# Майстар – наш продак

**НАША ГАВОРКА ПРА ЗВЫЧАЙНЫЯ, НА ПЕРШЫ ПОГЛЯД, РЭЧЫ. НА САМАЙ СПРАВЕ, ШТО МОЖА БЫЦЬ НЕЗВЫЧАЙНАГА Ў ГЛІНЯНЫХ ГАРШКАХ, МІСКАХ, ТАЛЕРКАХ, ПЯЧНОЙ КАФЛІ АБО ЖАЛЕЗНЫХ ПАДКОЎКАХ НА БОТЫ?**

Але ёсць адна акалічнасць, праз якую названыя рэчы аказваюцца не такімі звыклымі, як здаецца. Справа ў тым, што зроблены гэтыя гаршкі, міскі, падкоўкі 400–500 гадоў назад. Калі параўноўваць, напрыклад, посуд сучасны і старажытны, то адразу відаць, што ён адрозніваецца і формай, і аздабленнем, і матэрыялам, з якога зроблены. А старажытная кафля настолькі непадобная на сучасную, што распазнаць яе можа толькі спецыяліст. Часта такія простыя рэчы – адзінае, што засталося ад старажытнага паселішча. Праз іх вывучэнне навукоўцы здабываюць разнастайную гістарычную інфармацыю. Тут звесткі пра развіццё рамяства, гандлю, пра эканамічныя адносіны ў старажытным грамадстве, пра духоўную культуру нашых продкаў і г. д.

Наша кніга раскажа пра тое, як старажытныя рэчы здабываюцца, як яны выраблялiся, што могуць паведаміць аб далёкім мінулым. Гаворка пойдзе галоўным чынам пра рэчы 14 – 17 ст. Гэта вельмі цікавы час, бо якраз тады, у 14–17 ст., адбывалася фармаванне беларускага народа.







# Скарбніца старажытных рэчаў

Абсалютная большасць археалагічнай інфармацыі здабываецца праз вывучэнне культурнага слоя. Вобразна кажучы, тут закапаны хлеб археолага. А ўвогуле, што гэта такое культурны слой? У чым яго каштоўнасць? Культурны слой – прынятая ў археалогіі назва пласта зямлі на месцы ўсіх чалавечых пасяленняў, які ўтрымлівае сляды ці рэшткі дзейнасці чалавека: старажытныя збудаванні, рэчы, будаўнічае і гаспадарчае смецце, попел з печаў і вогнішчаў і г. д.

Нічога не праходзіць бясследна. Людзі і падзеі далёкага мінулага, аб якіх мы не маем пісьмовых звестак, не згінулі без слядоў. Толькі сляды гэтыя трэба знайсці. Магчымасць пошукаў (часта адзіную) нам дае культурны слой. Менавіта ў ім часткова захаваўся важны прадукт дзейнасці даўніх людзей, які немагчыма вывучыць ніякімі іншымі сродкамі, акрамя археалагічных. Гэта матэрыяльная культура. Да яе належыць усё, што створана чалавекам і мае матэрыяльнае ўвасабленне, ці, калі казаць прасцей, усё, што зроблена чалавекам і што можна памацаць рукамі.

Вядома, толькі з дапамогай археалогіі нельга вывучыць усю матэрыяльную культуру, бо не ўсе рэчы трапляюць у зямлю. А тыя, што трапілі, не ўсе захаваліся. У сваю чаргу тыя, што захаваліся, не ўсе адкапаныя археолагамі. Рэчы ж, знойдзеныя археолагамі, не ўсе дастаткова поўна вывучаны.

Няцяжка здагадацца, што культурны слой цікавіць нас толькі таму, што ў ім захоўваюцца старажытныя рэчы. Капаць «пустыя», без знаходак, культурныя наслаенні – часцей за ўсё марная трата часу. Але, з другога боку, для археолага вельмі важна тое, каб рэч была знойдзена ў культурным слоі ў працэсе археалагічных раскопак, а не прынесена невядома адкуль. Чаму гэта важна? – спытае чытач. Гліняны збан – ёсць гліняны збан, і якая розніца, выкапаны ён рыдлёўкай археолага ці каўшом экскаватара. Розніца ёсць, мы растлумачым яе крыху пазней, а пакуль просім чытача паверыць нам на слова.

На месцы існавання любога паселішча зямля паступова «падрастае» за кошт адкладання культурнага слоя. Хуткасць яго нарастання залежыць ад працоўнай актыўнасці, колькасці жыхароў на паселішчы, ад роду іх заняткаў, ад кліматычных умоў. Накапленне зямлі праходзіць непрыкметна, але вынікі яго бываюць даволі значнымі. Мяркуйце самі, культурны слой на Старым замку ў Гародні дасягае таўшчыні больш за 8 м, на менскім Замчышчы – 8, у Віцебску 9–11, у Бярэсці – 7, у Слоніме – 5 м. Такі ж малюнак і ў іншых старажытных беларускіх гарадах. Можна падлічыць, з якой прыблізна хуткасцю ідзе гэты працэс. Так, у Гародні пасяленне на Старым замку з'явілася ў 10 ст. Атрымліваецца, што сярэдняя хуткасць нарастання культурнага слоя каля 0,8 см у год. Гэта, вядома, грубая прыкідка, таму што накапленне зямлі праходзіць вельмі нераўнамерна. У межах аднаго паселішча таўшчыня наслаенняў можа значна вагацца. У нашых мястэчках, напрыклад, найбольшай магутнасці яны дасягаюць у цэнтры ля плошчы (тут самая шчыльная забудова).

Як жа ўтвараецца культурны слой? Як адбываецца гэты няспынны непрыкметны рух, хуткасць якога вымяраецца сантыметрамі ў стагоддзе, а вынікам становяцца шматмятровыя пласты зямлі?

Уявім сабе такі малюнак. Шмат гадоў таму назад, дапусцім, тысячу, група людзей выбрала сабе месца для жылля. Не будзем гадаць, што прымусіла іх пакінуць ранейшае жытло. Вось яно – абранае месца. Гэта пагорак з плоскай вяршыняй на высокім абрывістым беразе вялікай ракі каля ўпадзення ў яе маленькай. І ў малой рэчкі таксама стромкія берагі. Толькі вузкай перамычкай можна трапіць на гэты пагорак-мыс, які густа парос вялізнымі соснамі. Амаль ідэальнае месца для жылля ў тыя небяспечныя часы, калі толькі ўмацаванае паселішча ў цяжкадаступным месцы магло гарантаваць адносную бяспеку жыхарам. І вось ссечаны хвоі, расчышчана пляцоўка, пабудавана жыллё. Вакол будынкаў жаўцее на

сонцы тоўсты слой сасновых трэсак. Гэта і ёсць першае культурнае наслаенне. Паступова трэскі цямнеюць, пакрываюцца зямлёй, якую прыносяць вятры і людзі на падэшвах. За некалькі дзесяткаў гадоў на паселішчы нарастае невялікі слой цёмнай зямлі, у якім дзе-нідзе знаходзяцца згубленыя або кінутыя рэчы – будучыя археалагічныя знаходкі.

Але вось мірнае жыццё перарываецца нападам ворагаў. Пасёлак спалены, і на месцы будынкаў засталіся толькі чорныя плямы пажарышчаў. Праз нейкі час сюды зноў прыйшлі людзі, выраўнялі месца і пабудавалі новыя дамы. Пачаўся новы этап утварэння культурнага слоя. У гэты раз ссечаныя з тоўстых абчасаных па баках бярвенняў дамы стаялі больш часу і іх ніжнія вянцы аказаліся закрытымі зямлёй. Калі гэтыя будынкі адслужылі свой час і іх разабралі, то не сталі выкопваць засыпаныя бярвенні, а проста на старых месцах паставілі новыя дамы. У некаторых нашых гарадах нарастанне слоя ішло з такой хуткасцю, што за час існавання будынкаў (40–50 гадоў) пад зямлёй заставаліся 5–6, а то і болей вянцоў! Гэта 1–1,2 м. Слой закрываў нават частку дзвярнога праёма. Неверагодна, скажаце вы. А як жа тады адчыняліся дзверы? Цяжка сказаць, але што такое магчыма, кожны ахвотны можа пераканацца на ўласныя вочы, калі пабывае ў Бярэсці ў музеі «Старажытнае Бярэсце». Тут у павільёне экспануецца ўчастак старажытнага горада, у культурным слоі якога археолагам Пятром Лысенкам знойдзены рэшткі будынкаў у 10–12 вянцоў! Каб можна было ўваходзіць у такую пабудову, патрэбна расчысціць прастору перад дзвярыма.

Уважлівы назіральнік даволі лёгка выдзеліць культурныя наслаенні на фоне карэнных слаёў зямной паверхні. Культурны слой адрозніваецца ад жоўтых, чырвоных, белых пластоў пяску, гліны, суглінку сваім шэрым, блізкім да чорнага колерам. У нашых гарадах і мястэчках пераважаюць светла-шэрыя і цёмна-шэрыя наслаенні. Спрактыкаванаму воку няцяжка заўважыць у іх праслойкі вуголля (сляды вогнішча ці пажару). На цёмным фоне прыкметна выдзяляюцца жоўтыя і чырвоныя праслойкі пяску, гліны, цэглы, а яшчэ лепш – белай вапны. Такія пласты пяску або гліны ў цёмных наслаеннях таксама лічацца культурным слоем, бо яны занесены сюды чалавекам. Напрыклад, старажытныя валы, якія большай часткай складаюцца з пяску і гліны, той жа культурны слой, бо гэтыя абарончыя насыпы зроблены рукамі чалавека. Карэнныя пласты зямлі, на якіх залягаюць культурныя наслаенні, археолагі называюць мацерыком.

На розных помніках бывае розны па характару культурны слой. Напрыклад, у мураваных замках ён насычаны шматлікімі праслойкамі будаўнічых матэрыялаў, якія засталіся ад будаўніцтва, рамонтаў і перабудоў. У гарадах і мястэчках культурны слой у асноўным светла і цёмна-шэры. Чаргаванне разнастайных слаёў і праслоек у культурным пласце называецца стратыграфіяй. Гэтак жа завецца і вывучэнне гэтых праслоек. Асноўная задача стратыграфіі – высвятленне часу і абставін утварэння кожнай праслойкі.

Вось мы стаім на дне раскопу каля адной з яго сценак. Сценка гэтая – вертыкальны разрэз культурнага слоя ад дзённай паверхні да мацерыка. Дзённая паверхня на мове археолагаў – сучасны ўзровень паверхні зямлі. Няхай гэта будзе адзін з раскопаў на тэрыторыі Мірскага замка. Правёўшы позіркам знізу ўверх ад чырвонай глінянай падсыпкі ўнізе да зялёнай траўкі наверсе, мы ў адно імгненне прасачылі працэс, які адбываўся тут на працягу ажно 500 гадоў. Са старажытных дакументаў нам вядома, што будаўніцтва замка пачалося ў канцы 15 – пачатку 16 ст. Папярэдне, каб атрымаць роўную будаўнічую пляцоўку, сюды была навезена гліна з пяском, а потым выраўненая паверхня будучага замкавага двара. Вось гэтая падсыпка выдзяляецца ў ніжняй частцы разрэзу. Але пад ёй відны цёмны культурны слой. Адкуль ён тут? Пасля таго як гэты слой быў выяўлены і даследаваны, высветлілася, што да будаўніцтва замка на гэтым месцы знаходзілася паселішча. Па рэчах, якія трапіліся у слоі (гаршковая кафля, гаршкі, шпоры), стала зразумелым, што яно існавала ў другой палове 15 ст. і загінула, відавочна,у часе пажару. Аб гэтым сведчыць праслойка вугалю (як вызначаецца датаванне рэчаў, гаворка пойдзе далей).

Вось прама на слоі падсыпкі залягаюць вапна, кавалкі цэглы і дахоўкі. Гэта свой адбітак пакінуў першы этап будаўніцтва замка. Менавіта такую цэглу і такую дахоўку выкарыстоўвалі нашы дойліды ў канцы 15 – пачатку 16 ст. Па характару наслаенняў, якія



залягаюць вышэй, можна меркаваць, што жыццё ў замка было неспакойнае і багатае на падзеі. Светла-шэры слой насычаны рэшткамі будаўнічых матэрыялаў, якія накапіліся пад час шматлікіх дабудоваў, перабудоваў і рамонтаў. Перад намі своеасаблівы летапіс. Каб яго прачытаць, спатрэбілася настойлівая шматдзённая праца цэлага калектыву даследчыкаў. У гэтым амаль аднародным, на першы погляд, слоі ўдалося выдзеліць праслойку рамонту замкавага палаца канца 16 – пачатку 17 ст. , будаўніцтва 2-й паловы 18 ст. і інш. Зрабіць гэта дапамаглі знаходкі цэглы, дахоўкі, кафлі.

А вось для параўнання раскоп на адлегласці 500 м ад замка, закладзены на тэрыторыі гарадскога пасёлка Мір. Сценка раскопу па колеру значна адрозніваецца ад замкавай. Сярэднявечны культурны слой тут чорнага, цёмна-шэрага і светла-шэрага колеру. Стракатыя праслойкі гліны, вапны, пяску сустракаюцца даволі рэдка, многа іх толькі ў самых верхніх слаях 19 – пачатку 20 ст. У гэты час вялося найбольш актыўнае мураванае будаўніцтва ў пасёлку.

Вывучэнне культурнага слоя шляхам раскопак мае адну немалаважную асаблівасць – яго нельга паўтарыць, як, напрыклад, фізічны ці хімічны дослед. Любы даследаваны ўчастак культурных наслаенняў знішчаны назаўсёды. Таму методыка археалагічных раскопак накіравана на тое, каб у ходзе даследаванняў атрымаць як мага больш інфармацыі. Працэс раскопак адлюстроўваецца ў спецыяльнай дакументацыі. Яна павінна складацца так, каб праз любы час спецыяліст, які не прымаў удзелу ў раскопках, мог па дакументацыі аднавіць іх ход з найбольшай яснасцю. У такім выпадку заўсёды можна праверыць правільнасць вывадаў, зробленых аўтарам даследаванняў.



Археалагічны раскоп – гэта не проста вялікая яма прамавугольнай або квадратнай формы. Ён разбіваецца на квадраты памерам, звычайна, 2х2 м, кожны з якіх мае свой нумар. Гэта робіцца, каб дакладней азначыць месца кожнай знаходкі. Напрыклад, у квадраце № 3 знайшлі кавалак глінянай талеркі. Варта напісаць на ім «кв. 3» – і любому стане зразумелым, у якім месцы раскопу гэта адбылося. Каб яшчэ больш удакладніць месца знаходкі, ад двух бакоў квадрата па восі каардынатаў вымяраецца адлегласць да адкапанай рэчы.

Чым глыбей залягае знаходка, тым яна старажытнейшая. Раскопкі вядуцца па пластах таўшчынёй звычайна 20 см. Здымаецца 20 см, затым наступныя 20 і так да мацерыка. Кожны пласт атрымлівае нумар зверху ўніз.

На кожнай знаходцы (ці на бірачцы да яе), акрамя нумара квадрата і пласта, скарочана пішацца назва помніка, год раскопак і нумар раскопу. Увесь надпіс можа выглядаць, напрыклад, так: **Аш. – 85 Р2 пл. – 7 кв. – 3**

Ён расшыфроўваецца проста: Ашмяны, 1985 год, раскоп № 2, пласт №7, квадрат № 3. Гэты надпіс дае магчымасць навуковай апрацоўкі знаходак праз любы час пасля правядзення раскопак. Можа быць і так, што на знаходцы ставіцца толькі нумар, а ўсё астатняе пад гэтым нумарам запісана ў спецыяльнай кнізе – калекцыйным вопісе. Рэчы без такога «пашпарта» напалову губляюць навуковую каштоўнасць.

Археалагічны шурф адрозніваецца ад раскопу толькі меншымі памерамі, капаецца гэтак жа, як раскоп.

Ход раскопак пастаянна фатаграфуецца і замалёўваецца. Акрамя таго, вядзецца дзённік, ужо ўпамянуты калекцыйны вопіс, вопіс індывідуальных знаходак. У дзённіку апісваецца працэс раскопак дзень за днём, пласт за пластом. У апісанні звесткі аб характары культурнага слоя, знаходках, іх датаванні і г. д. У калекцыйны вопіс заносяцца ўсе знаходкі, а ў вопіс індывідуальных знаходак – найбольш цікавыя рэчы.

Методыка раскопак вельмі далікатная рэч, на розных помніках яна мае сваю спецыфіку. Уласныя асаблівасці маюць раскопкі беларускіх гарадоў і мястэчак. Складанасць іх заключаецца, галоўным чынам, у шчыльнай сучаснай забудове. Старажытныя цэнтры гарадоў і мястэчак і ў наш час, за рэдкім выключэннем, адыгрываюць значную ролю ў жыцці пасяленняў. Тут размешчаны жылыя дамы, дзяржаўныя ўстановы, грамадскія

пабудовы. Праведзены тэлефонныя кабелі, водаправод, каналізацыя. У такіх выпадках бывае цяжка знайсці месца для раскопак.

Перад даследчыкамі стаяць важныя задачы вывучэння матэрыяльнай культуры жыхароў, высвятлення часу засялення розных раёнаў паселішча, пошук помнікаў архітэктуры, якія не захаваліся на паверхні зямлі, і інш. Да таго моманту, калі рыдлёўка археолага ўваткнецца ў культурны слой, неабходна правесці вялікую і карпатлівую падрыхтоўчую працу ў архівах і бібліятэках. Асноўная задача падрыхтоўкі – вызначэнне месцаў, найбольш прыдатных для раскопак. Гарады і буйныя мястэчкі ў канцы сярэднявечча займалі значную плошчу, часам у 2–3 дзесяткі гектараў. Не ўсе ўчасткі тэрыторыі паселішчаў аднолькава прыгодныя для раскопак. Напрыклад, калі пачнеш капаць на старажытным агародзе, то толькі марна патраціш час, бо слой там пусты. Праз вывучэнне старых планаў, гравюр, дакументаў высвятляецца размяшчэнне старажытных вуліц і пабудоў, што неабходна археолагам для арганізацыі навуковых даследаванняў.



Адна з асноўных і самых складаных задач археалагічнай навукі – датаванне знойдзеных рэчаў – вызначэнне часу іх вырабу. Рашэнне гэтай задачы дасягаецца з дапамогай сістэмы супастаўленняў, назіранняў, з выкарыстаннем метадаў гістарычных, а таксама прыродазнаўчых навук. Ужо тое, што мы ведаем глыбіню знаходкі, мае пэўнае значэнне. Рэчы, якія залягаюць глыбей, больш старажытныя, чым тыя, што выяўлены вышэй. Праўда, ёсць верагоднасць перакопу, калі ў выніку якіх-небудзь ранейшых земляных работ, рэчы пераблытваюцца, перамешваюцца. Археолаг многае гатовы аддаць, абы толькі працаваць з непатрывожаным культурным слоем без ямаў і перакопаў. Часам ёсць даволі надзейныя сродкі вызначэння цэласнасці слоя. Напрыклад, сярод цёмных наслаенняў залягае паласа жоўтай гліны ці пяску. Калі гэтая паласа непарушаная, то непарушаны і слой пад ёй.

Ужываюцца такія складаныя метады датавання знаходак, як, напрыклад, дэндрахраналагічны. Яго сутнасць у тым, што па гадавых кольцах на дрэве можна дакладна сказаць, у якім годзе гэта дрэва спілавалі. І калі мы раскапалі драўляны зруб, зроблены з бярвенняў, спілаваных, напрыклад, у 1504 г. , то можна сцвярджаць, што рэчы, знойдзеныя ў зрубе і побач з ім у тым жа слоі, датуюцца пачаткам 16 ст. Калі такія ж рэчы знойдзены ў іншым месцы, мы ўжо ведаем, як іх датаваць. Часам лёс падносіць археолагам падарункі. Чаго варта, напрыклад, знаходка шматколернай кафлі ў Мірскім замку, на якой стаіць дата вырабу: 1583. Бывае, на кафлінах сустракаецца цэлы надпіс на лацінскай мове: «Anno domini 1627», які перакладаецца як «Лета гасподня 1627».

Каб авалодаць методыкай археалагічнай навукі, трэба не толькі праслухаць курс лекцый ва універсітэце, прачытаць шмат кніг, але і неаднаразова прымаць удзел у экспедыцыях. На жаль, у наш час сустракаюцца выпадкі, калі непадрыхтаваныя людзі, у тым ліку школьнікі, часам нават на чале з настаўнікам, самавольна праводзяць раскопкі археалагічных помнікаў. Нічога, акрамя шкоды, такія «даследаванні» не прыносяць. Не апраўдвае падобныя дзеянні імкненне вывучаць гісторыю свайго краю ці набыць экспанаты для школьнага музея. Такія раскопкі з’яўляюцца злачынствам і караюцца законам.

Разнастайныя земляныя работы ў гарадах і мястэчках, такія, як капанне катлаванаў пад падмуркі дамоў, траншэй для водаправода, цеплатрасы, каналізацыі, разбураюць і перамешваюць слаі, разбураюць рэшткі старажытных збудаванняў, у першую чаргу вулічныя насцілы, помнікі архітэктуры і інш. Невыпадкова ў апошнія гады прымаюцца меры для аховы культурнага слоя беларускіх гарадоў і мястэчак 14–17 ст. як помнікаў археалогіі. У навукова-вытворчым аб’яднанні «Белрэстаўрацыя» распрацаваны ахоўныя зоны культурнага слоя гарадоў Гародні, Наваградка, Полацка, Віцебска, Мсціслава, Нясвіжа, гарадскога пасёлка Мір. З уводам у дзеянне гэтых зон усе земляныя работы ў іх межах павінны праводзіцца толькі з дазволу археолагаў і пасля таго, як участак гэтых работ будзе даследаваны.

А цяпер, паважаны чытач, запрашаем цябе ў падарожжа па некаторых старажытных гарадах і мястэчках услед за археалагічнай экспедыцыяй.

# ЯК ШУКАЛІ МІРСКУЮ РАТУШУ

Першае наша падарожжа ў Мір. Гэта гарадскі пасёлак у Гарадзенскай вобласці. Славуты ён сваім прыгажуном-замкам, пабудаваным у канцы 15 – пачатку 16 ст. Замак даследуюць гісторыкі, мастацтвазнаўцы, архітэктары, археолагі, малююць мастакі, наведваюць шматлікія турыстычныя дэлегацыі. Значна меней увагі надаецца пасёлку, хаця ўзрост яго на сто гадоў большы, а гісторыя не менш цікавая і багатая на падзеі. Па летапісных крыніцах Мір вядомы з 1395 г.

На працягу другой паловы 13 і ўсяго 14 ст. нашы продкі з усіх сілаў адбіваліся ад сквапных суседзяў-крыжакоў, што з агнём і мячом прыходзілі да нас з Прусаў і Інфлянтаў. У 1395 г. крыжакі на чале з хохмайстрам Конрадам фон Юнгінгенам спалілі Драгічын, Наваградак, Мір і Ліду. Адсюль вынікае, што паселішча ўзнікла не пазней чым у 14 ст. Размясцілася яно на перакрыжаванні дарог, што злучаюць Менск са Слонімам, Слуцк з Наваградкам і далей з Вільняю.

Пасля крыжацкага нападу Мір у хуткім часе быў адноўлены. У 1434 г. вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч падараваў яго віленскаму кашталяну[1] Сенку Гедыгольдавічу. Разам з дваром вялікі князь аддаваў васалу людзей, што там жылі, і ў іх ліку «Дзяміда са сваякамі і сынамі».

[1] *Кашталян – камендант замка, памочнік ваяводы ў Вялікім Княстве Літоўскім у 15–18 ст.*

Кім ён быў, гэты адзіны вядомы нам па імю жыхар Міра 15 ст.? Можа, ганчаром? А можа, ён быў кавалём, мулярам? Гэта так і застанецца для нас невядомым. Але тое, што ў Міры жыло шмат умелых рамеснікаў, сумненняў не выклікае. З сярэднявечных дакументаў вядома, што тут плённа працавалі ткачы, шаўцы, пекары, краўцы, бондары, калёснікі, ганчары, мёдавары, муляры і інш. У канцы 17 ст. рамеснікі Міра



аб'ядноўваліся ў чатыры цэхі: ткацкі, ганчарны, кравецкі і шавецкі. Асабліва славіліся мірскія ганчары. Менавіта іх вырабы самыя шматлікія сярод знаходак. У цэнтры пасёлка дастаткова адзін раз капануць рыдлёўкай, каб натрапіць на кавалкі гаршка, міскі ці якога іншага керамічнага начыння.

З 1490 г. Мір належаў роду Ільінічаў. Пры першым уладальніку з гэтага роду Юры Ільінічу, прыблізна каля 1495 г., быў закладзены замак. Відавочна, у гэты час узведзены ўмацаванні і вакол пасёлка, бо вядома, што Мікалай Хрыстафор Радзівіл, да якога Мір перайшоў у 1568 г., загадаў пабудаваць ужо новыя ўмацаванні. Пры Радзівілах узведзены шэраг вялікіх будынкаў. Фарны касцёл св. Мікалая пабудаваны ў 1587 г. з дрэва, у 1599–1605 г. ён стаў мураваным. Гарадская ратуша з'явілася ў сувязі з тым, што 27 снежня 1579 г. Міру даравана няпоўнае Магдэбургскае права. У цэнтры пасёлка быў збудаваны шпіталь[2]. Да канца 19 ст. былі шырока вядомыя мірскія конскія кірмашы. Росквіт іх прыйшоўся на той перыяд, калі гандаль коньмі знаходзіўся ў руках цыганоў. Пэўны час у горадзе жыў цыганскі кароль.

[2] *Даўней так называлася багадзельня*



У сучасным гарадскім пасёлку амаль нічога не напамінае аб сярэднявечным Міры – горадзе рамеснікаў і гандляроў. Няма старажытных брамаў-варот, што стаялі на чатырох выездах з горада. Не дымяць на агародах горны, загружаныя посудам. Не ўзвышаецца над плошчай ратуша, у якой калісьці засядаў магістрат. Ды і самой плошчы няма, на яе месцы разбіты сквер. Толькі Траецкая царква і Мікалаеўскі касцёл – апошнія сведкі даўніх часоў, неаднаразова рамантаваныя і перабудаваныя, яшчэ стаяць з абодвух бакоў былой плошчы.

Не захаваліся шэдэўры мірскіх рамеснікаў. У сярэднявеччы кожны прэтэндэнт на званне майстра павінны быў даказаць сваю кваліфікацыю праз выраб дасканалай рэчы-шэдэўра, ці «штукі», як тады казалі. Мы не ведаем, што стала з шэдэўрамі мірскіх майстроў, куды закінуў іх лёс за мінулыя 400–500 гадоў, нават нельга сказаць, як яны выглядалі. Праўда, адна «штука» ўсё-ткі засталася. Вось яна – пяцівежавы замак-прыгажун у паўкіламетры ад цэнтра пасёлка.

Тое, што мы знайшлі пад час раскопак, нельга назваць шэдэўрамі. Гэта, у асноўным, звычайныя бытавыя рэчы. Праўда, звыклымі яны былі для тых людзей, што карысталіся імі калісьці. Для нас гэтыя збаны, гаршкі, талеркі, шкляніцы, кварты, падсвечнікі – каштоўныя гістарычныя крыніцы і музейныя экспанаты.

Ужо адразу пасля пачатку раскопак стала зразумелым, што можна спадзявацца на цікавыя знаходкі: на былой плошчы выявіліся чатыры слоі каменных бруковак, размешчаных адзін над адным. Гэта сведчанне напружанага кіпучага жыцця. А дзе ў старыя часы віравала жыццё, там зараз раздолле археолагу. Як жа брукоўкі апынуліся пад зямлёй? Нарастанне культурнага слоя ішло хутка, бо ў Міры штогод адбываліся дзевяць буйных кірмашоў, ды яшчэ праводзіліся штотыднёвыя таргі. Калі брукоўка цалкам пакрывалася зямлёй, насыпалі пясок, каб выраўняць паверхню плошчы, і насцілалі новы рад камянёў. Па знаходках на бруку розных рэчаў (кавалкі гаршкоў, падкоўкі, цвікі і інш. ) вызначаны час збудавання кожнага насцілу. Самую ніжнюю брукоўку паклалі ў 17 ст., самую верхнюю – у 19 ст.

Чаму мы пачалі капаць менавіта на плошчы, а не ў іншым месцы? Справа ў тым, што недзе тут была ратуша. Акрамя агульнай задачы даследавання культурнага слоя пасёлка, у нас была і больш канкрэтная мэта – пошукі ратушы. Будынак ратушы не захаваўся да нашага часу, на паверхні зямлі ад яго не засталося ніякіх слядоў. А пад зямлёй? Вельмі верагодна. Ратуша ў гарадах і мястэчках будавалася грунтоўна і надоўга. Яна выдзялялася на фоне навакольнай забудовы надзвычайнымі памерамі і формамі і наглядна дэманстравала моц і славу горада. Пад вялікі будынак рабілі вялікія падмуркі, якія не так проста разбурыць, тым больш, што яны пад зямлёй. Вядома, што мірская ратуша стаяла на плошчы ці побач з ёй. Здавалася б, цяпер знайсці будынак проста. Але на самай справе, калі ўзяць плошчу ды яшчэ прылеглую да яе тэрыторыю, атрымліваецца паласа памерам прыблізна 150 х 50 метраў. Ды ў дадатак край плошчы шчыльна забудаваны.



Пачалі капаць пасярэдзіне і замест ратушы трапілі на брукоўку. Культурны слой на плошчы не вельмі вялікі – 60–120 см таўшчынёй. Знаходак было многа, як і ўсюды ў Міры. А вось рэштак ратушы мы тут не знайшлі, хаця выкапалі чатыры шурфы. Якраз, калі канчалі апошні, падышоў міранін і паведаміў, што непадалёку ён капае гаспадарчую яму і натрапіў на нейкі цагляны мур, які не бярэ ні рыдлёўка, ні лом. Па памерах цэглы і сістэме муроўкі (а яны ў розныя часы былі рознымі) мы высветлілі, што мур пакладзены у 17 ст. Раскопкі на гэтым месцы адкрылі на глыбіні 1,8 м рэшткі лёхаў вялікага будынка. Столь лёхаў была арачнай, аб чым сведчыць характэрны нахіл сцен. Падмурак выкладзены з буйных камянёў, якія ўпоперак дасягаюць велічыні да 60 см. Рэшткі драўлянай падлогі лёхаў знойдзены на глыбіні 3,8 м. Ад яе засталіся амаль цалкам спарахнелыя кавалкі дошак. На падлозе ляжаў гліняны кубачак, пакрыты зялёнай палівай. Ён аказаўся зусім цэлым, толькі без вушка. Такія прыгожыя зграбныя па форме начынні ўжывалі ў 17 ст.

Па ўсёй верагоднасці, мы знайшлі ратушу. Праўда, па пісьмовых крыніцах вядома, што недзе каля плошчы знаходзіўся мураваны шпіталь, падараваны гораду Радзівіламі. Але большасць дробных, на першы погляд, фактаў сведчыць на карысць ратушы. Па-першае, малаверагодна, што шпіталь быў такі вялікі, з глыбокімі лёхамі. Па-другое, наш будынак знаходзіцца якраз на аднолькавай адлегласці ад царквы і касцёла. Такое размяшчэнне ратушы побач з плошчай у цэнтры архітэктурнага ансамбля – характэрная з'ява для многіх гарадоў Беларусі. Цалкам ускрыць лёхі і высветліць дакладныя памеры будынка не ўдалося – перашкаджаюць навакольныя дамы.



Знешні выгляд мірскай ратушы мы можам уявіць сабе толькі праз вывучэнне падобных збудаванняў, якія захаваліся ў іншых гарадах Беларусі, напрыклад у суседнім Нясвіжы. Відавочна, яна мела высокую, у некалькі паверхаў вежу. На вежы, звычайна, мацаваўся гарадскі гадзіннік. Галоўны ўваход знаходзіўся з боку плошчы, і гадзіннік таксама размяшчаўся з гэтага ж боку. У спецыяльным памяшканні ратушы захоўваліся ўзоры мераў вагі і даўжыні.

Калі пакупнік абвінавачваў прадаўца ў недамеры, недавазе тавару, то ён вёў гандляра ў ратушу. Там тавар узважвалі ці мералі праўдзівымі мерамі. Ў Германіі ўзор меры даўжыні ў выглядзе жалезнага бруса ўмуроўваўся ў сцяну будынка на гандлёвай плошчы. Спрэчку наконт недамеру тканіны, вяроўкі ці чаго іншага можна было вырашыць на месцы. Магчыма, такое было і ў Міры.



Паступова ў ходзе раскопак павялічвалася інфармацыя аб матэрыяльнай культуры старажытнага паселішча. Здабываліся матэрыялы з дапамогай шурфоў і раскопаў, якія закладваліся ў розных частках пасёлка. На другі год даследаванняў высветлілася, што найбольш цікавае для нас месца знаходзіцца непадалёк ад плошчы, на захад ад яе. У разведачным шурфе тут выяўлены найбольш магутны культурны слой, які дасягае таўшчыні больш за 3 м. Гэтым шурфам мы натрапілі на скарб манет канца 17 – пачатку 18 ст. Удача рэдкая, бо на плошчы ў дзесяткі гектараў ямкай памерам 2х2 м трапіць на невялікую купку манет удаецца не часта. Гэта было так нечакана, што хлопец, які капаў шурф, сам археолаг, схапіў грошы ў жменю і з радасным

крыкам адным духам выскачыў з паўтараметровай ямы. Ён зусім забыўся, што такія знаходкі абавязкова трэба фатаграфаваць тут жа на месцы, дзе яны знойдзены. Усяго ў скарбе 93 манеты. Калісьці яны былі загорнутыя ў кавалак тканіны, якая за трыста гадоў спарахнела. Толькі на манетах, што ляжалі па краях слупкоў, захаваўся адбітак гэтай тканіны. Манеты з мірскага скарбу называюцца солідамі, зроблены яны з медзі ў 1660–1661, 1663–1666 г. На кожнай маецца выява ў профіль караля Рэчы Паспалітай Яна Казіміра Вазы, а на адваротным баку – выява герба. У адных выпадках гэта арол – герб каралеўства Польскага, у другіх – герб Вялікага Княства Літоўскага – Пагоня. Пасля такой знаходкі не дзіўна, што на наступны год па месцы шурфа быў закладзены раскоп. У ім на адлегласці каля 2 м ад скарбу трапілі на... другі скарб. Ён знаходзіўся ў гаршку з адбітай верхняй часткай. І хоць на дне гаршка ляжалі ўсяго чатыры манеты, каштавалі яны намнога больш за першы скарб, бо ўсе









зробленыя са срэбра. Тут былі два талеры, бітыя ў Антверпене ў 1633 і 1647 г., прускі шасцігрошавік Фрыдрыха Вільгельма І, 1686 г. і шасцігрошавік Рэчы Паспалітай Яна Казіміра Вазы 1665 г. У другой палове 17 ст. 90 солідаў складалі адзін злоты. За адзін злоты можна было купіць ад 50 да 100 яек ці 20 літраў малака. Такія грошы мог зарабіць муляр за дзень працы. Чатыры срэбныя манеты з другога скарба мелі вартасць каля 10 злотых.

Менавіта ў тым месцы пасёлка, дзе знойдзены скарбы, выяўлены і найбольш старажытныя знаходкі – кавалкі гаршкоў канца 14 – пачатку 15 ст. Па ўсёй верагоднасці, тут было першапачатковае паселішча.

На паўднёвай ускраіне пасёлка адзін з шурфаў прыйшоўся на нейкую пабудову з цэглы. Давялося і тут закладваць раскоп. Высветлілася, што натрапілі мы на горан для абпалу керамічных вырабаў. Па знаходках кавалкаў посуду вызначылі, што датуецца ён другой паловай 17–18 ст. Працэс абпалу вырабаў быў самым адказным і складаным у працы ганчара. Ад правільнага выканання яго залежала якасць прадукцыі. Таму вялікае значэнне надавалася прыстасаванню для абпалу – горану. Ён павінен быць аб'ёмістым, каб можна было загружаць вялікую партыю рэчаў, добра трымаць цяпло, бо для якаснай загартоўкі вырабаў патрэбна на працягу некалькіх гадзін падтрымліваць тэмпературу ў 800–900 градусаў. Увесь працэс абпалу цягнуўся ў сярэднім 10–14 гадзін. Мірскі горан двухкамерны, у плане круглы. Ніжняя камера прызначалася для закладкі дроў, у верхнюю ў некалькі радоў загружаўся посуд, кафля ці якія іншыя керамічныя вырабы. Перамычка паміж камерамі абапіралася на слупок, складзены з цэглы-сырцу. Слупок гэты называўся «дзядком» ці «бабкай». Каб павялічыць тэмпературу абпалу, у перамычцы, звычайна, рабіліся адтуліны. Але ці былі яны ў мірскім горане, сказаць цяжка, бо ад яго захавалася толькі ніжняя частка і «дзядок». Аднак па рэштках знешняй сценкі можна рэканструяваць вонкавы выгляд горана. Форма яго была блізкай да паўсферы, гэта калі разрэзаць шар напалову і пакласці плоскай паверхняй уніз. Зверху ўся паўсфера абмазаная тоўстым слоем гліны.

Побач з горнам пасля некалькіх тыдняў карпатлівай працы расчысцілі каменны падмурак жылога дома другой паловы 17 ст. Дом меў даволі значную для тых часоў плошчу – 36 кв. м. На вялізных камянях падмурка захаваўся рад цаглін. Магчыма, будынак быў цагляным, але не выключана, што знойдзены ў адным з куткоў рад цаглін пакладзены, каб выраўняць паверхню падмурка драўлянага дома.

Але самая цікавая знаходка з гэтага дома – важнейшая за сам падмурак – кафляная печка. І раней археолагі знаходзілі рэшткі печак, але гэта былі бясформенныя развалы гліны і цэглы. А ў нас яна захавалася на вышыню больш за метр. Добра прасочваецца канструкцыя пячной адтуліны, выкладзеная з паўкруглым завяршэннем. Кафля з печкі абадраная (відавочна, яе выкарысталі ў другі раз), мы маем толькі мураванае тулава. Але адна кафліна з ніжняга кута печы знайшлася. Кафля ўпрыгожана выявай фантастычных жывёлаў-пачвар. Майстар-разьбяр, відаць, быў па характару вясёлы, і пачвары ў яго атрымаліся зусім не страшнымі, а хутчэй добрымі. Пад час расчысткі ўнутранай прасторы печкі высветлілася, што яна выкарыстоўвалася не толькі для абагрэву памяшкання, але і для прыгатавання ежы. На самым подзе ў слоі вугалёў знойдзеныя косткі птушак.

Цяжка сказаць, хто жыў у гэтым доме. Не знойдзена рэчаў, якія маглі б навесці на думку адносна прафесіі гаспадара. Адзіная зачэпка знаходзіцца за межамі будынка, літаральна ў метры ад падмурка. Гэта горан. Са значнай доляй верагоднасці можна дапусціць, што будынак і горан суіснавалі. У такім выпадку гаспадаром дома быў ганчар. Мала верагодна, што ганчар збудаваў свой горан амаль упрытык да чужога дома.

Зямля Міра хавае ў сабе яшчэ шмат таямніц, не менш цікавых за тыя, што ўжо раскрытыя. Вясной 1987 г. атрымана паведамленне, што ў водаправоднай траншэі на заходняй ускраіне старога Міра адкрыта старажытная муроўка з камянёў і цэглы. Па ўсёй верагоднасці, гэта Слонімская брама, адна з чатырох, што стаялі на выездах з паселішча. Другая такая ж муроўка адкапаная на паўночным выездзе з пасёлка. Гэта, відавочна, Віленская брама.

У 1988 г. спецыяльная экспедыцыя занялася даследаваннем выяўленых пабудоў. Адначасова вывучаліся рэшткі сярэднявечных умацаванняў, вялася разведка культурнага слоя ў недаследаваных яшчэ частках пасёлка. Па той прычыне, што старадаўнія дарогі не змянілі свой накірунак да нашага часу, усе мірскія брамы, дакладней

іх рэшткі, знаходзяцца пад гэтымі дарогамі. Вось і з усёй Віленскай брамы ўдалося раскапаць толькі бакавую сценку на ўзбочыне заасфальтаванай Чырвонаармейскай (былой Віленскай) вуліцы. Траншэя два з паловай метры шырынёй і 12 даўжынёй ускрыла магутны мур шырынёй 1,9 м, які складзены з цэглы-пальчаткі і буйных камянёў. Ён залягае на глыбіні амаль двух з паловай метраў.

Узніклі складанасці з пошукамі Менскай брамы. На дакладна разлічаным месцы не было знойдзена нічога, акрамя рэштак насцілу даўняй дарогі, зробленага з галля. Толькі другая траншэя, закладзеная бліжэй да цэнтра, трапіла якраз на мур брамы. Яна вельмі падобна на Віленскую тэхнікай муроўкі і матэрыялам.

Зараз мы дакладна можам паказаць месцы размяшчэння ўсіх чатырох мірскіх брамаў. Слонімская выяўлена будаўнічай траншэяй, Менская і Віленская даследаваны археалагічна, а Нясвіжскай няма дзе больш быць, толькі перад мостам праз Міранку. Пасля таго як былі адшуканыя брамы, сталі вядомы дакладныя памеры сярэднявечнага горада і ў археолагаў зніклі сумненні, накшталт: а ці ў тым месцы мы капаем?

Адна з траншэяў прарэзала частку абарончага вала і рова каля вул. Ленінградскай (былая Завальная). Зараз на паверхні зямлі ад іх амаль нічога не засталося, відавочна, у 18–19 ст. роў і вал былі знівеліраваныя. З раскопак відаць, што роў часткова запоўнены глінай з вала.

Некалькі гадоў раскопак у Міры прынеслі разуменне планіровачнай структуры сярэднявечнага горада, і гэта дапамагае выбіраць месца для раскопак. Так, трэба асцерагацца закладваць шурфы і раскопы блізка каля культавых пабудоў. Культурны слой вакол цэркваў і касцёлаў перамешаны шматлікімі старымі пахаваннямі, слядоў ад якіх на паверхні не захавалася.

Амаль ля самых вуліц у беларускіх гарадах і мястэчках цягнулася суцэльная лінія будынкаў. Слой тут таксама перамешаны ямамі пад падмуркі і склепы. Самы багаты на знаходкі слой знаходзіцца ў глыбіні двара на адлегласці 10–15 м ад вуліцы. Сюды часта выкідвалі непатрэбныя рэчы: бітыя гаршкі, кафлю і інш. Далей, у глыбіні сядзібы, пачыналіся агароды – месца для археолага нецікавае.

У Міры ўжо акрэслены выгодныя для раскопак пляцы і спадзяёмся, што нас там чакаюць новыя цікавыя знаходкі.



# НА НАВАГРАДСКІХ ПАГОРКАХ

[1] Сучасная афіцыйная назва – Навагрудак – польскі варыянт беларускага Наваградка.



Для беларусаў горад Наваградак[1] такое ж святое месца, як Кракаў для палякаў, або Кіёта для японцаў, бо тут была першая сталіца беларуска-літоўскай дзяржавы. Наваградак па свайму геаграфічнаму становішчу непадобны на іншыя старажытныя беларускія гарады. Ён размясціўся воддаль ад рэк (найзручных старадаўніх дарог) на самых высокіх вяршынях Наваградскага ўзвышша. Акрамя вышыні гары, зручнай для абароны, заснавальнікі Новага горада ўлічылі яшчэ вельмі важную акалічнасць – з-пад гары чысцюткім струменем выбіваецца крыніца. Відавочна, спалучэнне гэтых двух абставін – высокай гары і блізкай вады – і вызначыла выбар месца пад жытло. А адбылося гэта аж у канцы 10 ст. і, відаць, у добры час, бо гораду было наканавана доўгае і багатае на значныя падзеі жыццё. Першае летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца толькі да сярэдзіны 13 ст., гэта значыць, што амаль трыста гадоў гісторыі горада даступныя толькі археолагам.

Немалую ролю ў росквіце Наваградка адыгралі даволі ўрадлівыя глебы наваколля. Мы ж ведаем, што асновай гаспадаркі нашых продкаў у тыя часы было земляробства. Што ўжо казаць пра багацце мясцовых лясоў на звяроў, а рэчак і азёраў на рыбу.

Як бы там ні было, але праз дзвесце гадоў пасля ўзнікнення Наваградак быў вялікім горадам у росквіце. Аказваецца, у гэты час, у 12 ст., некаторыя жылыя будынкі Наваградка мелі ў вокнах шкляныя шыбы, што нават для самога Кіева было рэдкасцю. Багатыя наваградцы маглі сабе дазволіць раскошу піць са шклянога посуду, прывезенага аж з Сірыі і Ірана, а сцены сваіх дамоў упрыгожыць фрэскавым роспісам.

Як вы можаце здагадацца, аб усіх гэтых цікавых дэталях нам расказалі археолагі. Больш чым дваццаць гадоў запар у старажытным цэнтры Наваградка – Замкавай гары і Малым замку – працавала экспедыцыя пецярбуржскіх археолагаў пад кіраўніцтвам Фрыды Гурэвіч. Велізарная калекцыя знойдзеных рэчаў дала магчымасць напісаць кнігу і не адзін дзесятак артыкулаў пра старажытны Наваградак, аб яго гаспадарцы і побыце жыхароў.

Аднак даследчыкаў цікавіў галоўным чынам найдаўнейшы перыяд жыцця горада – 10–13 ст. Яны не праводзілі раскопак за межамі старадаўняга цэнтра (выключэнне даследаванні Міхала Каргера ля Барысаглебскай царквы 12 ст.). Амаль цалкам па-за іх увагай засталіся пазнейшыя часы – 14–17 ст. А менавіта тады тут віравала ці не самае бурлівае, багатае на падзеі жыццё. Праўда, пачаўся гэты перыяд у 13 ст., калі Наваградчына, як і ўсё Панямонне, стала ядром новай дзяржавы, праз сто з невялікім гадоў буйнейшай у Еўропе. Менавіта багатая Наваградчына была асяродкам, да якога праз энергічную дзейнасць яе князёў імкліва далучаліся ўсё новыя ўсходнеславянскія і балцкія землі, склаўшыя ў рэшце Вялікае Княства Літоўскае.

У 14–16 ст. у Наваградку будуецца і пастаянна ўмацоўваецца магутнейшы сямівежавы мураваны замак, горад з'яўляецца цэнтрам ваяводства, уваходзіць у шэраг буйнейшых у дзяржаве. Ён разрастаецца, спускаецца ў навакольныя нізіны, але асноўная тэрыторыя размяшчаецца на пагорках вакол Замкавай гары.

У 14 ст. да Наваградка неаднойчы прыходзілі крыжацкія загоны. Яны рабавалі навакольных жыхароў, забіралі іх у няволю, спрабавалі ўзяць наваградскі замак. Аб адным такім паходзе вельмі яскрава расказвае нямецкі храніст. У 1314 г. крыжацкае войска выправілася на Наваградак. Напад быў дэталёва спланаваны, нават прадугледжаны два склады харчовых прыпасаў па дарозе, на той выпадак, калі давядзецца вяртацца ні з чым. Такая прадбачлівасць аказалася нялішняй. Па ўсёй дарозе да Наваградка крыжакі сустракалі толькі спаленыя вёскі без жыхароў. Апошнія, папаліўшы свае сядзібы, пахаваліся з дабром па лясах. Дапяўшы да горада, захопнікі беспаспяхова спрабавалі захапіць замак. Наваградчане мужна бараніліся. Калі ж сярод крыжакоў пачаўся голад, то іх камандзіры былі вымушаны спыніць аблогу і ратавацца. Аднак вярнуцца назад да прусаў здолелі толькі адзінкі, астатнія загінулі, большай часткай ад голаду, бо гарадзенскі намеснік Давыд з дружынай захапіў абодва склады харчавання, перабіўшы варту.



Пасля таго як крыжакоў разграмілі пад Грунвальдам у 1410 г. (слынны ўдзел у той бітве прыняла наваградская харугва), з гэтым ворагам было скончана.

Але аб'явіўся іншы, не менш небяспечны – крымскія татары. Імклівая татарская конніца далятала праз бязлюднае Дзікае поле да беларускіх зямель часта раней, чым даходзіла вестка аб іх выправе. Абраўшы месца пад лагер – кош, татары разляталіся ў розныя бакі рабаваць, паліць, браць у палон. Яны даходзілі да Наваградка, хоць і не маглі стварыць сур'ёзнай пагрозы яго ўмацаванням. Менавіта з Наваградка ўлетку 1506 г. войска пад началам князя Міхала Глінскага выйшла ў свой скрытны паход, каб неспадзеўкі заспець татараў у кошы пад Клецкам, вынішчыць іх, вызваліць шматлікі палон (40 тыс. людзей) і пакрыць сябе славай у вачах наступных пакаленняў.

Як і большасць іншых беларускіх гарадоў, Наваградак атрымаў (у 1511 г.) самакіраванне па Магдэбургскаму праву і займеў уласны герб.

Непадалёку ад замка на гандлёвай плошчы будуецца ратуша, там праводзіць свае паседжанні магістрат, захоўваюцца ўзоры мераў вагі, ёмістасці і даўжыні. Горад працягвае сваё жыццё, якое складаецца са штодзённых клопатаў яго насельнікаў. Клопатаў самых розных: аб кавалку хлеба і выратаванні душы, аб даху над галавой і пошуках праўды. І гэтыя клопаты пакідаюць часам свой след у зямлі, дакладней, у культурным слоі ў выглядзе самых разнастайных рэчаў. Здараецца, што след гэты – адзіны напамін пра тых людзей. У 1987–1988 г. нам давялося праводзіць археалагічныя раскопкі на тэрыторыі горада, не ў замку, а на пасадах, з мэтай высвятлення хаця б прыблізных межаў паселішча 15–17 ст., часу засялення асобных раёнаў. Разам з тым даследаваліся рэшткі кляштару былога манастыра дамініканаў, каб потым яго адрэстаўраваць. Як і ў астатніх гарадах Панямоння, раскопкі мелі складанасці, бо Наваградак жыве на сваіх ранейшых пляцах, якія шчыльна забудаваныя. Нават некаторыя вуліцы завуцца гэтак жа, як і 500 гадоў таму назад (напрыклад, Гарадзенская, Менская, Замкавая). Часта даводзіцца закладаць раскопы не ў тым месцы, дзе мяркуецца найбольш цікавы слой, а там, дзе ёсць вольны пляц.









Археалагічныя раскопкі ўпершыню ўскрылі нечапаны яшчэ археолагамі культурны слой познясярэднявечнага горада. Хоць яны і невялікія па плошчы, усяго каля 180 кв. м, але ўжо прынеслі пэўны плён, бо далі новыя матэрыялы па культуры і памерах тагачаснага горада. Так, рэчы 12–13 ст. былі знойдзеныя на даволі значнай адлегласці ад старажытнага цэнтра, каля аптэкі па вуліцы Гарадзенскай і каля кляштару дамініканаў. Калі побач з аптэкай выкапаныя толькі фрагменты венцаў гліняных гаршкоў, то ля дамініканаў ёсць, акрамя таго, шкляныя бранзалеты і праселка. Гэтыя знаходкі даюць магчымасць рабіць высновы аб значных памерах неўмацаванага пасаду горада эпохі Кіеўскай Русі. У 12–13 ст. ужо быў заселены суседні з дзядзінцам (Замкавая гара) і ўмацаваным вакольным горадам (Малы замак) пагорак, дзе зараз стаіць фарны касцёл. Акрамя таго, даўно вядома, што ў гэты час было абжытае наваколле царквы Барыса і Глеба. Навагрдак тады займаў практычна ўсе пагоркі вакол дзядзінца. Значная плошча пасада – сведчанне значнасці паселішча, гэтак жа як і багацце жыхароў вакольнага горада, аб якім мы ўжо ўпаміналі.

Далейшае тапаграфічнае развіццё Навагрдка ішло ў адпаведнасці з традыцыямі еўрапейскага горадабудаўніцтва і асаблівасцямі мясцовага рэльефу. У познім сярэднявеччы асновай планіроўкі паселішча стала гандлёвая дарога з Вільні, што ўваходзіла ў горад з поўначы, а за плошчай разгаліноўвалася на дзве часткі: на Менск і Ляхавічы. У адпаведнасці з асаблівасцямі рэльефу і напрамкам гандлёвых шляхоў сфармаваліся абрысы галоўнай плошчы – рынку. Яна мае форму трохкутніка. Можна меркаваць, што тут нашыя продкі, улічыўшы асаблівасці мясцовасці, на выгоду зручнасці прынеслі ў ахвяру горадабудаўнічую традыцыю, якая дыктавала чатырохвугольную форму галоўнай плошчы, як гэта было ва ўсіх суседніх гарадах. Урэшце ў Навагрдку сфармавалася барочная планіроўка з плаўнай крывізной вуліц і архітэктурнымі дамінантамі – гмахамі культавых пабудоў, якія акаляюць плошчу з трох бакоў.

Пасля далучэння Беларускага Панямоння да Расейскай імперыі быў складзены праект перапланіроўкі Навагрдка (у пачатку 19 ст.), аднак ён застаўся няздзейсненым.

Тая акалічнасць, што вуліцы з часоў сярэднявечча амаль не змянілі свой напрамак, аблягчае працу археолагам, бо дае магчымасць акрэсліць прыблізнае месцазнаходжанне сядзібаў даўніх жыхароў горада. Таўшчыня культурнага слоя Навагрдка значна вагаецца. На дзядзінцы (Замкавая гара) ён складае каля 5 м, на вакольным горадзе ад 1–1,2 м у цэнтры пляцоўкі да больш за 3 м па краях. На тэрыторыі пасадаў слой таксама залягае нераўнамерна. Адна з прычын гэтаму – няроўны рэльеф, бо за доўгія гады адбылося паступовае змыванне наслаенняў з пагоркаў у больш нізкія месцы. Нашымі раскопкамі на пасадзе выяўлены наслаенні ад 1 да 4 м таўшчынёй. Яны галоўным чынам светла-шэрага колеру, у верхніх пластах часта сустракаюцца праслойкі гліны, пяску, многа будаўнічых матэрыялаў.

Сабраная вялікая калекцыя археалагічнага матэрыялу 12–19 ст., сярод якога многа цікавых рэчаў. Як звычайна, самую значную частку знаходак складае непаліваны керамічны посуд. Гэта гаршкі, макотры, накрыўкі. Яны часта ўпрыгожаныя прамымі або хвалістымі лініямі.

Сярод паліванага посуду таксама гаршкі, макотры, а яшчэ кубкі, рынкі. Цікавы фрагмент кубка з хвалістымі сценкамі. Мораныя начынні, да якіх належаць гаршкі, макотры, міскі і талеркі, часта арнаментаваныя глянцаваным арнаментам. Сярод знаходак ёсць два фрагменты рэдкага ў нас посуду, прывезенага з берагоў Рэйну. Усе гэтыя простыя, здавалася б, малакаштоўныя рэчы маюць вялікую вартасць таму, што яны паказваюць масавую матэрыяльную культуру, культуру менавіта народную, якую іншымі сродкамі прасачыць амаль немагчыма.

Вельмі цікавыя па сваіх, у першую чаргу, мастацкіх вартасцях знаходкі кафлі. Яна таксама была шырока распаўсюджаная і багата арнаментаваная. У навакаллях Навагрдка знойдзены экзэмпляры кафлі адной з самых старажытных на Беларусі ў выглядзе цыліндрычнага начыння з даволі нядбайна апрацаванай паверхняй. У час раскопак на

пасадзе таксама знойдзена гаршковая кафля, але пазнейшая – 15–16 ст. з прамавугольным вусцем. Значна больш у калекцыі карабковых кафлін 17 ст. Яны тэракотавыя або пакрытыя зялёнай палівай і ўпрыгожаныя разнастайнымі малюнкамі. Найчасцей ужываўся раслінны арнамент (выявы разнастайных галін, кветак, гронак), радзей геаметрычны (квадраты, трохкутнікі і інш. ). Асаблівую цікавасць выклікаюць кафліны з геральдычным арнаментам, або зааморфным (выявы жывёл), сюжэтным (напрыклад, паляванне), антрапаморфным (выявы чалавека) ці міфалагічным (выявы анёлаў) аздабленнем. Вось кафля з выявай нейкай крылатай жывёлы пад каронай ці сцэна палявання на аленя і г. д. Сярод знаходак кафліны ад розных частак печы: сценныя, гзымсавыя, кафля-каронка. Кафля 18 ст. ужо не такая дасканалая па аздабленню, яна проста гладкая, без арнаменту.



Акрамя названых керамічных рэчаў, знойдзены фрагменты падсвечнікаў, гліняныя люлькі і вялікая колькасць будаўнічай керамікі: цэгла, дахоўка.

Намнога менш, чым керамічных, трапляецца вырабаў з металу: цвікі, нажы, падкоўкі да абутку, скабянка і г. д.

Нашыя продкі з 16 ст. актыўна карысталіся шкляным посудам. У навагрудскай калекцыі ёсць бутэлькі, кварты, стопкі, кубкі, збаны, куфлі. Да 17–18 ст. належаць фрагменты аконнага шкла прамавугольнай формы. І ў познім сярэднявеччы навагрудчане ўжывалі імпартны посуд, аб чым сведчыць фрагмент венецыянскага начыння 16 ст. з нашай калекцыі. Заўважана цікавая заканамернасць – чамусьці знаходкі шклянога посуду канцэнтруюцца галоўным чынам на тэрыторыі манастыроў, цэркваў, касцёлаў. Вось і ў Навагрудку большая частка шклянога посуду знойдзена каля касцёла дамініканаў і Барысаглебскай царквы.

Усе рэчы з нашых раскопак перададзены ў Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей. Па выніках даследаванняў складзена ахоўная зона культурнага слоя горада, у якую ўключана тэрыторыя Навагрудка 17 ст.



# ПАСЕЛІШЧЫ НА РЭЧЦЫ АШМЯНЦЫ

На паўночным захадзе Беларусі, каля мяжы з Летувай, знаходзіцца невялікі горад Ашмяны. Ціхі, прыемны гарадок. Ён утульна размясціўся на абодвух берагах Ашмянкі – прытока Віліі – уздоўж старажытнага менска-віленскага шляху. Першае летапіснае ўпамінанне аб Ашмянах выяўлена ў «Хроніцы Літоўскай і Жамойскай» за 1341 г. У некаторых дарэвалюцыйных выданнях датай заснавання паселішча называецца 1040 год, але сучасныя гісторыкі ніякіх пацвярджэнняў гэтаму не маюць. Нямецкія хронікі паведамляюць, што крыжакі ў 1384 г. (па другіх звестках у 1385 г.) зрабілі чарговы паход на беларускія і летувіскія землі. На гэты раз яны напалі на Крэўскае княства, дзе пад началам магістра Конрада Цолнера знішчылі ўсё на сваім шляху аж да Ашмян.



Звестак аб гістарычным мінулым горада засталося няшмат. Вялікая колькасць дакументаў, якія захоўваліся ў самім горадзе, пад час шматлікіх войнаў загінула. Вось некалькі выпісак з гродскіх кніг Ашмянскага павета, звязаных з вайной са шведамі ў пачатку 18 ст.: «...у годзе 1702 месяца мая 9 дня да месца Ашмяны прыбыло вялікае шведскае войска. Там, паколькі непрыяцель рабіў усё, што хацеў, то, акрамя іншага, у склепе, дзе былі ў захаванні акты ўсяго Ашмянскага павета і іншых паветаў і ваяводстваў, земскія кнігі, справы, законы, магістрацкія запісы, дакументы аб шляхецкім стане, скрыні з кнігамі разбіты, кнігі па падворку параскіданыя. Іншыя паабдзіраныя, расшарпаныя і іншыя ці праз непрыяцеляў шведаў, ці праз іншых розных людзей і абывацеляў таго ж павета розныя дакументы з тых кніг павыдзіраныя... найбольш кніг ад года 1683 аж да года 1696 дашчэнту згінула».

Добра яшчэ, што гарадскія ўлады пасля адыходу шведаў сабралі значную частку архіва і вярнулі ў месца ранейшага захавання. Пазней, ужо пасля французскай навалы 1812 г., пад час пошукаў інвентароў і карт Ашмянскага староства, высветлілася, што амаль усе яны загінулі.

З-за свайго месцазнаходжання побач са сталіцай Вялікага Княства Літоўскага Вільняй Ашмяны часта траплялі ў самы вір палітычных падзей сярэднявечча. Апошні прыход крыжакоў адбыўся ў 1402 г. Комтур Вільгельм з Хельфенштэйну, пусціўшыся да Меднікаў, знайшоў іх ужо спаленымі самімі жыхарамі і таму павярнуў у ваколіцы Ашмян, рабуючы і палячы ўсё, што траплялася пад руку. Але нядоўга ўжо заставалася тэўтонцам гуляць па чужой зямлі. Цераз восем гадоў каля Грунвальда пад націскам аб'яднанага войска Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, чэшскіх, венгерскіх, татарскіх атрадаў ушчэнт разляцелася моц і слава Ордэна і з крыжацкімі набегамі было скончана назаўсёды.

У 1432 г. у Ашмянах адбыліся драматычныя падзеі, звязаныя з барацьбой за ўладу паміж дзвюма групоўкамі феадалаў. Стаўленік адной з іх – вялікі князь Свідрыгайла з невялікім атрадам знаходзіўся ў ашмянскім двары. На яго знянацку напаў сапернік Жыгімонт Кейстутавіч з моцным войскам. Світа Свідрыгайлы разбеглася, а сам ён з 14 коннікамі ледзьве паспеў уцячы ў Полацк. Неўзабаве справа дайшла да рашаючай бітвы, перамогу ў якой атрымаў Жыгімонт. У гонар такой падзеі ён каля 1434 г. фундаваў пры ашмянскім касцёле (пабудаваным яшчэ Ягайлам ці Вітаўтам) калегію.



Трэба адзначыць, што Ашмяны бачылі на сваім веку не толькі вайсковыя калоны, але і такія працэсіі, як праезд да Вільні дачкі маскоўскага князя Івана Васільевіча князёўны Алены. Яна накіроўвалася ў сталіцу, каб уступіць у шлюб з вялікім князем літоўскім Аляксандрам.



У межы сучаснага горада ўваходзіць мясціна, якая называецца Старыя Ашмяны. Мяркуюць, што тут знаходзілася першапачатковае паселішча. У 1505 г. вялікі князь Аляксандр аддаў Старыя Ашмяны манахам-францысканам, збудаваўшы ім тут касцёл і кляштар. У гэты час разраслася новая частка Ашмянаў, там, дзе зараз знаходзіцца цэнтр.

У 16 ст. горад стаў цэнтрам павета. Ашмяны не мелі Магдэбургскага права і кіраваліся вялікакняскай адміністрацыяй, але ўжо ў часы княжання Жыгімонта Старога (1506–1548 г.) карысталіся зацверджанымі дзяржавай правамі і прывілеямі, паміж мяшчанамі былі распісаны падаткі. Гараджане вызваляліся ад пастою войска, варты, дастаўкі лістоў. Ашмянскімі старастамі ў розныя часы былі прадстаўнікі буйнейшых магнацкіх родаў: Радзівілаў, Сапегаў, Зяновічаў, Пацаў і інш. У цэнтры горада пад час раскопак знойдзена некалькі фрагментаў кафлі 17 ст. з геральдычным арнаментам. На адным з іх захавалася частка выявы арла – родавага знака Радзівілаў. Магчыма, мы знайшлі кафліну ад печы, якая належала Багуславу Радзівілу, – ашмянскаму старасце у 1650 г.



У другой палове 16 ст. першы стараста з Радзівілаў заклаў тут кальвінскі збор. У 1667 г. быў фундаваны касцёл св. Троіцы і пры ім кляштар дамініканаў. Пры апошнім каралі Рэчы Паспалітай у 1792 г. Ашмяны атрымалі герб, які самі сабе выбралі: на адным баку рука з вагамі, на другім – шчыт, паміж ім унізе бык, а пад быком надпіс: Memoria Stanislai Augusti 1792 (памяць Станіслава Аўгуста).



Такі вось кароценькі нарыс гісторыі горада да 19 ст. Многае яшчэ застаецца няясным або зусім невядомым. Напрыклад, як адказаць на такое пытанне: калі ўсё ж былі заснаваныя Ашмяны? Першае пісьмовае ўпамінанне – 1341 г. Але ад узнікнення паселішча да ўпамінання аб ім у пісьмовых крыніцах можа прайсці шмат часу, дзесяткі або нават сотні гадоў. Каб далёка не хадзіць за прыкладам, возьмем такія гарады Беларускага Панямоння, як Ваўкавыск або Слонім. У летапісах яны ўпершыню сустракаюцца пад 1250 г., хоць фактычна гэтыя паселішчы ўзніклі ўжо ў канцы 10 – пачатку 11 ст.

Праз вывучэнне нешматлікіх і адрывачных летапісных звестак гісторык Расціслаў Баравы прыйшоў да высновы, што Ашмяны існавалі ўжо ў 13 ст. як цэнтр невялікага княства. Цікава было б яшчэ ведаць, ці быў у Ашмянах замак (аб ім пісалі дарэвалюцыйныя даследчыкі), а калі быў то дзе, як развіваўся горад, ці праўда, што першапачатковае паселішча знаходзілася ў Старых Ашмянах і г. д. Гісторыкі пакуль не могуць даць дакладныя адказы на гэтыя пытанні. Таму невыпадкова ўлетку 1984 г. у Ашмянах з'явіліся археолагі. Яны прыехалі па запрашэнню аддзела культуры райвыканкама, каб паспрабаваць вырашыць праблему з дапамогай метадаў сваёй навукі. У больш вузкім сэнсе задача стаяла так – знайсці культурны слой першапачатковага паселішча і высветліць яго характар – было яно ўмацаваным ці не. Паколькі мы не ведаем ніякага помніка (напрыклад, гарадзішча), які можна звязаць з летапіснымі Ашмянамі, то раскопкі былі сканцэнтраваныя ў межах сучаснага горада.

Археалагічныя даследаванні працягваліся і ў 1985 г. Раскопкі вяліся ў двух месцах: у Старых Ашмянах (вуліца Кастрычніцкая) і ў цэнтры горада. Як ужо ўпаміналася, у Ашмянах уздоўж ракі па абодвух яе баках цягнуцца ланцугі пагоркаў і асноўная частка горада размешчана паміж імі і ракой. Зразумела, калі замак быў, то ён мусіў займаць адну з пануючых над наваколлем вышынь. Але слядоў умацаванага збудавання на пагорках у Старых Ашмянах няма: ніякіх хоць бы намёкаў на валы, равы; культурны слой таксама адсутнічае. Аўтар сам з рыдлёўкаю у руках абхадзіў і агледзеў усе ваколіцы горада па абодвух берагах ракі. У многіх месцах вяршыні і схілы пагоркаў узараныя, а, як вядома, на ўзаранай зямлі сляды паселішча шукаць значна лягчэй, чым ракопваць дзірван. Пошукі поспеху не прынеслі.

Але вернемся да раскопак. Задоўга да пачатку археалагічнага даследавання ўжо праводзілася падрыхтоўчая праца. Збіраліся матэрыялы па архівах, археолагі выязджалі на агляд будучых месцаў раскопак. Трэба адзначыць, што сустракалася нямала цяжкасцей. На самай справе, не так проста весці раскопкі ў горадзе. Акрамя шчыльнай забудовы, трэба ўлічыць яшчэ падземныя камунікацыі. Дрэнна прыйшлося б археолагам, каб не зацікаўленыя ашмянцы. Вельмі хутка з гарадскімі службамі былі ўладкаваныя ўсе пытанні адносна месца раскопак. Мясцовыя жыхары ахвотна пускалі нас капаць на свае падворкі, дапамагалі ў арганізацыі даследаванняў. З іх дапамогай у Старых Ашмянах былі знойдзены падмуркі кляштару францысканаў 16 ст. Кляштар знаходзіўся побач з касцёлам. Відавочна, будынак быў вялікім, бо падмуркі, складзеныя з буйных камянёў на гліне, залягаюць на глыбіню больш як 2,5 м. Тут жа знойдзена цэгла-пальчатка памерам 29,5x17x8 см. З такой цэглы ў канцы 15 – пачатку 16 ст. пабудаваны Мірскі замак.

У наваколлі касцёла ўдалося намацаць участак са светла-шэрым культурным слоем, таўшчынёй больш за 1 м. Гэты слой перамешаны шматлікімі пахаваннямі, неглыбокімі і вельмі густа размешчанымі. Відавочна, могілкі доўга функцыянавалі або да іх дабавілася масавае пахаванне, магчыма, звязанае з адным з іншаземных нашэсцяў ці эпідэміяй.

Магільныя насыпы даўно зніклі, таму на паверхні зямлі пахаванні не прасочваюцца і некаторыя дамы пабудаваныя прама на іх. Менавіта ў гэтым перамешаным слоі знойдзены самыя старажытныя рэчы з Ашмянаў. Гэта некалькі кавалкаў непаліваных гаршкоў, міска, наканечнік стралы. Гаршкі, падобныя на ашмянскія, вядомы з Гародні, Ваўкавыска, Бярэсця, Пінска і маюць шырокае датаванне – 12–13 і пачатак 14 ст. Міска адносіцца да 12–14 ст., наканечнік стралы датуецца больш вузка – 14 ст. Можна меркаваць, што найстаражытныя рэчы датуюцца не раней за 14 ст.

У цэнтры горада таўшчыня культурных наслаенняў вагаецца ад 0,6 да 1,3 м. Удалося выявіць непатрывожаныя ўчасткі і ў адным месцы нават закласці два невялікія раскопы. У гарадскіх наслаеннях выдзяляюцца два пласты. Верхні – таўшчынёй 0,3–1 м

утрымлівае праслойкі гліны, пяску, бітай цэглы. Знаходкі з яго датуюцца 17–20 ст. Ніжні пласт цёмна-шэрага колеру ёсць толькі ў раёне, што прылягае да плошчы. Рэчы, знойдзеныя ў ім, адносяцца да 15–17 ст. У двух месцах побач з плошчай, як і ў Міры, у зямлі выяўлены каменныя брукоўкі, адна 17 ст., другая 19 ст. Найбольш старажытныя знаходкі (гаршкі, фрагменты падковаў, ключ) адносяцца да 15 ст.



У выніку раскопак можна прапанаваць найбольш верагодную рэканструкцыю тапаграфічнага развіцця горада. Старажытнае паселішча размяшчалася на правым беразе Ашмянкі ў Старых Ашмянах. Дакладнае месца паселішча акрэслена каля падэшвы аднаго з пагоркаў, там, дзе знаходзяцца руіны касцёла францысканаў. Падставы для такой высновы: знаходкі чатырох кавалкаў непаліваных гаршкоў, цэлага профілю міскі 12–14 ст., наканечніка стралы 14 ст. Адсутнасць непатрывожанага культурнага слоя паселішча можна вытлумачыць размяшчэннем на яго месцы могілак. Пасяленне было невялікім, яно займала плошчу каля 0,3 га. Відавочна, тут знаходзіўся летапісны «двор Ашмяна». Могілкі на гэтым месцы ўзніклі ў сувязі з будаўніцтвам у 16 ст. касцёла францысканаў. Да пачатку будаўніцтва двор быў перанесены на другі бераг ракі, дзе зараз цэнтр горада.



З інвентароў 17 ст. вядома, што ў гэты час «двор Ашмянскі» – адміністрацыйны цэнтр павета, размяшчаўся на поўдзень ад плошчы. У 15–16 ст. асноўная тэрыторыя горада знаходзілася на левым беразе ракі ў 1,5 км ад Старых Ашмян. Тут сфарміравалася сетка вуліц, якая без значных змен захавалася да нашага часу. У аснове гарадскога плана ляжаць тры дарогі: Вільня – Менск – дзяржаўнага значэння, а таксама мясцовыя шляхі: на Жупраны – Смаргонь і Гальшаны – Наваградак. Дзве старажытныя ашмянскія вуліцы захавалі свае назвы да нашых дзён (яшчэ адно сведчанне аб увазе мясцовых жыхароў да гісторыі свайго горада). Гэта вуліцы Гальшанская і Барунская. Па археалагічных знаходках можна меркаваць, што раней за іншыя заселены ўчасткі вакол плошчы і гэта не дзіўна – даўнейшыя людзі і гэтак жа, як і сучасныя, імкнуліся пасяліцца ў цэнтры.



Яшчэ адным вынікам раскопак стала багатая калекцыя рэчаў з побыту сярэднявечных ашмянцаў, але аб ёй гаворка яшчэ наперадзе. Немалаважна і тое, што два дзесяткі мясцовых школьнікаў значна папоўнілі свае веды аб родным горадзе. Можна спадзявацца, што пры выпадку яны здолеюць самастойна вызначыць гістарычную вартасць трапіўшай ім у рукі старажытнай рэчы і перадаць яе ў музей.

# МЯСТЭЧКІ КАЛЯ ЗАМКАЎ

Гальшаны і Любча – старажытныя беларускія мястэчкі, размешчаныя на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў. Зараз яны мястэчкамі не называюцца. Гальшаны – вёска, а Любча – гарадскі пасёлак.

Мястэчкі займалі прамежкавае становішча паміж гарадамі і вёскамі. Жыхары іх займаліся сялянскай працай, а акрамя таго, валодалі якім-небудзь рамяством, вялі гандаль. Мястэчкі выраслі, звычайна, з вёсак, у адных выпадках, дзякуючы зручнаму размяшчэнню на гандлёвых шляхах, у другіх – у выніку волі гаспадара. Вялікі князь, ці магнат, у валоданні якога знаходзілася пасяленне, даваў прывілей на вядзенне гандлю, арганізацыю кірмашоў, і гэта станавілася штуршком да хуткага росту паселішча. Большая частка мястэчак на Беларусі з'явілася ў канцы 15–16 ст. у выніку развіцця таварна-грашовых адносін. Якраз 15–16 ст. Беларусь перажыла адносна спакойна. Былі войны, былі набегі татараў, але яны не прынеслі такога спусташэння, як гэта адбылося пазней, у другой палове 17 ст.

Неабходнасць у пасяленнях местачковага тыпу была, відаць, вялікай, бо вырасталі яны, як грыбы пасля дажджу. У сярэдзіне 17 ст. па падліках гісторыка Зіновія Капыскага ў Беларусі было 425 мястэчак. Большасць гэтых старажытных паселішчаў, у тым ліку Гальшаны і Любча, да нашага часу захавала сваю старажытную планіроўку. Яна надзвычай простая і ў аснове мае перакрыжаванне дзвюх ці больш старажытных дарог, што ў межах пасялення становяцца вуліцамі. Будынкі выцягваліся ўздоўж вуліц-дарог. Тут было выгодна сяліцца рамеснікам, бо лягчэй можна знайсці пакупніка на свае вырабы. Гандлярам таксама даспадобы жыллё, якое размешчана каля гандлёвага шляху. Паступова паселішча разрасталася. Каля самага перакрыжавання ўзнікала плошча, прычым прымыкала да яго збоку, каб не перашкаджаць у час кірмашоў праходу ці праезду падарожнікаў, якім няма патрэбы спыняцца. Побач з плошчай знаходзяцца касцёл ці царква або тое і другое разам, бо тут заўсёды больш чым дзе людзей і маюцца зручныя пад'езды.





І вось прайшло ўжо не менш пяцісот гадоў, а плошча ўсё на тым жа месцы, дзе была з самага пачатку, старажытныя дарогі бягуць у тых жа кірунках, па тых жа самых мясцінах. Каго толькі не прыводзілі гэтыя дарогі ў мястэчка ў кірмашныя дні. Тут віравалі, хвалілі свой тавар мясцовыя і прыезджыя гандляры, прапаноўвалі вырабы рамеснікі, прыцэньваліся да патрэбных у гаспадарцы рэчаў сяляне з навакольных вёсак, шляхцюкі з фальваркаў. Былі тут і вандроўнікі, і студэнты, і цыганы з мядзведзем, і артысты з батлейкай. Гандляры прыязджалі не толькі з беларускіх гарадоў, але і з замежных. Сярэднявечныя местачковыя кірмашы аказаліся настолькі жывучай і трывалай формай гандлю, што дзе-нідзе дажылі да нашых дзён.

Гальшаны і Любча – тыповыя беларускія мястэчкі. У 16–17ст. яны былі амаль аднолькавымі па памерах, мелі пад паўтары сотні дамоў кожнае. Але папярэдняе іх развіццё ішло рознымі шляхамі. Гальшаны па пісьмовых крыніцах вядомыя з 13 ст. У двух кіламетрах ад сучаснай вёскі, каля дарогі на Баруны, на высокім пагорку знаходзіцца гарадзішча. Гэтае гарадзішча і селішча побач з ім і было старажытнымі Гальшанамі. Валодаў імі род князёў Гальшанскіх. Даследчыкі мяркуюць, што пасля таго, як у другой палове 16 ст. пасяленне адышло да Сапегаў, то новыя ўладальнікі перанеслі рэзідэнцыю з гарадзішча на бераг Лусты (Гальшанкі). Тут у 16 ст. пачалі, а ў 17 ст. скончылі будаўніцтва замка, які зараз ляжыць у руінах. А яшчэ пасля Другой сусветнай вайны ён быў цэлы. Спатрэбілася цэгла на будаўніцтва клуба і большую частку помніка разбурылі. На яго тэрыторыі зараз размешчаны кароўнік. Мястэчка на беразе Лусты існавала яшчэ да з'яўлення замка. У 15 ст. у Гальшанах быў пабудаваны касцёл, у 16 – Кальвінскі сабор. У пачатку 17 ст. узведзены манастыр і касцёл францысканаў. У канцы 16 ст. у мястэчку пачала дзейнічаць паперня, у якой выраблялася якасная папера для пісьма і друку.



Першыя звесткі пра Любчу адносяцца да 15 ст., дакладней, да 1499 г. Вялікі князь Аляксандр дараваў двор Любчу падскарбію[1] Ф. Храптовічу. На працягу 16 ст. гаспадары мястэчка мяняліся некалькі разоў. У 1528 годзе яно перайшло да А. Гаштольда, з 1574 г. належала Яну Кішку, а з 1606 г. Любча – уладанне Радзівілаў. У другой палове 16 ст. пачалі ўзводзіць замак – рэзідэнцыю Яна Кішкі. Для будаўніцтва абрана прыгожая мясціна над Нёманам на паўднёва-ўсходняй ускраіне мястэчка.

*[1] Падскарбій – вышэйшая службовая асоба ў Вялікім Княстве Літоўскім, загадваў дзяржаўным скарбам.*





Дабудова і перабудова замка і палаца працягваліся і пры наступных уладальніках. У 1590 г. мястэчка атрымала Магдэбургскае права і ў сувязі з гэтым займела свой герб: у блакітным полі срэбная падкова рагамі ўніз, у ёй два залатыя крыжы, а трэці зверху. У падкове два ласасі, адзін галавой уверх, другі – уніз. Адначасова Любча атрымала права праводзіць штотыднёвыя таргі і два кірмашы штогод. Развіццю мястэчка спрыяла яго месцазнаходжанне на беразе Нёмана, бо буйныя рэкі, як вядома, – зручныя гандлёвыя шляхі. У 1592 г. у Любчы заснаваная друкарня. Першым друкаром у ёй быў Пётр Кміта. У 1644 г. Уладзіслаў IV пацвердзіў Магдэбургскае права і дараваў мястэчку новыя прывілеі і герб: каменная брама і рыцар са шчытом і мечам.

На малюнку Любчы, выкананым І. Нарановічам-Наронскім у сярэдзіне 17 ст., на выездах з мястэчка відаць чатыры брамы, а ў заходняй частцы паселішча – дзве вежы і агароджа. Недалёка ад замка паказаны Кальвінскі сабор 16 ст.

Чаму ж мы пачалі капаць менавіта ў Гальшанах і Любчы, а не ў якім іншым мястэчку? Справа ў тым, што пачаліся даследаванні ў Гальшанскім і Любчанскім замках. Іх вяла экспедыцыя навукова-вытворчага аб'яднання «Белрэстаўрацыя» пад кіраўніцтвам Ігара Чарняўскага. Паралельна з гэтай экспедыцыяй мы пачалі вывучаць самыя пасяленні, каб мець нейкае агульнае ўяўленне і аб замках і аб мястэчках. Трэба адзначыць, што раскопкі ў мястэчках былі невялікімі па аб'ёму, але вельмі цікавымі, таму што гэта адно з першых археалагічных даследаванняў беларускіх мястэчак. Пытанняў перад намі стаяла шмат. Які тут культурны слой? Ці захоўваюцца ў ім дрэва, скура і іншыя арганічныя матэрыялы? Якія старажытныя рэчы могуць трапіцца? Ці адрозніваецца археалагічны матэрыял з мястэчак ад гарадскога?



У нашых мястэчках цяжка знайсці непарушаны культурны слой. І гэта не дзіўна. У Гальшанах, Любчы, гэтак жа як і ў іншых такіх паселішчах, з часу іх узнікнення да нашых дзён не спыняецца інтэнсіўнае жыццё. Людзі працягваюць сяліцца на тых месцах, дзе жылі іх бацькі, дзяды, прадзеды, уладкоўваюцца, капаюць скляпы, раўкі пад падмуркі і г. д. Усё гэта не спрыяе добраму захаванню культурнага слоя.

Асабліва адчувальным недахоп месцаў для раскопак быў у Гальшанах. У цэнтры паселішча вакол плошчы захавалася шчыльная старая забудова. Ледзьледзь можна ўціснуцца з шурфам паміж дамамі, прычым з рызыкай трапіць на перамешаны слой. Адзіная свабодная пляцоўка побач з плошчай размешчана каля касцёла.

Шурф, закладзены за касцёльнай агароджай, прыйшоўся якраз на могілкі. Адзін з шурфаў на ўскраіне вёскі паказаў нязначны па таўшчыні і бедны знаходкамі культурны слой. Усё-такі тры шурфы ўдалося ўклініць на тэрыторыю ля плошчы і трапіць якраз на амаль непарушаны слой. Менавіта тут ён найбольшы па таўшчыні – 1,4 м. Знаходкі ў верхнім пласце адносяцца да 18–20 ст. У ніжнім пласце таўшчынёй 0,7–1 м знойдзеныя рэчы 15–17 ст. (керамічны посуд, кафля, цэгла, дахоўка).



У шурфах ля цэнтра трапіліся і самыя цікавыя знаходкі: кафля ў выглядзе гаршкоў, а таксама металічныя і шкляныя вырабы, керамічны посуд. Тут жа выяўлены і самыя старажытныя рэчы – фрагменты гаршкоў і кафлі 15–16 ст. Да вельмі рэдкіх знаходак належыць кавалак формы для вырабу кафлі.

У Любчы старая забудова вакол цэнтра не захавалася, але яе месца занялі сучасныя будынкі, так што праблемы з раскопкамі былі такія ж, як у Гальшанах. Высветлілася, што можна знайсці некранутыя ўчасткі культурнага слоя, насычанага рознымі старажытнымі рэчамі. У скверыку на месцы былой плошчы ўдала трапілі на каменны падмурак. Ён залягае неглыбока, відавочна, гэта рэшткі гандлёвых радоў 19 ст. Шурфы, закладзеныя вакол былой плошчы, дазволілі высветліць магутнасць (1,3 м), характар слоя, сабраць цікавую калекцыю знаходак.

Два шурфы заклалі непадалёк ад замка, каля таго месца, дзе ў 16 ст. быў Кальвінскі збор і друкарня. Слой тут аказаўся даволі бедным, знайшлі ўсяго некалькі фрагментаў керамічнага посуду 17–18 ст. На жаль, слядоў старажытных будынкаў не трапілася. І гэта не дзіўна, бо было б цудам на такой плошчы двума маленькімі шурфамі выявіць той жа збор ці друкарню. Мы не мелі магчымасці правесці тут больш грунтоўныя даследаванні, і давялося адкласці пошукі на неакрэслены час. Багацейшым на знаходкі аказаўся культурны слой каля плошчы. Па знаходках высветлілася, што верхнія 0,5 м утварыліся на працягу 18–20 ст. У слаях, размешчаных на 20–25 см глыбей, знойдзены рэчы 17–18 ст. А ў самым ніжнім пласце таўшчынёй каля 0,3 м выяўленыя кавалкі керамічнага посуду 15–17 ст.

Найбольш старажытныя рэчы з Любчы – кавалкі непаліваных гаршкоў – знойдзены менавіта ля плошчы. Яны датуюцца 15 ст. Удалося сабраць поўны профіль вялікага керамічнага начыння – макотры. Яна ўпрыгожаная наляпным пасам. Сярод іншых цікавых знаходак трапілася унікальная: паліхромная кафля – медальён з выявай таўсташчокага вусатага твару нейкага шляхцюка. Гэта адзіная паліхромная кафля з раскопак у Любчы. Для яе аздаблення спатрэбілася белая і сіняя палівы.

У выніку невялікіх, можна сказаць, разведачных даследаванняў высветлілася, што культурны слой у мястэчках раўнамерна адкладваўся вакол плошчы і найбольшай магутнасці дасягнуў менавіта побач з ёй. Тут даўней ішло і ідзе зараз самае інтэнсіўнае жыццё. Чым далей ад цэнтра, тым танчэйшы слой. Нягледзячы на тое, што зямля ў многіх месцах перакапаная, у мястэчках магчыма праводзіць археалагічныя раскопкі і знаходзіць цікавыя рэчы. Дрэва і скура ў мястэчкавай зямлі захоўваюцца дрэнна. У Гальшанах адзіная знаходка вырабу са скуры – падэшва бота канца 19 – пачатку 20 ст. з набітай на абцас падкоўкай.

Складваецца такое ўражанне, што значных адрозненняў паміж рэчамі, знойдзенымі ў гарадах і ў мястэчках, няма. Зразумела, матэрыял з горада і багацейшы, і больш разнастайны. Напрыклад, паліхромная кафля ў мястэчках рэдкасць, для гарадоў жа знаходкі такіх кафлін – звычайная з’ява. Гэта не дзіўна, бо ў гарадах жыло больш багатых людзей, якія маглі прыдбаць дарагую печ са шматколернай кафлі. Тое ж самае можна сказаць і пра шкляны ці керамічны імпартны посуд. Праўда, нельга забываць, што археалагічныя даследаванні мястэчкаў толькі пачынаюцца, а ў гарадах ідуць ужо дзесяткі гадоў. Таму рана рабіць нейкія канкрэтныя высновы. Асноўная праца яшчэ наперадзе. Даследчыкаў старажытных беларускіх мястэчак, несумненна, чакаюць цікавыя знаходкі і адкрыцці.





# ЗРОБЛЕНА РУКАМІ ПРОДКАЎ

Усё-ткі матэрыяльная культура Беларусі 14–18 ст., на жаль, яшчэ дрэнна вывучаная. У навуцы склалася дзіўная сітуацыя. Няблага даследаваныя археалагамі 10–13 ст., этнографы добра вывучылі матэрыяльную культуру 19 – пачатку 20 ст., а паміж гэтымі перыядамі засталася белая пляма. Яна закрывае цікавейшую эпоху нашай гісторыі. У гэты час у нетрах феадалізму зараджалася і мацнела новая грамадская фармацыя – капіталістычная. У 14–17 ст. адбывалася станаўленне беларускага народа. Усё гэта адбілася і на матэрыяльнай культуры. Ужо па тых рэчах, якія ў нас ёсць, можна вызначыць, што матэрыяльная культура 14–17 ст. характарызуецца вялікім багаццем і разнастайнасцю.

У апошнія часы прыкметныя пэўныя зрухі. Над вывучэннем матэрыяльнай культуры позняга сярэднявечча зараз працуюць больш за дзесятак спецыялістаў-археолагаў, і можна спадзявацца, што ў хуткім часе плён іх стане прыкметным.

У папярэдняй частцы кнігі апавяданне ішло аб раскопках у чатырох паселішчах, якія маюць багатую гісторыю. У мінулым гэта былі пасяленні рознага тыпу. Гальшаны і Любча – мястэчкі, Ашмяны – горад, а аб Міры даследчыкі і зараз спрачаюцца, як яго назваць – горадам ці мястэчкам. Агульнае ў іх тое, што ва ўсіх чатырох пасяленнях археалагічныя даследаванні праводзіліся ўпершыню і здабыты матэрыял цалкам новы і амаль невядомы навукоўцам, а тым больш шырокаму чытачу.

У якасці працоўнай сілы пад час раскопак былі занятыя мясцовыя школьнікі, большая частка знойдзеных рэчаў адкапаная іх рукамі. У ходзе даследаванняў у вучняў заўважана павышэнне цікавасці да гісторыі роднага краю. Таму мы спадзяёмся, што нашы раскопкі вырашалі не толькі навуковыя задачы, але і адыгралі пэўную выхаваўчую ролю.

Не менш цікавымі былі экспедыцыі ў іншыя гарады, такія, як Гародня, Ліда, Слонім, Мазыр, Чачэрск, Мсціслаў і інш. Знаходкі ў некаторых з іх таксама выкарыстаныя ў нашым апавяданні.

У культурных адкладаннях 14–17 ст., калі параўноўваць іх з папярэднім перыядам, назіраецца павелічэнне колькасці знаходак, а таксама большая іх разнастайнасць. З 14 ст. вядомыя пячная кафля і дахоўка, з 15 ст. распаўсюджваецца палiваны керамічны посуд, з канца 16 ст. – мораны. У 15 ст. з'яўляюцца абутковыя падкоўкі. У слаях канца 16 – пачатку 17 ст. пачынаюць трапляцца гліняныя люлькі. На працягу 14–17 ст. значна павялічыўся выпуск керамічнага посуду, пашырыўся яго асартымент. У Міры, напрыклад, наслаенні 17 ст. утрымліваюць да 500 фрагментаў керамічнага посуду на 0,8 кубічных метраў зямлі (квадрат памерам 2x2 м і глыбінёй – 20 см).

Пра даўнія рэчы з раскопак у беларускіх гарадах і мястэчках (у асноўным, панямонскіх) будзе далейшае наша апавяданне.

## КЕРАМІЧНЫ ПОСУД



З даўніх часоў у жыцці чалавека значную ролю адыгрывае звычайная гліна. Сучасная навука стварыла вялікую колькасць танных і трывалых матэрыялаў, без якіх нельга ўявіць побыт чалавека нашых дзён. Але адзін са старажытнейшых будаўнічых матэрыялаў – гліна, у значнай ступені ўтрымлівае свае пазіцыі ў побыце (посуд і інш.), будаўніцтве (цэгла, дахоўка, трубы, пліткі), тэхніцы, скульптуры, прыкладным мастацтве і г. д. А ў мінулым значэнне гэтага трывалага і пластычнага матэрыялу было яшчэ большым. Як і зараз, людзі выраблялі з гліны цэглу, каб збудаваць сабе жыллё, дахоўку, каб закрыць дом ад дажджу і снегу, пліткі, каб насцілаць падлогу. З гліны рабіліся печы і кафля, а найбольш шырока яна

ўжывалася для вытворчасці посуду. Невыпадкова, што гліняныя вырабы складаюць большасць сярод знаходак, сабраных пад час раскопак. Асабліва многа іх у познясярэднявечных слаях. У побыце беларусаў шырока ўжывалася дрэва, але старажытныя вырабы з яго, у адрозненне ад гліняных, захоўваюцца далёка не ўсюды. Гэта таксама адна з прычын перавагі вырабаў з гліны сярод археалагічных знаходак.



Зразумела, мы знаходзім, за рэдкім выключэннем, рэчы, якія трапілі ў зямлю ў сапсаваным выглядзе. У выпадку з посудам мы маем справу з чарапкамі. Шмат часу займае рэканструкцыя начыння, калі трэба сярод дзесяткаў і сотняў вельмі падобных кавалкаў адшукаць патрэбныя і скласці які-небудзь гаршчок ці міску. Праўда, для рэстаўрацыі дастаткова сабраць толькі адзін бок начыння, але абавязкова ад нізу да верху. Калі вядома дакладная вышыня і форма посуду, то няцяжка дарабіць недастаючыя часткі.

Керамічны посуд, знойдзены ў познясярэднявечных гарадах і мястэчках, можна падзяліць на тры вялікія групы: непаліваны, паліваны і мораны (ці дымлёны). Гэты падзел абапіраецца на асаблівасці абпалу і апрацоўкі паверхні начынняў. Мораны посуд у адрозненне ад непаліванага і паліванага абпальваўся ў закупораным горне без доступу паветра. Паліваны посуд пакрываўся тонкім слоем спецыяльнага рэчыва, якое называецца палівай. Гэта рабілася галоўным чынам для паляпшэння якасці вырабаў, каб сценкі не прапускалі вільгаці, каб гліняны пыл не дамешваўся да харчовых прадуктаў. Выкарыстоўвалі паліву і з мэтай аздаблення начынняў.



Па хатняму ўжытку посуд падзяляецца на кухонны (гаршкі, патэльні, макацёры) і сталовы (міскі, талеркі, кубкі, чаркі і інш.). Частыя знаходкі керамічнага посуду зрабілі яго асноўным датуючым матэрыялам[1] у археалогіі. Археолагі аддаюць шмат часу і намаганняў на даследаванне керамічнага матэрыялу і яго датаванне.

[1] *Датуючы матэрыял – рэчы з устаноўленым часам вырабу, па якіх датуюцца астатнія матэрыялы і самыя культурныя наслаенні.*

Калі сярод знаходак у слаях 14–17 ст. першае месца па колькасці займае керамічны посуд, то сярод посуду больш за ўсё непаліваных начынняў. Асноўную масу непаліванага посуду складаюць гаршкі. Менавіта яны найбольш прыдатныя на ролю датуючага матэрыялу, бо ў кожны больш-менш працяглы адрэзак часу гаршкам была ўласцівая свая асаблівая форма. Найбольш характэрная прыкмета для датавання – форма верхняй часткі посуду (венца). На вялікай тэрыторыі ў побыце выкарыстоўваліся



гаршкі з амаль аднолькавай формай. Такія-сякія нязначныя асаблівасці ў выраб мог унесці кожны майстар, але тыповыя формы былі традыцыйна агульнымі. Акрамя формы венца, датаваць гаршчок дапамагаюць форма тулава, склад глінянай масы, з якой зроблены посуд, характар апрацоўкі паверхні і г. д.

Застаецца толькі вызначыць, якія гаршкі характэрныя для розных часоў. Гэта вельмі складаная задача, бо багацце формаў стварае значныя цяжкасці.

*[2] Буйны калючы пясок, які ўтвараецца ад разбурэння горных пародаў.*

Гаршкі 14–16 ст. адрозніваюцца якасцю глінянай масы. Яны зробленыя з тлустай гліны з дамешкам жарствы[2] ці пяску. Абпал нераўнамерны і чарапок у разломе трохслойны – паверхні посуду абпалены якасней, чым сярэдзіна. Гаршкі 17 ст. вырабленыя з лепш перамешанай глінянай масы, абпал раўнамерны, разлом мае аднастайны чырванаваты колер. Значная частка знойдзеных гаршкоў не арнаментаваная. Сустракаюцца начынні, упрыгожаныя разнастайнымі ўзорамі ў выглядзе прамых і хвалістых ліній, ёсць камбінаваны арнамент.

У набор непаліванай керамікі з нашых раскопак уваходзяць, акрамя гаршкоў, макотры, рынкі, латкі, накрыўкі, міскі, талеркі, збаны, стопкі.

Макотры, інакш макацёры ці цёрлы, служылі для прыгатавання раслiннай ежы, замесу цеста, захавання сыпучых прадуктаў. Дыяметр іх дасягае звыш 30 см, а таўшчыня сценак 1 см і болей. Некаторыя макотры з вонкавага боку ўпрыгожваліся арнаментам з прамых або хвалістых ліній, часам замест ліній налепвалі валік з зашчыпамі, як у макацёра з Любчы. Некаторыя макотры арнаментаваліся хвалістымі лініямі прама па адагнутаму венчыку.

Рынкі – гэта патэльні на трох ножках і з ручкай у выглядзе ўтулкі. Ножкі прырабляліся, каб зручна і роўна паставіць патэльню на вуголлях. Дарэчы, вядомыя і знаходкі гаршкоў на ножках. У ручку рынкі можна было ўставіць драўляную рукаятку. Латкі – тыя ж патэльні толькі без ножак. Для гаршкоў і рынак выраблялiся накрыўкі. Некаторыя рабіліся са спецыяльнай ручкай, якую можна было выкарыстоўваць і ў якасці ножкі. Тады сама накрыўка пры патрэбе станавілася міскай. Значна радзей гаршкоў і макотраў сустракаюцца непаліваныя міскі, талеркі, збаны, кубкі. Яны часцей за ўсё рабіліся паліванымі ці моранымі.

Паліваны керамічны посуд у гарадах і мястэчках увайшоў ва ўжыванне з другой паловы 15 ст. Гэта вызначана на першых яго знаходках у культурных наслаеннях таго часу. Знаходкі паліванага посуду не такія шматлікія ў параўнанні з непаліваным. Гэта галоўным чынам гаршкі з ручкай, міскі, талеркі, кубкі, рынкі, збаны. Ужывалася паліва двух колераў: зялёнага і карычневага. Сустракаюцца разнастайныя адценні колеру. Яны залежалі ад хімічнага складу палівы. Якасць пакрыцця добрая, паліва не разбурылася нават пасля шматгадовага знаходжання ў зямлі, толькі ў некаторых начынняў яна адслойваецца, калі



трохі націснуць пальцам на сценку. У большасці выпадкаў паліва наносілася толькі на ўнутраную паверхню посуду, што пацвярджае яе утылітарную функцыю, гэта значыць, галоўнай мэтай была не прыгажосць, а лепшая якасць вырабаў. Абпал паліванага посуду раўнамерны, сценкі тонкія, добра адгладжаныя. Арнамент лінейны (з прамых ліній) і сетчаты (наносіўся спецыяльным штампам). З другой паловы 17 ст. вядомы паліхромны і распісны посуд з раслінным арнаментам.



Найбольш раннія знаходкі моранага посуду выяўлены ў культурных наслаеннях канца 16 – пачатку 17 ст. Праз спецыяльныя ўмовы абпалу без доступу кіслароду начынні набывалі цёмна-шэры, блізкі да чорнага колер.



Такую кераміку называюць яшчэ дымлёнай. Сценкі моранага посуду добра прагладжаныя, абпал раўнамерны па ўсёй іх таўшчыні. Часам бывае цяжка адрозніць моранае начынне ад закопчанага непаліванага. Дапамагае колер разлому чарапка. У дымлёнага посуду ён шэра-сталёвы.

Асартымент моранага посуду складаецца з гаршкоў, макотраў, місак, талерак, збаноў. Часта дымлёныя начынні ўпрыгожаныя глянцаваным арнаментам у выглядзе елачак, розных камбінацый прамых і хвалістых ліній. Такія ўзоры наносіліся спецыяльнай прыладай па ўжо гатоваму вырабу. Па этнаграфічных матэрыялах вядома, што для глянцавання ўжываўся крэмень.



У культурным слоі нашых гарадоў і мястэчак зрэдку сустракаецца керамічны посуд, прывезены з Заходняй Еўропы. Гэта, у асноўным, рэйнская кераміка – так званы «каменны тавар». Яна выраблялася ў нямецкіх землях з гліны, што здабывалася на берагах Рэйна. Пад час абпалу вырабы з гэтай гліны набывалі шчыльнасць і цвёрдасць каменя і вызначаліся высокай якасцю. Гэта забяспечыла каменнаму тавару збыт далёка за межамі Германіі.

Керамічны посуд з Міра, Ашмян, Гальшан, Любчы вельмі блізкі па формах і тэхналогіі вырабу да керамікі з іншых гарадоў і мястэчак Беларусі. Удалося вылучыць толькі адзін тып непаліваных гаршкоў 17 ст., які можна назваць спецыфічным для Ашмянаў і ваколіцы. Гэта начынні з закругленым, трохі патоўшчаным краем без венца. У некаторых з іх па закругленаму краю праходзіць невялікае паглыбленне, або выступ. Акрамя Ашмянаў, такія начынні характэрныя для мястэчак Гальшаны і Крэва, што размешчаныя непадалёк ад горада. Відавочна, мы маем справу з асаблівасцю вытворчасці посуду ў басейне буйнейшага прытока Нёмана – Віліі і басейне Беразіны.









Здзіўляе дасканаласць і ўвага да дэталяў у вырабах старажытных майстроў, рацыянальныя і адначасова прыгожыя формы керамічных начынняў. Уражвае менавіта спалучэнне рацыянальнай і мастацкай дасканаласці. Узяць, напрыклад, гаршкі. Яны ўмяшчальныя, пузатыя, але адначасова зграбныя, прапарцыянальныя. Горла дастаткова шырокае, каб зручна было ўкладаць і вымаць, але не настолькі, каб стаць непрыгожым. Тое самае і з дном. Абрысы посуду здаюцца такімі натуральнымі і адзіна магчымымі, што проста не ўяўляеш, як можна зрабіць іх інакш.

Задумацца аб агромністай працы многіх пакаленняў ганчароў, у выніку якой знойдзеныя такія простыя і адначасова дасканалыя формы, дапамог выпадак. Мы вялі даследаванні ў Мазыры. Частым госцем на раскопе быў мясцовы мастак-кераміст. Ён цікавіўся сярэднявечным посудам і аднойчы з нашых слоў зрабіў рынку. Калі мы параўналі яе са старажытнай знаходкай, то кінулася ў вочы, наколькі сучасны выраб уступае даўнейшаму па прапорцыях. А рабіў копію майстар высокай кваліфікацыі.

На жаль, традыцыі народнага ганчарства – аднаго са старажытнейшых рамёстваў – на Беларусі амаль цалкам страчаны, і невядома, ці ўдасца іх аднавіць.

## КАФЛЯ

Кафляныя вырабы бадай што самыя цікавыя са звычайных рэчаў, якія трапляюцца пры раскопках. Вызначыць час іх вырабу даволі лёгка, таму сама кафля добры датуючы матэрыял для другіх рэчаў, знойдзеных разам з ёй. Акрамя гістарычнай каштоўнасці, старажытныя кафляныя вырабы выклікаюць зацікаўленасць як творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Вельмі цікава рабочым-землякопам (а гэта, у асноўным, школьнікі і студэнты) пад час раскопак даставаць з зямлі кафліны з разнастайнымі выявамі раслін, звяроў, людзей.

Такія знаходкі часам здзіўляюць і саміх археолагаў, як, напрыклад, было са мной у Любчы, калі з толькі што ачышчанай ад зямлі кафліны раптам глянула шырока расчыненае вока нейкага таўсташчокага і вусатага дзецюка. Таленавіты майстар-разьбяр 17 ст. стварыў тыповы вобраз ганаровага шляхцюка.

Мала хто ведае, што самая старажытная кафля вельмі падобна на гаршчок. Яна з’явілася на Беларусі ў 14 ст. і з-за свайго падабенства на вядомае ўсім начынне называецца гаршковай.

Падабенства настолькі вялікае, што яшчэ 30–40 гадоў назад археолагі лічылі гэтыя кафліны посудам. У нашыя землі кафля прыйшла з Заходняй Еўропы, дзе вядома з другой паловы 13 ст. Беларускае слова «кафля» паходзіць ад нямецкага «Kachel». Відавочна, першымі кафлямі былі гаршкі. На жаль, немагчыма ўстанавіць, якому разумнаму чалавеку прыйшло ў галаву ўмуроўваць іх у глінянае тулава печы. Аднак практычная выгода ад такой канструкцыі яўная – гаршкі, устаўленыя ў печ донцам уніз, вусцем вонкі, выконвалі ролю своеасаблівага калярыфера – нагнятальніка цёплага паветра з печы ў памяшканне.





Самыя раннія кафліны з Беларусі адносяцца да пачатку 14 ст. Яны знойдзеныя ў Наваградку, Полацку, Лідскім замку і ўяўляюць сабой цыліндры вышынёй 24–26 см, зробленыя з грубага гліністага цеста з дамешкам буйной жарствы.

Людзі ва ўсе часы дбалі не толькі аб практычнай выгодзе, але і пра прыгажосць. Майстры-кафляры пачалі свае вырабы аздабляць. Гэта рабілася шляхам фігурнага афармлення верхавіны кафлі – вусце набывала выгляд трох- ці чатырохпялёсткавай разеткі. Такія кафліны з'явіліся ў нас ужо ў сярэдзіне 14 ст. і ўжываліся да канца 15 ст.

У Полацку знойдзена кафля, у якой кветка з пялёсткамі размешчана на ўнутранай паверхні донца. З канца 14 ст. пачалі вырабляць кафліны з прамавугольным або квадратным вусцем. Яны былі больш выгоднымі, бо з такіх кафлін можна выкласці значна большую па плошчы цеплавую паверхню.

Нарэшце, спецыяльна для размяшчэння арнаменту прыдумалі вонкавую пласціну, і кафля набыла звыклы для нас выгляд. Даследчыкі ўстанавілі, што на Беларусі гэта адбылося на мяжы 14 і 15 ст., але нам такая кафля да гэтага часу не траплялася. Называецца кафля з вонкавай пласцінай карабковай. Вонкавая пласціна не пагаршала рабочыя вартасці вырабу, а камбінацыя кафлін з разнастайнымі ўзорамі ператварала печ у закончаны твор мастацтва. Пласціна выраблялася асобна ад ніжняй часткі кафлі – румпы.

Арнамент атрымліваўся выпукларэльефным (у 15–16 ст. разам з выпуклым ужываўся паглыблены рэльеф). Пласціна адціскалася ў форме, зробленай з дрэва або гліны, затым прымацоўвалася румпа, сфармаваная на ганчарным коле. Для замацавання кафлі на печы з дапамогай дроту, у румпе рабілі дзве адтуліны. Форму, у якой адціскалася вонкавая пласціна, выразалі кваліфікаваныя майстры-разьбяры. Трэба адзначыць, што гаршковая кафля ўжывалася побач з карабковай яшчэ ў 16 і нават у 17 ст.













Найбольш раннія знаходкі карабковай кафлі ў Панямонні датуюцца канцом 15–16 ст. Кафля гэтага часу мае квадратную вонкавую пласціну (17х17 см) з высокай рамкай па краях. Румпа ў іх высокая, квадратная. У 16 ст. узнікла некалькі відаў арнаменту, якія існавалі і ў пазнейшыя часы, напрыклад, выява вазы з кветкамі. Быў распаўсюджаны раслінны арнамент, а таксама геаметрычны. У першай палове 16 ст. у вытворчасці беларускай кафлі пачала ўжывацца паліва зялёнага колеру. З дапамогай знаходкі кафліны з датай (археолаг Алег Трусаў) устаноўлена, што паліхромную кафлю ў нас выраблялі ўжо ў 80-х гадах 16 ст.

Сапраўдны росквіт кафлярскай. справы. прыйшоўся на 17 ст. Выраблялася тэракотавая, зялёная паліваная, паліхромная кафля. Апошняя была самай дарагой, для яе вытворчасці ўжываліся зялёная, белая, сіняя, жоўтая, карычневая палівы. Печы са шматколернай кафлі станавіліся каштоўным аздабленнем жылога памяшкання ці параднай залы. Мець такія печы маглі толькі вельмі багатыя людзі. Напрыклад, у Міры, старажытным паселішчы рамеснікаў і гандляроў, знойдзены ўсяго два невялікія фрагменты паліхромнай кафлі 17 ст. А побач, у Мірскім замку – адной з рэзідэнцый князёў Радзівілаў, знаходкі такіх кафлін лічацца сотнямі.

Кафля ўпрыгожвалася разнастайным арнаментам. Найбольш распаўсюджаным быў раслінны. Акрамя таго, наносілі геаметрычныя (разнастайныя лініі, ромбікі, квадраты), зааморфныя (выявы жывёл), геральдычныя (выявы шляхецкіх і дзяржаўных гербаў), партрэтныя, сюжэтныя (розныя маляўнічыя і міфалагічныя сцэны) узоры. З расліннага арнаменту найбольш часта сустракаецца сіметрычная выява стылізаваных галін, сцяблін, кветак. На кафлях з геральдычным арнаментам звычайна ёсць літары: ініцыялы і загалоўныя літары тытула ўладальніка герба. Часам у ніжняй частцы пласціны размешчана дата вырабу. Вонкавая пласціна кафлін 17 ст. прамавугольная, па краях акружана адзінарнай або падвойнай рамкай.

У сярэдзіне 17 ст. з’явілася кафля без рамкі з так званым «дывановым» арнаментам, калі адна кафліна ўтрымлівала толькі частку ўзору, а закончаны малюнак складваўся з чатырох кафлінаў.

У 18 ст. распаўсюдзілася распісная кафля, мода на якую пайшла з Галандыі. У гэты час пачалі вырабляць кафлю з гладкай вонкавай пласцінай без арнаменту. У некаторых старых дамах да нашага часу захаваліся кафляныя печы канца 19 – пачатку 20 ст. з рэльефным арнаментам, але ён ужо не такі багаты, як у сярэднявеччы.

У адпаведнасці з месцам, якое кафліны займаюць на тулаве печы, яны падзяляюцца на сцянныя, гзымсавыя, кутнія, паясковыя, каронкі, перамычкі, кафлі-медальёны, дахоўкі і макаўкі. Знешні выгляд печаў змяняўся паступова. З'яўленне каронак (14–15 ст.), гзымсавых і кутніх кафлін (сярэдзіна – другая палова 16 ст.) звязана з ускладненнем формы печаў. Кафліны-медальёны мацаваліся ў цэнтры печы, а магчыма, вешаліся на сценах для аздаблення памяшкання. Выраблялася кафля з добра прамешанага цеста, якое пасля абпалу набывала чырвоны колер.

Кафляныя печы атрымалі вельмі шырокае распаўсюджанне ва ўсіх мясцінах Беларусі. Да 19 ст. іх можна было сустрэць усюды: ад сялянскай хаты да палаца магната. Праўда, знешні выгляд печак моцна розніўся. Сціпла аздобленыя печы простых людзей не ішлі ні ў якое параўнанне з шыкоўнымі «шмат'яруснымі» паліхромнымі печамі магнатаў, зробленых адпаведна апошняй модзе. Каб задаволіць вялікі попыт на кафлю, патрэбна была арганізацыя масавай вытворчасці.

Археалагічныя знаходкі сведчаць аб дзейнасці кафляроў у многіх гарадах і мястэчках. Часта мы знаходзім кафліны, зробленыя ў адной форме, прычым адныя з іх тэракотавыя, а другія паліваныя ці паліхромныя. Знаходка ў Гальшанах фрагмента формы для вырабу вонкавай пласціны гаворыць на карысць існавання кафлявай вытворчасці і ў гэтым мястэчку.



Ва ўсіх нашых паселішчах, акрамя Любчы, знойдзена як карабковая, так і гаршковая кафля. У Любчы, па ўсёй верагоднасці, гаршковая кафля не выяўленая па прычыне невялікага аб'ёму працаў. У Міры, акрамя кафлін з найбольш распаўсюджаным арнаментам (сіметрычны ўзор у выглядзе кветак, сцяблін, галін і інш.), адкапаныя кафліны з узорам у выглядзе фантастычных жывёлін, ільвоў, рыбы, са стылізаваным геральдычным арнаментам. Нярэдка сустракаюцца выявы арла – радавога знака ўладальнікаў Міра князёў Радзівілаў – буйнейшых магнатаў не толькі Беларусі, але і ўсяго Вялікага Княства. У Любчы (у 17 ст. таксама радзівілаўская вотчына) знойдзеныя падобныя выявы.

У калекцыі любчанскай кафлі, акрамя партрэта-медальёна, цікавасць выклікаюць кафліны з дывановым арнаментам другой паловы – канца 17 ст.: у куце вонкавай пласціны размешчаная выява кветкі з тонкімі пялёсткамі. На адной кафлі маецца толькі чвэрць малюнка. Каб атрымаць поўную выяву, патрэбна скласці чатыры такія кафліны.

У Ашмянах знойдзены рэдкі тып пячной каронкі другой паловы 16 ст., пакрытай зялёнай палівай. Форма яе напамінае застыўшыя язычкі полымя. Яшчэ да пачатку раскопак у Старых Ашмянах на агародзе прама на паверхні зямлі знайшлі кавалак кафліны з выявай чалавека ў поўны рост. У Бярозаўцы былі знойдзены і кафліны-дахоўкі канца 16 – пачатку 17 ст. з лускавым узорам.

Мы спадзяёмся, што людзі яшчэ ўспомняць пра хараство і зручнасць кафляных печак. Дарэчы, гэта ўжо адбываецца ў Еўропе, у прыватнасці, на нямецкіх землях, адкуль прыйшла да нас кафля. У ФРГ нават выпушчаная кніга «Зрабі сам кафляную печ», у якой даюцца падрабязныя рэкамендацыі па вырабу кафлі ў хатніх умовах. Даволі проста ажыццявіць прамысловы выпуск арнаментаванай кафлі. Яе можна з поспехам выкарыстаць у гарадскіх дамах з цэнтральным ацяпленнем. Калі рабрыстыя ацяпляльныя батарэі, якія не вызначаюцца асаблівай эстэтычнай каштоўнасцю, пакрыць кафлінамі з рознымі ўзорамі, то атрымаецца невялікая печка – сапраўднае ўпрыгожанне нашага дома.

Няма неабходнасці ў пошуках арнаментальных сюжэтаў. Археолагі могуць прапанаваць прамысловасці дзесяткі відаў арнаментаў, распрацаваных старажытнымі майстрамі і апрабаваных на працягу некалькіх стагоддзяў. Яны добра падыдуць да любога інтэр'еру.

## БУДАЎНІЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, ХАТНІЯ РЭЧЫ

У часы позняга сярэднявечча ў гарадах і мястэчках Беларусі шырокае распаўсюджанне набыло мураванае будаўніцтва. Адпаведна, значна павялічыўся выпуск будаўнічых матэрыялаў. Цэглу ўжывалі, галоўным чынам, для збудавання замкаў, цэркваў, касцёлаў, ратушаў, гарадскіх брам. Праўда, большая частка жылых пабудоў рабілася з дрэва. Па валочнай памеры такога буйнога горада, як Гародня, складзенай у 1560 г., мы налічылі ўсяго 9 мураваных жылых будынкаў. У той жа час у горадзе быў мураваны замак, ратуша, карчма, 6 цэркваў і 2 касцёлы. Знаходкі будаўнічых матэрыялаў (цэглы, дахоўкі, плітак падлогі) – частая з'ява ў гарадскіх і местачковых культурных наслаеннях позняга сярэднявечча. Асабліва многа іх у слаях канца 16–17 ст. А пад час раскопак на тэрыторыі мураваных замкаў рэшткі будаўнічых матэрыялаў сустракаюцца часцей, чым керамічны посуд.

Датаванне старажытных будаўнічых матэрыялаў падрабязна распрацавана археолагам Алегам Трусавым. У выніку знаходкі цэглы, дахоўкі, таксама як і кафлі і керамікі, дапамагаюць датаваць іншыя рэчы. Фармат цэглы не быў пастаянным, для кожнага гістарычнага перыяду характэрны свае памеры. Калі ў 11–12 ст. шырока ўжывалася плінфа (тонкая і шырокая цэгла), то ўжо ў 13 ст. з'яўляецца вялікапамерная цэгла. Доўгі час, аж да 18 ст., на адным з шырокіх бакоў цэглы праводзіліся паглыбленыя барозны – гэта таксама прыкмета старажытнасці вырабу.

Найбольш старажытныя формы беларускай дахоўкі, знойдзеныя ў Лідскім і Навагрудскім замках, адносяцца да канца 14 – пачатку 15 ст. Яны ўяўляюць сабой паўцыліндрычны жолаб з высокім мацавальным шыпам. У 15 ст. на змену жалобчатай прыходзіць плоская дахоўка. Жалобчатая выкарыстоўвалася толькі для пакрыцця сутыкаў і вуглоў даху. Плоская дахоўка была асноўным матэрыялам для пакрыцця даху і на працягу 16–17 ст. На мяжы 17–18 ст. з'явілася хвалістая дахоўка. Семнаццатым стагоддзем датуюцца знаходкі керамічных плітак падлогі. Ужываліся як тэракотавыя, так і пакрытыя зялёнай, карычневай палівай пліткі розных формаў: чатырохвугольныя, квадратныя, крыжападобныя, зоркападобныя.

Значна радзей, чым посуд, кафля, будаўнічыя матэрыялы ў культурным слоі 14–17 ст. сустракаюцца такія керамічныя вырабы, як рыбалоўныя грузікі, падсвечнікі, люлькі.

Падсвечнікі рабіліся на адну, дзве або тры свечкі. Ножкі ў іх высокія і даволі тонкія, каб пад час пераноскі ямчэй брацца.

Люлькі пачынаюць сустракацца ў наслаеннях канца 16 – пачатку 17 ст. У гэтыя часы на Беларусі стаў вядомы тытунь. Люлькі багата арнаментаваліся, пакрываліся зялёнай, карычневай, жоўтай палівай. Ёсць мораныя экзэмпляры цёмнага колеру. У верхнюю адтуліну закладвалася порцыя тытуню, у бакавую, меншую па дыяметру, устаўлялася драўляная ці касцяная дэталь – цыбук. Формай і матэрыялам ад мясцовых вырабаў адрозніваюцца прывазныя галандскія люлькі. Яны маюць спецыяльную ножку, каб люльку можна было паставіць на стол ці якую іншую роўную паверхню. Вырабляліся гэтыя люлькі з белай гліны.

## ВЫРАБЫ З МЕТАЛУ

Вырабы з жалеза ў сярэднявеччы займалі (і займаюць зараз) галоўнае месца сярод прыладаў працы. Уласна кажучы, археалагічны тэрмін «жалезны век» цалкам падыходзіць да сярэднявечнага, а таксама новага і навейшага часу. Акрамя прыладаў працы, у сярэднявеччы з чорнага і каляровага металаў вырабляліся зброя, упрыгожанні, рэчы, неабходныя ў побыце. Каштоўныя металы выкарыстоўваліся як грошы.

На жаль, металічныя вырабы ў культурным слоі захоўваюцца намнога горш, чым кераміка. Часта каразійныя наросты дэфармуюць рэч настолькі, што цяжка вызначыць яе прызначэнне. У такіх выпадках даводзіцца шмат часу траціць на расчыстку вырабаў і іх кансервацыю (спыненне карозіі).

Колькасць металічных рэчаў 14–17 ст., здабытых пад час раскопак беларускіх гарадоў і мястэчак, з кожным годам узрастае, але, на жаль, навуковых прац ім прысвечана вельмі мала. Даследчыкі звычайна прыводзяць шырокае датаванне вырабаў з металу – 14–17 ст., значна радзей – 16–17 ст. Цяпер высветлілася, што з дапамогай дадзеных стратыграфіі і аналагаў з суседніх тэрыторый можна датаваць іх больш дакладна. У калекцыю выкапнёвых металічных вырабаў уваходзяць прылады працы, рэчы з побыту, зброя, рыштунак конніка і каня. Гэта нажы, сякеры, цвікі, замкі, ключы, нажніцы, відэльцы, пражкі, крэсіва, абутковыя падкоўкі, наканечнікі стрэл, шпоры і г. д.





Найчасцей трапляюцца цвікі. У залежнасці ад прызначэння, іх падзяляюць на будаўнічыя, мацавальныя, шпалерныя, абутковыя і падкоўныя. Усе яны ў сячэнні квадратныя або прамавугольныя. Памеры будаўніча-мацавальных цвікоў моцна вагаюцца, даўжыня можа быць ад 4 да 12–13 і болей сантыметраў, сячэнне стрыжня – 0,3–1 см. Плешка вялікая, круглая. Такі цвік можна адрозніць ад сучаснага з першага погляду. Намнога меншыя памеры ў шпалерных (імі мацавалася фурнітура, скураныя ўпрыгожанні і інш. ), а таксама ў абутковых і падкоўных. Апошнія нярэдка знаходзяць разам з падковамі. Увогуле, цвікі цяжка датаваць, таму што і ў 10–13 і ў 14–17 ст. яны былі амаль аднолькавымі.

Познясярэднявечныя замкі́ падзяляюцца на дзве групы: вісячыя і ўнутраныя. Да 15 ст. у Беларускім Панямонні бытавалі вісячыя замкі цыліндрычнага тыпу. Яны замыкаліся без ключа, патрэбна было проста ўставіць дужку ў гняздо, а адмыкаліся з дапамогай спецыяльнага ключа, які сціскаў спружынкі і вызваляў дужку. Такая канструкцыя была шырока распаўсюджаная ў 10–13 ст. З 15 ст. пачалі ўжывацца замкі, падобныя на сучасныя, з паўкруглай дужкай, якая свабодна адкідваецца. Корпус у іх мае выгляд конуса, шара ці прызмы. Ключы ад гэтых замкоў таксама падобныя на сучасныя. Каб адкрыць унутраны замок, патрэбна было адсунуць засаўку, часта даволі масіўную. Таму для гэтай справы ўжываліся вялікія ключы.



Нажы таксама падзяляюцца на два тыпы: чаранковыя і з прыкляпанымі тронкамі. Аднαчасова ўжываліся нажы абодвух тыпаў, але перавагу ў познім сярэднявеччы мелі тыя, што з тронкам. Адзін такі нож з Лідскага замка выдзяляецца незвычайна вялікімі памерамі. Луска, прыліпшая да яго ляза, падказала, што ён выкарыстоўваўся для трыбушэння рыбы.

Крэсіва – спецыяльная прылада для здабывання агню. Ёй наносіўся ўдар па крэменю, каб атрымаць іскры. Формы крэсіваў маглі быць рознымі. Сярод нашых знаходак былі найчасцей авальныя, радзей – складанай канфігурацыі крэсівы.

Нажніцы па прынцыпу дзеяння падзяляюцца на спружынныя і шарнірныя. Канструкцыя і форма спружынных нажніц з даўніх часоў амаль не змянілася. Лічыцца, што вялікія нажніцы такога тыпу, даўжынёй да 20 см, выкарыстоўваліся для стрыжкі авечак, раскрою тканіны, а маленькія, да 10 см даўжынёй, – прылада цырульніка. У шарнірных, звыклых у нашым побыце нажніц, рукаятачныя стрыжні заканчваюцца кольцам. Па яго канструкцыі можна вызначыць датаванне вырабу. У найбольш старых нажніц кольцы не суцэльныя, а ўяўляюць сабой загнутую скабу. Нажніцы з суцэльным зварным кольцам з’яўляюцца ў нас у 14–15 ст.

Добрым датуючым матэрыялам для познясярэднявечных помнікаў служаць абутковыя падкоўкі. У познім сярэднявеччы ўжываліся, галоўным чынам, падкоўкі, якія мацаваліся да абцаса з дапамогай шыпоў. Мода на абцасы мянялася, але вузкія і шырокія, нізкія і высокія абцасы ад хуткага зносу засцерагаліся амаль аднолькавымі, падагнанымі пад абцас падкоўкамі. Найбольш раннія экзэмпляры такіх вырабаў уяўляюць сабой сагнутую дугой вузкую і высокую пласцінку з трыма шыпамі.

По раскопках старажытнага Ноўгарада яны вядомыя ў слаях, пачынаючы з 14–15 ст. Нашыя звесткі паказваюць, што ў Беларусі, у прыватнасці ў Панямонні, высокія падкоўкі пачалі ўжывацца ў 15–16 ст. Па ўсёй верагоднасці, даволі значная вышыня падковак абумоўленая хуткім зносам. Вырабляліся яны з мяккага жалеза, таму доўга служыць не маглі.



Мы часта знаходзім падкоўкі, сярэдзіна якіх сцёртая ледзь не на ўсю вышыню. Пастаянная нагрузка на абцас прыводзіла да таго, што шыпы разгойдваліся, і падкоўкі губляліся Сведчанне гэтаму – знаходкі ў культурным слоі цэлых амаль не ношаных экзэмпляраў.

З часам форма абутковых падковак змянялася – памяншалася вышыня і павялічвалася шырыня. У 17 ст. ужываліся і плоскія падкоўкі з шыпамі. Нарэшце, у слаях канца 17–18 ст. знаходзім плоскія падкоўкі без шыпоў, якія мацаваліся да абцаса цвікамі. У Гальшанах у слоі 18 – 19 ст. знойдзена падэшва бота якраз з такой падкоўкай.

Наканечнікі арбалетных стрэлаў – частая знаходка ў замках, асабліва такіх баявых, як Гарадзенскі, Лідскі, Навагрудскі, Крэўскі, якія ў 14 ст. стварылі трывалую заслону крыжацкім набегам. Цікава, што ў Мірскім замку, збудаваным у канцы 15 – пачатку 16 ст. або ў Гальшанскім, Любчанскім замках 16 ст., не знойдзена ні аднаго наканечніка ад арбалетнай стралы. Да гэтага часу арбалеты ўжо выйшлі з шырокага ўжытку. У 14–15 ст., яны ўжываліся, галоўным чынам, пад час аблогі і абароны гарадоў.

Па спосабу мацавання да дрэўца стралы наканечнікі падзяляюцца на ўтулкавыя і чаранковыя. Прызначаліся арбалетныя стрэлы (па старому «балты») для паражэння ворага, закрытага бранёй. Каб надаць страле сілу для прабіцця сталёвага даспеху, патрэбна было выпускаць яе са страшэннай хуткасцю. Гэта забяспечвала канструкцыя арбалета. Для ўзмацнення бранябойнай сілы наканечнікі рабіліся вялікімі – даўжынёй да 16 см, шырынёй да 3 см і цяжкімі – вагой да 200 г, з гранёнымі галоўкамі.



У Лідскім замку пад час раскопак знойдзены конскі чэрап, у якім тырчаў наканечнік арбалетнай стралы, загнаны ў косць амаль на ўсю даўжыню. Зрэдку трапляюцца дэталі арбалета. Так, у Гарадзенскім замку знойдзены так званы «арэх» – асноўная дэталь спускавога прыстасавання.



У Лідскім замку выяўлена адна рэч, з дапамогай якой, па нашаму меркаванню, нацягвалася арбалетная цецiва. Гэта невялікі крук, які праз спецыяльныя заклёпкі мацаваўся да скуранога пояса. Больш зручным для такой справы быў двайны крук, але даследчыкі ўстанавілі, што ўжываўся і адзінарны, падобны лідскаму.

Працэс нацягвання цецівы ў 14 ст. адбываўся так: стралок устаўляў нагу ў спецыяльнае стрэмя на канцы арбалета, чапляў паясным крукам за цеціву, пры гэтым ён нахіляўся ўперад. Затым выпрамляўся, пакуль цеціва не трапляла ў паз на арэху. Накладвалася страла, і зброя была гатовая да стрэлу. Пазней быў вынайдзены больш дасканалы механізм нацягвання цецівы з дапамогай калаварота. Недахопам арбалета была невялікая ў параўнанні з лукам хуткасць стралянія. Спрактыкаваны лучнік мог выпусціць у 3–4 разы больш стрэл, чым арбалетчык за той жа час. Болт па сіле ўдару пераўзыходзіў звычайную стралу, але значна ўступаў ёй па даўжыні палёту.

Наканечнікі стрэлаў для лука адрозніваюцца ад арбалетных памерамі, вагой і формай. Яны меншыя, больш плоскія і лягчэйшыя. Вось як, напрыклад, знойдзеныя ў Старых Ашмянах, або наканечнікі 16–17 ст. з Лідскага замка. Маскоўскім даследчыкам Аляксандрам Мядзведзевым распрацаваная падрабязная класіфікацыя наканечнікаў стрэлаў 8–14 ст. для Усходняй Еўропы. Ашмянская знаходка па гэтай класіфікацыі належыць да 14-га тыпу чаранковых наканечнікаў.



Шпоры ў слаях 14–17 ст. – даволі рэдкая знаходка. У гэтыя часы на Беларусі карысталіся выключна шпорамі з кольцамі, хаця раней на іх месцы мацаваўся востры шып. Карыстацца шыпам было нязручна, бо каб пусціць шпору ўдзеянне, трэба было ставіць стапу нагі амаль пад прамым вуглом да бока каня. Кольца ўжываць намнога зручней і, з'явіўшыся на нашых землях у 13 ст., яно хутка выцесніла шып. У розныя часы кольца мела розную колькасць зубцоў. Устаноўлена, што да 14 ст. рабілі кольца з 4 шыпамі, а ў 15 ст. і пазней – іх было ўжо 6–8 штук. Да бота шпора прывязвалася раменьчыкамі, для мацавання якіх на канцах дужак шпоры рабіліся адтуліны. Калі, акрамя конніка, пачалі надзяваць даспехі і на каня, спатрэбіліся вельмі доўгія шпоры, такія, напрыклад, як знойдзеныя ў Лідскім замку.



Там, дзе знаходзяць шпоры, з такім жа поспехам могуць трапіцца падковы. Большасць знойдзеных падкоў падобны на сучасныя, форма ў іх авальная, шырыня дугі памяншаецца да канцоў. Паміж сабой яны адрозніваюцца не толькі памерамі, але і некаторымі канструкцыйнымі дэталямі. У адных на канцах маюцца выступы, у другіх – дзіркі, у адных пасярэдзіне дугі выступае паўкруглая тонкая дзюбка, у другіх яе няма. Многія падковы знаходзяць разам з падкоўнымі цвікамі. Гэта значыць, яны былі ўжо выкарыстаныя і трапілі ў слой непасрэдна з капыта. Цікавы экзэмпляр знойдзены ў Міры ў слаях 15–16 ст. Мірская падкова меншая за іншыя, ёй можна было падкаваць толькі пярэднюю частку капыта.



Нярэдка ў познясярэднявечным слоі сустракаюцца манеты. Найчасцей трапляюцца медныя солiды Яна Казіміра. Масавы выпуск солідаў пачаўся па загаду гэтага караля Рэчы Паспалітай у канцы 1659 г. Кошт іх быў невялікі, але паколькі выпусцілі солідаў вельмі многа, то для нас яны каштоўны як датаваны матэрыял, бо на кожнай манеце стаіць дата вырабу. Намнога радзей асобных манет археолагам трапляюць скарбы.



Некаторыя вырабы з металу з Беларускага Панямоння вядомыя ў адзінкавых экзэмплярах. У слаях канца 16–17 ст. у Лідскім (1) і Мірскім (3) замках знойдзены відэльцы з двума доўгімі зубамі. Да 16 ст. адносіцца варган – старажытны музычны інструмент, адкапаны ў Лідскім замку. Па форме гэта колбападобны стрыжань з язычком пасярэдзіне. Каб карыстацца варганам, яго бралі ў рот і пальцамі кранали за язычок. Ролю рэзанатара выконвала поласць рота. У выніку можна было атрымліваць кароткія або працяглыя меладычныя гукі.





16–17 ст. датуецца аднаражковы падсвечнік з Лідскага замка і фрагмент скрабніцы для чысткі каня. Да больш ранняга перыяду (14–15 ст.) належыць рыбалоўны кручок – блясна – таксама з Ліды. Цікавая і рэдкая знаходка з Лідскага замка – медыцынскі інструмент – прыстасаванне для пускання крыві.



Гарадзенскія школьнікі аднойчы прынеслі ў музей рэч незвычайнай формы, прызначэння якой яны не ведалі. Так нам у рукі трапіла рэдкая зброя – алебарда другой паловы 16 ст. Яна цудоўна захавалася. Высветлілася, што яе знайшлі ў рачным пяску, выкінутым на бераг Нёмана земснарадам. Цяпер, дзякуючы школьнікам, у Гарадзенскім гісторыка-археалагічным музеі з'явіўся новы каштоўны экспанат.



Пад час агляду рэштак познясярэднявечнага паселішча каля вёскі Бярозавец Карэліцкага раёна Гарадзенскай вобласці знойдзена прылада для адлівання куляў. Паколькі разам з кулялейкай выяўлены фрагменты кафлі другой паловы 16 ст., то яе таксама аднеслі да гэтага часу. Кулялейка зробленая па прынцыпу абцугоў і калі свінец, заліты ў формачку, астываў, яна раскрывалася і гатовая куля выпадала. Адліваць кулі ў такой прыладзе – даволі марудная справа, але яны былі аднолькавымі па памеры, а значыць, і зручнымі для стральбы. Старажытныя вырабы з металу пасля аднаўлення і кансервацыі займаюць сваё месца сярод іншых рэчаў у археалагічных экспазіцыях музеяў.



## ВЫРАБЫ СА ШКЛА

У побыце сярэднявечнага гараджаніна, як і местачкоўца, знаходзілі пастаянны ўжытак разнастайныя вырабы са шкла. Гэта, галоўным чынам, посуд: шкляніцы, стопкі, чаркі, келіхі, бутлі, кварты, біклагі, слоікі, а таксама аконнае шкло і ўпрыгожанні. Асноўны попыт на шкляныя вырабы забяспечвалі мясцовыя майстэрні – гуты. У замках феадалаў знойдзены імпартны посуд, у прыватнасці, прывезены з Венецыі. Мясцовы посуд выпрабляўся з бясколернага або зеленаватага шкла. Прыкметай старажытнасці вырабу з'яўляецца цёмны або каляровы налёт – паціна, які лёгка адлушчваецца. Наяўнасць на донцы посуду незашліфаванага следу ад понціі – палкі, на якой трымалі выраб пад час фармавання, таксама дапамагае адрозніць сярэднявечны выраб ад больш позняга.



У 16–18 ст. ужываліся цыліндрычныя шкляніцы, зробленыя з бясколернага шкла, якія вакол донца ўпрыгожваліся хвалістым наляпным пасам. У Лідскім замку знойдзены шкляніцы з двайным і нават з трайным пасам. 16–17 ст. датуюцца цыліндрычныя шкляніцы на цыліндрычным жа паддоне. Край у паддона плаўна адагнуты вонкі.



Келіхі выпрабляліся з бясколернага шкла з зеленаватым адценнем. Яны адрозніваюцца адзін ад другога па формах ножак і ступакоў. Радзей сустракаюцца келішкі. Чаркі характарызуюцца тоўстымі сценкамі і масіўнымі донцамі. Тулава ў іх цыліндрычнае або злёгку звужваецца да донца. Найбольшае распаўсюджванне яны атрымалі ў 17 ст. Сустракаюцца чаркі, сценкі якіх дэкараваныя вертыкальнымі рэбрамі. Адна з разнавіднасцяў гэтага посуду мае тонкае плаўна ўвагнутае донца.



Кварты па форме і матэрыялу, з якога зробленыя, падзяляюцца на два віды. Агульная ў іх толькі форма корпуса. Ён у плане прамавугольны і завяршаецца пакатымі акругленымі плечыкамі, якія пераходзяць у горла з кароткай шыйкай і нядбайна апрацаваным вусцем. Першыя выпрабляліся з тоўстага зялёнага неасветленага шкла, вуглы сценак у іх вострыя. У кварт другога віду, зробленых з тонкага асветленага шкла, зеленаватага і жаўтаватага адценняў, дно злёгку ўвагнутае ў сярэдзіну, а вуглы сценак скругленыя. Абодва віды былі ва ўжытку прыблізна ў адзін і той жа час – 16–18 ст.

У гарадскім пасёлку Мір, Мірскім і Гальшанскім замках у слаях 17 ст. знойдзены фрагменты бутляў – вялікіх начынняў з шырокім горлам і кароткай шыйкай. Рэдка сустракаюцца ў культурным слоі шкляныя флаконы, міскі. У старажытных беларускіх

гарадах у наслаеннях 14 ст. трапляюцца кавалкі шкляных бранзалетаў. Гэтае ўпрыгожанне было шырока распаўсюджанае ў ранейшыя часы, але ўжо ў канцы 13–14 ст. выйшла з ужытку. У слаях 17–18 ст. часта трапляюцца кавалкі аконнага шкла. Шыбы выраблялiся круглымi або прамавугольнымi. Рознакаляровае шкло ўжывалася для вытворчасцi пацерак. Несумненна, што праз вывучэнне старажытнага шкла шмат цiкавай для сябе iнфармацыi могуць здабыць i сучасныя шкларобы.

## КАМЕННЫЯ I КАСЦЯНЫЯ ВЫРАБЫ

Каменныя тачыльныя брускi – звычайная знаходка ў слаях 14–17 ст. Многiя з iх доўгi час былi ў справе i таму моцна сцёртыя. Часцей за ўсё форма iх прамавугольная, часам абодва канцы скругленыя. Знойдзены экзэмпляры з адтулiнамi для падвешвання.

Каменныя ядры – знаходкi, характэрныя для старажытных замкаў. Яны былi знойдзеныя ў слаях 14–15 ст. на такiх помнiках, як Лiдскi, Наваградскi, Гарадзенскi замкi. Паверхня ядраў добра апрацаваная, форма ў большасцi выпадкаў блiзкая да правiльнага шара, памеры самыя розныя. Нам траплялiся экзэмпляры дыяметрам ад 6 да 40 см. Выкарыстоўвалiся ядры, галоўным чынам, для шпурляння з каменекiдальных машын пад час аблогi ўмацаваных паселiшчаў. Невыпадкова верхняя хparty храналагiчная мяжа актыўнага выкарыстання каменных ядраў прыпадае на канец 15 ст. У 16 ст. асноўную ролю пад час аблогi ўмацаваных гарадоў i замкаў пачалi выконваць гарматы, а каменекiдальныя машыны адышлi ў мiнулае. Каменныя ядры малых памераў маглi выкарыстоўваць i для стральбы з гарматаў.

У беларускiх лясах i пушчах заўсёды было шмат дзiкiх звяроў, на якiх многа i паспяхова палявалi нашыя продкi. Праз вывучэнне дадзеных раскопак у Гарадзенскiм замку стала вядома, што паляванне было адным з асноўных заняткаў яго жыхароў. Нават у старажытным гербе горада змешчана выява аленя з крыжам памiж рагамi. Гэта знак святога Губерта – патрона паляўнiчых. Зразумела, што старажытныя майстры не пакiнулi без увагi такую сыравiну, як косць. Яе заўсёды было ў дастатку. З косцi выраблялi грабянi, iголкi, гузiкi, тронкi нажоў, разнастайныя накладкi, шахматныя i шашачныя фiгуркi. Часта на рагах i касцях, знойдзеных у раскопе, вiдаць спiлы, гэта значыць для нейкага вырабу адпiлавалi зручны кавалак. Накладкi з косцi ўпрыгожвалi многiя рэчы, напрыклад калчаны, футляры для лукаў, похвы i iнш. Самыя накладкi, як правiла, упрыгожаныя кружочкамi розных дыяметраў або камбiнацыямi з лiнiй, а таксама раслiнным арнаментам. Тронкi нажоў складалiся з двух палавiн, якiя мацавалiся з дапамогай заклёпак. Вядомыя знаходкi наборных тронкаў нажоў. Тыя ж самыя арбалетныя «арэхi» выраблялiся з косцi.



# ЗАКАНЧЭННЕ

Мы расказалі аб некаторых выкапнёвых рэчах, якія часта трапляюцца ў культурным слоі нашых гарадоў і мястэчак. Вядома, гэтыя рэчы далёка не ўся тагачасная матэрыяльная культура, а толькі невялікая яе частка. Найбольш каштоўныя рэчы, асабліва зробленыя з каштоўных металаў, вельмі рэдка трапляюць у культурны слой. Тыя ж скарбы з манет дайшлі да нас толькі таму, што гаспадар па нейкай прычыне не змог іх забраць.

Як мы ўжо ўпаміналі, у слаях 15–17 ст., як правіла, дрэнна захоўваюцца вырабы з дрэва і скуры. Заўважана, што для добрага іх захавання патрэбна, каб над гэтымі рэчамі ляжаў слой шчыльнай зямлі таўшчынёй не менш як 2 м. На такой глыбіні рэчы не падлягаюць рэзкаму ваганню тэмпературы і вільготнасці, як гэта бывае ў верхнім слоі.

Наяўнасць пастаяннага хіміка-фізічнага асяроддзя спрыяе доўгаму захаванню арганічных матэрыялаў. Такія спрыяльныя ўмовы ўтварыліся на тэрыторыі многіх нашых старажытных гарадоў, дзе маюцца магутныя культурныя наслаенні. Пад час раскопак тут знаходзяць надзвычай цікавыя вырабы са скуры (ад абутку да амуніцыі) і дрэва (ад абчасаных бярвенняў да цацачных мячоў), а таксама зерне і сцяблiны розных раслін.

На развітанне яшчэ раз напомнім чытачам, што вартасць старажытных рэчаў вызначаецца не коштам у грашах, а той гістарычнай інфармацыяй, якую рэчы ўтрымліваюць. Сябры, дапамажыце археолагам і гісторыкам у іх цяжкай працы! Прыносьце ў музей усё, што Вам здаецца старажытным і вартым увагі. Гэта таксама ўклад у вывучэнне гісторыі роднага краю і шанаванне памяці нашых з Вамі продкаў.



# ЗМЕСТ


## ГАРАДЗЕНСКІ ЗАМАК 6

Узнікненне і росквіт паселішча на беразе Нёмана 8

Крыжацкая навала 12

Слаўны рыцар Давыд Гарадзенскі 16

Бітва з крыжакамі працягваецца 20

Міжусобныя звады і крыжакі ў замку 22

Замірэнне Вітаўта і Ягайлы 24

Замак Вітаўта 26

Замак Стэфана Баторыя 30

Мінулі стагоддзі 34

## ВЯЛІКІ КНЯЗЬ ВІТАЎТ 36

Літва – яго радзіма 38

Сталенне героя 42

Улада вышэй за ўсё 46

Руплівец гаспадарства 48

Вялікая бітва 56

Шлях да Еўропы 62

Асноўныя падзеі ў жыцці Вітаўта 65

## МАЙСТАР – НАШ ПРОДАК 66

Скарбніца старажытных рэчаў 68

Як шукалі мірскую ратушу 72

На наваградскіх пагорках 78

Паселішчы на рэчцы Ашмянцы 84

Мястэчкі каля замкаў 88

Зроблена рукамі продкаў 92



**Краўцэвіч Аляксандар Канстанцінавіч,**

археолаг, гісторык-медыевіст, доктар гістарычных навук, сябра Саюзу Беларускіх Пісьменнікаў.
Даследуе сярэднявечную і новачасную гісторыю Беларусі.

Нарадзіўся 13.09.1958 г. у вёсцы Лупачы Мастоўскага раёна на Гарадзеншчыне. Закончыў гістфак БДУ (1981 г.), аспірантуру Інстытута археалогіі АН СССР, г. Масква (1984 г.), дактарантуру БДУ (1999 г.). У 1996 – 1997 г. праходзіў навуковую стажыроўку ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. Ад 1999 г. выкладае ў беларускіх і польскіх ВНУ. Ад 2005 г. сябра Саюзу Беларускіх Пісьменнікаў.

Напісаў дзевяць навуковых і навукова-папулярных кніг: «Майстар – наш продак» (Менск: Народная асвета, 1990); «Гарады і замкі Беларускага Панямоння 14–18 стст.: Планіроўка, культурны слой» (Менск: Навука і тэхніка, 1991); «Стары Мір» (Менск: Навука і тэхніка, 1993, у сааўтарстве з Г.М.Якшук); «Тэўтонскі ордэн ад Ерусаліма да Грунвальда» (Менск: Навука і тэхніка, 1993); «Гродзенскі замак» (Менск: Юнацтва, 1993); «Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка» (Менск: Навука і тэхніка, 1994, у сааўтарстве з Н.І.Здановіч і А.А.Трусавым); «Вялікі князь Вітаўт» (Менск: Юнацтва, 1998); «Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага» (Менск: Беларуская навука, 1998, другое выданне: Жэшаў 2000, польскае выданне: Powstanie Wielkiego Księstwa Litewskiego. Białystok, 2003; чацвёртае выданне на беларускай мове: Беласток, 2008); «Міндаўг. Пачатак гаспадарства» (Менск: Мастацкая літаратура, 2005)



**Татарнікаў Павел Юр’евіч,**

Мастак-графік, сябра Беларускага Саюза Мастакоў, дацэнт кафедры графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Нарадзіўся ў 1971 г. ў сям'і мастакоў у Бярэсці. З 1982 па 1989 г. вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчаму мастацтву ў Менску. У 1989–1995 г. студэнт аддзялення графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. З 1997 г. сябра Беларускага Саюза Мастакоў. Браў удзел у міжнародных і персанальных выставах у Беларусі, Летуве, Польшчы, Расеі, Украіне, Сербіі, Чэхіі, Славакіі, Германіі, Аўстрыі, Італіі, Швейцарыі, Францыі, Гішпаніі, Вялікабрытаніі, ЗША, Японіі, Тайвані.

Асноўныя ўзнагароды за ілюстрацыі да кніг: Дыплом у намінацыі «Залаты дубль» конкурса «Мастак і кніга» 1998 г., Менск, Беларусь. Дыплом «PLAQUE of The International Golden Pen» 1999 г., Белград, Сербія; Гран-пры конкурса «Мастак і кніга» 2000 г., Менск, Беларусь; Прэмія «BIB Golden Apple» міжнароднага біеннале «BIB’2001», Браціслава. Славакія; Прэмія «Лепшае выданне года» Беларускага нацыянальнага конкурса «Мастацтва кнігі» 2004 г., Менск, Беларусь; Прэмія «Лепшы ілюстратар года» Беларускага нацыянальнага конкурса «Мастацтва кнігі» 2007 г., Менск, Беларусь; Медаль Беларускага Саюза Мастакоў. 2007 г., Менск, Беларусь; Залаты медаль міжнароднага конкурса кнігі «Moonbeam», 2008 г., ЗША; Лаўрэат міжнароднага конкурса кнігі «The White Ravens», 2009 г., Мюнхен, Германія.

---

На старонках кніг, якія складаюць ГАРАДЗЕНСКУЮ БІБЛІЯТЭКУ, прадстаўлена забытая гісторыя Гародні, традыцыя суіснавання розных народаў і культур, памяць пра гістарычную спадчыну, культурніцкія і літаратурныя дасягненні творцаў горада на працягу стагоддзяў.

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА гэта яшчэ адзін напамін гарадзенцам, што лёс гораду ў іх руках. Толькі агульнымі намаганнямі мы здолеем перанесці ў наступныя стагоддзі непаўторнасць гістарычнай Гародні, зберагчы яе ўнікальнасць для нашчадкаў.

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА прысвячаецца той Гародні, якой мы можам ганарыцца.

---

## ВЫЙШЛІ З ДРУКУ:

Юры ГАРДЗЕЕЎ **«Магдэбургская Гароднявы»**
Данута БІЧЭЛЬ **«Хадзі на мой голас»**
Аляксей КАРПЮК **«Развітанне з ілюзіямі»**
Пётр СЯЎРУК **«Нябыцця не існуе.**
*Невядомыя старонкі беларускага нацыянальнага руху»*
**«Зрабаваны народ».**
*Размовы з беларускімі інтэлектуаламі*
«Васіль Быкаў **Гісторыя жыцця». Том I.**

## РЫХТУЮЦЦА ДА ДРУКУ:

«Васіль Быкаў **Гісторыя жыцця». Том II.**

**«Гродназнаўства»**